МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

# I–IV КЛАСЫ

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2012

УДК 373.121.414:373.3:1/9
ББК 74.26
В90

**ISBN 978-985-559-130-7**

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2012
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012

# УВОДЗІНЫ Ў ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

З пачаткам навучання мяняецца ўвесь лад жыцця і дзейнасці шасцігадовых дзяцей. Вядучай дзейнасцю паступова становіцца навучальная, а сацыяльнай сітуацыяй развіцця — сістэмы ўзаемадзеяння «вучань—настаўнік», «вучань—вучань», «настаўнік—клас».

Незалежна ад таго, колькі намаганняў і часу траціцца на фарміраванне гатоўнасці дзяцей да навучання, з пэўнымі цяжкасцямі ў першапачатковы перыяд навучання сутыкаюцца ўсе дзеці. Таму існуе пераходны перыяд ад дашкольнага дзяцінства да школьнага, які можна назваць перыядам адаптацыі дзіцяці да новай дзейнасці і жыцця.

Ад таго, як пойдзе прыстасаванне, прывыканне дзіцяці да новых умоў, у многім залежыць стан яго здароўя, працаздольнасць, паспяховасць навучання, эмацыянальны стан. У сувязі з гэтым вучэбны прадмет «Уводзіны ў школьнае жыццё» пабудаваны такім чынам, каб фізіялагічная і сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя прайшла паспяхова для шасцігадовых дзяцей, каб адбыўся паступовы пераход ад гульнёвай дзейнасці да навучальнай. Аднак гульня ва ўсёй сваёй разнастайнасці яшчэ доўгі час будзе заставацца адным з пераважных відаў дзейнасці вучняў.

У І клас прыходзяць дзеці, якія маюць розны адукацыйны, інтэлектуальны, культурны ўзровень, г. зн. розныя стартавыя магчымасці. Таму асноўная **мэта** заключаецца ў стварэнні аптымальных умоў для паспяховай адаптацыі шасцігадовых дзяцей да новай сацыяльнай сітуацыі і прафілактыцы магчымых негатыўных тэндэнцый асобаснага і інтэлектуальнага развіцця будучых вучняў.

Зыходзячы з мэты, асноўнымі **задачамі** выступаюць:

- фарміраванне агульных станоўчых адносін да школьнага жыцця і дзейнасці;
- фарміраванне ўстойлівых інтарэсаў да пазнавальнай дзейнасці;
- развіццё камунікатыўных навыкаў зносін і ўзаемадзеяння з настаўнікам і равеснікамі;
- карэкціраванне агульных псіхалагічных цяжкасцей, уласцівых шасцігадовым дзецям у перыяд пачатку навучання;
- фарміраванне і развіццё ўменняў навучальнай дзейнасці.

Да асноўных **уменняў** навучальнай дзейнасці варта аднесці:

а) ставіць пазнавальныя задачы з дапамогай педагога ці самастойна;

б) праводзіць паслядоўны аналіз задачы, знаходзіць агульны спосаб дзеянняў;

в) планаваць самастойную дзейнасць;

г) падбіраць спосабы рашэння, кантраляваць ход рашэння задач, кіруючыся ўказаннямі настаўніка або ўласным планам;

д) ацэньваць уласныя дзеянні і вынік, арыентуючыся на крытэрыі ацэнак;

е) супрацоўнічаць з настаўнікам, равеснікамі ў індывідуальнай і калектыўнай формах арганізацыі навучальнай дзейнасці.

У чатырохтыднёвы курс вучэбнага прадмета «Уводзіны ў школьнае жыццё» уваходзяць урокі, змест якіх складаецца з комплексу гульняў і практыкаванняў развіццёвага характару.

**Прынцып пабудовы** такіх урокаў наступны:

- спачатку вучням прапануюцца гульні на развіццё адвольнай увагі, яе асноўных працэсаў (сканцэнтраванасць, устойлівасць і размеркаванне);
- затым падключаюцца гульні сенсаматорнага характару, якія стымулююць працэсы ўспрымання;
- найбольшая нагрузка прыпадае на комплекс гульняў, якія актывізуюць мысліцельныя аперацыі і працэсы памяці.

Прапануюцца таксама гульні, якія развіваюць уяўленне, і гульні-жарты.

На працягу ўсяго ўрока падтрымліваецца мажорны эмацыянальны настрой.

Урокі падраздзяляюцца на ч а т ы р ы в і д ы:

**1.** Урок, на якім прапанаваныя вучням гульнёвыя практыкаванні садзейнічаюць развіццю *мысліцельных дзеянняў, аперацый* (аналіз, сінтэз, параўнанне, выдзяленне істотнага, супастаўленне, групаванне, класіфікацыя, абагульненне) і ствараюць спрыяльныя ўмовы для высокай пазнавальнай актыўнасці, вольнасці, адстойвання свайго пункта гледжання кожным дзіцём, незалежна ад таго, супадае ці не супадае ён з думкай настаўніка або іншых навучэнцаў.

У вучня праяўляецца самастойнасць мыслення, развіваюцца кемлівасць, назіральнасць пры непасрэдных зносінах з равеснікамі і настаўнікам. Дзецям даецца магчымасць дамовіцца пра спосаб рашэння задачы, параіцца.

**2.** Урок, змест і форма арганізацыі якога накіраваны на развіццё *розных відаў памяці і яе працэсаў* (запамінанне, узнаўленне). У асноўным ва ўсіх шасцігадовых дзяцей добра развіта механічнае запамінанне прапанаванага матэрыялу і зусім не развіты прыёмы прадуктыўнага запамінання і ўзнаўлення. Частка дзяцей выкарыстоўвае іх інтуітыўна.

У сувязі з гэтым прапанаваны від урока накіраваны на развіццё вобразнай (зрокавай, слыхавой, тактыльнай, рухальнай, эмацыянальнай), слоўна-лагічнай памяці і ўмення выкарыстоўваць такія прыёмы запамінання, як параўнанне, групаванне, класіфікацыя, вобразныя сувязі па падабенстве, па сумежнасці, функцыянальныя, асацыятыўныя.

**3.** Урок, на якім вучні развіваюць *сенсаматорныя здольнасці*. Гульнёвыя практыкаванні ўрока садзейнічаюць больш высокаму ўзроўню сфарміраванасці сенсорных уменняў, аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці і творчага ўяўлення.

Пры правядзенні ўрока ў вучняў фарміруюцца навыкі даследавання формы, велічыні, узаемнага размяшчэння аб’ектаў; абагульненыя арыенціровачныя дзеянні пры даследаванні прадметаў, вакамерныя дзеянні. Комплекс гульняў на ўрок складаецца так, каб у яго ўваходзілі дыдактычныя гульні маніпуляцыйна-інструментальнага характару (адпрацоўка навыкаў) і праблемныя сітуацыі творчага характару.

**4.** Урок, на якім развіваюцца *псіхаматорныя здольнасці* дзяцей (каардынацыя і суразмернасць руху кісці рукі, дробная маторыка пальцаў, зрокава-маторная каардынацыя).

Комплекс заданняў і гульняў урока складаюць:

1) практыкаванні маніпуляцыйнага, трэніровачнага характару: пальчыкавая гімнастыка, разнастайныя практыкаванні на перакладванне, нанізванне, расцягванне, сціскание, раскачванне і г. д.;

2) практыкаванні, звязаныя з элементамі графікі (штрыхоўка, абвядзенне, зрокавыя дыктанты, замалёўка простых элементаў пісьма: кропак, палачак, кружочкаў, хвалістых ліній, штыкетніку і г. д.);

3) практыкаванні, звязаныя з традыцыйнымі відамі дзейнасці: маляваннем, аплікацыяй, лепкай.

У кожны ўрок уключаюцца гульнёвыя практыкаванні і заданні, якія накіраваны на развіццё ў вучняў камунікатыўных здольнасцей, этычных нормаў паводзін і маральных эталонаў.

Рэкамендуецца прытрымлівацца наступных **правілаў** па арганізацыі адукацыйнага працэсу ў перыяд адаптацыі вучняў шасцігадовага ўзросту:

- ствараць прадметна-прасторавае развіццёвае асяроддзе, якое функцыянальна мадэліруе змест дзейнасці вучняў;
- выкарыстоўваць разнастайнасць формаў навучання «няўрочнага» тыпу, якія ўключаюць спецыфічныя дзіцячыя віды дзейнасці на інтэграцыйнай аснове;
- адмовіцца ад строга рэгламентаванага навучання (працяглых статычных поз на ўроках, спынення ініцыятывы выказванняў у дысцыплінарных мэтах);
- выкарыстоўваць дыялагічную форму зносін педагога з вучнямі, якая садзейнічае развіццю актыўнасці, ініцыятыўнасці, пачуцця ўласнай годнасці і самапавагі, фарміраванню павагі да педагога і даверу яму;
- забяспечваць магчымасць дыялагічных зносін паміж вучнямі, арыентавацца на партнёра-равесніка, прызнаваць права дзіцяці на ініцыятыўныя выказванні і аргументаваную абарону сваіх прапаноў, права на памылку;
- пры правядзенні ўрокаў пажадана адзначаць паспяховасць выкананага задання, гульнёвага практыкавання.

Гэта дазволіць зрабіць прагноз аб перспектыве навучання вучня, вызначыць змест індывідуальнай працы;

- у якасці стымулаў навучальнай дзейнасці прымяняць маральныя (увагу, адабрэнне, прызнанне, падтрымку), выключаючы выкарыстанне ў якасці ацэнкі вынікаў дзейнасці стымулы ў выглядзе флажкоў, зорачак і г. д. Ацэньванне атрыманых вынікаў праводзіцца праз самаацэнку згодна з крытэрыямі, прапанаванымі вучням настаўнікам або самімі навучэнцамі;
- пры правядзенні ўрокаў настаўнік можа выкарыстоўваць: *гульні-падарожжы*, якія маюць падабенства з казкай і адлюстроўваюць рэальныя падзеі, звязаныя з развіццём сюжэта, мадэліраваннем сітуацыі, фантазіраваннем; *гульні-даручэнні*, змест якіх заключаецца ў тым, што перад дзецьмі ставяцца задачы асэнсавання наступнай падзеі і яны выказваюць меркаванні, зыходзячы з асабістага вопыту; *гульні-дыскусіі*, у аснове якіх ляжаць зносіны настаўніка з вучнямі і вучняў адзін з адным, а каштоўнасць іх у тым, што яны ствараюць умовы для самавыяўлення дзяцей, развіваюць уменні слухаць адно аднаго і чуць дарослага, уменне сканцэнтраваць увагу на змесце гутаркі, дапоўніць сказанае, выказаць меркаванні, г. зн. удзельнічаць у гутарцы; *псіхалагічныя практыкаванні*, якія выкарыстоўваюцца для зняцця напружання, павышанай стомленасці.

С х е м а  к л а с а мяняецца ў залежнасці ад зместу, мэты ўрока і жадання педагога; рассаджванне вучняў можа быць дынамічным (у адпаведнасці з пажаданнямі вучняў або выхаваўчымі задачамі педагога).

У гульнёвы комплекс уваходзіць максімальная колькасць заданняў і практыкаванняў, прайграванне якіх разлічана пры добрай працаздольнасці вучняў на 35 мін. Настаўніку даецца права самому вызначыць колькасць гульнёвых практыкаванняў з улікам магчымасцей вучняў. Гульнёвыя заданні, якія не паспелі выканаць на ўроку або з якімі асобныя вучні не спраўляюцца, могуць прайгравацца ў зручны час па жаданні вучняў у групе падоўжанага дня пад назіраннем выхавальніка.

Пасля трох-чатырох практыкаванняў, па неабходнасці, праводзяцца паўзы (фізмінуткі).

Для правядзення ўрокаў настаўніку неабходна папярэдняя падрыхтоўка, якая здзяйсняецца задоўга да пачатку навучальнага года. Для эфектыўнага і якаснага правядзення ўрокаў рэкамендуецца азнаёміцца са зместам, метадамі і прыёмамі арганізацыі навучальна-гульнёвай дзейнасці, падрыхтаваць дыдактычны матэрыял.

Варта звярнуць асаблівую ўвагу на тое, што вучэбны прадмет «Уводзіны ў школьнае жыццё» ўключаны ў Тыпавы вучэбны план, таму ў верасні настаўнік працуе з вучнямі толькі па вучэбнай праграме «Уводзіны ў школьнае жыццё», не скарачаючы яго працягласць.

**На працягу 20 вучэбных дзён** педагог праводзіць з дзецьмі па 3 урокі вучэбнага прадмета «Уводзіны ў школьнае жыццё» (усяго 60 гадзін) і ўрокі па вучэбных прадметах «Фізічная культура і здароўе», «Музыка». Не праводзяцца: беларуская, руская, замежная мовы, а таксама матэматыка, працоўнае навучанне, выяўленчае мастацтва, вучэбны прадмет «Чалавек і свет». Гэтыя вучэбныя прадметы вывучаюцца па заканчэнні вучэбнага прадмета «Уводзіны ў школьнае жыццё».

## Першы дзень

**1. Знаёмства.**

Знаёмства дзяцей паміж сабой. Знаёмства з настаўнікам, са школьнымі прыладамі (паведамленне настаўніка аб паходжанні рэчаў, іх прызначэнні, дэкламаванне вершаў, адгадванне загадак), з правіламі паводзін вучня (увядзенне знака «паднятая рука»), з установай агульнай сярэдняй адукацыі (экскурсія).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* малюнак «Аўтапартрэт», «Запомнім нашы імёны», «Школьныя прылады», «Загадкі».

**2. Мадэліраванне схемы класа.**

Развіццё прасторавай арыентацыі ў класе метадам мадэліравання: засваенне схемы класа, складанне схемы класа ў парнай або групавой рабоце дзяцей. Знаёмства з рознымі формамі

адказу на пытанне: калектыўнай і індывідуальнай. Развіццё камунікатыўных уменняў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Запомнім нашы імёны», «Мадэліраванне схемы класа», «Паравозік».

**3. Увядзенне паняцця «рэжым дня».**

Знаёмства з паняццем «рэжым дня». Важнасць выканання рэжыму дня для вучняў. Практыкаванне ў адрозніванні геаметрычных фігур па форме. Арганізацыя групавой работы. Замацаванне правілаў ветлівасці.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Цудоўны мяшочак», «Правілы ветлівасці»; «Геаметрычныя фігуры».

## Другі дзень

**1. Правілы паводзін вучня.**

Засваенне правілаў паводзін вучня: вітанне настаўніка, аднакласнікаў, правілы паводзін на ўроку. Увядзенне знака «хор».

Арганізацыя групавой работы (практыкаванні ў выкарыстанні знакаў «паднятая рука», «хор», ва ўменні задаваць пытанні адно аднаму і адказваць на іх у адпаведнасці з формай пытання).

Фарміраванне ўменняў выконваць заданне адпаведна ўзору, ацэньваць вынікі сваёй дзейнасці па крытэрыях: якасць, колькасць памылак.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Агеньчыкі».

**2. Важныя справы. Увядзенне знака «праблема».**

Развіццё слыхавой увагі, сканцэнтраванасці, зрокавай каардынацыі, дыферэнцыраванага ўспрымання: на аснове аналізу, параўнання, супастаўлення знаходзіць адрозненне паміж двума аднолькавымі па сюжэце малюнкамі; уменне ўзгадняць сумесныя дзеянні. Увядзенне знака «праблема» («??»).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Важныя справы», «Улоўлівай шэпт», «Фігура», «На лясной палянцы», «Знайдзі адрозненні».

**3. Складанне слоўнага партрэта.**

Развіццё моўных уменняў у складанні слоўнага партрэта сябра, маці, бацькі, бабулі і інш. Эмацыянальнае ўспрыманне свайго равесніка. Фарміраванне навыкаў культуры зносін.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Назаві імя», «Ці ведаем мы гэтага хлопчыка (дзяўчынку)», «Якая (які) у мяне маці (бацька)», «Складзі арнамент», «Чароўнае слова».

## Трэці дзень

**1. Алгарытм планавання дзеянняў.**

Развіццё сканцэнтраванасці, устойлівасці, пераключальнасці ўвагі. Навучанне паслядоўнаму выкананню практычных дзеянняў, фарміраванне ўменняў ацэньваць вынік сваіх дзеянняў, праводзіць узаемаправерку. Распазнаванне фігур па трох уласцівасцях: форме, колеры, велічыні. Практыкаванні ў выкарыстанні знакаў «паднятая рука», «хор», «праблема».

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Шукай без перапынку», «Флажкі», «Фігуры», «Запомні ўзор», «Фігуркі з палачак».

**2. Развіццё лагічнага мыслення.**

Эксперыментаванне: захаванне колькасці вадкасці, захаванне колькасці рэчыва. Развіццё лагічнага мыслення, адвольнага запамінання з выкарыстаннем прыёму сэнсавых сувязей; уменняў дзейнічаць адпаведна правілу, ацэньваць уласную работу і работу сваіх равеснікаў, выконваць заданне ў групавым супрацоўніцтве. Увядзенне знака «пастка» («?!»).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Эксперыментаванне», «Вясёлая азбука», «Запамінанне слоў».

**3. Праца чалавека, арганізацыя рабочага месца, дзяжурства па класе.**

Развіццё арганізацыйных уменняў (падтрымліваць парадак на парце, у партфелі, у класе). Абавязкі дзяжурных па класе.

Арганізацыя групавой работы па тэме «Мой любімы занятак». Вызначэнне ўяўленняў дзяцей аб працы чалавека (гутарка «Што значыць працаваць»). Расказы дзяцей аб працы сваіх бацькоў, блізкіх сваякоў, іншых людзей. Працоўныя дзеянні дзяцей («Лепім фігуру»). Складанне расказу па сюжэтным малюнку з адлюстраваннем працоўнай дзейнасці дарослага, дзяцей, дзіцяці. Фарміраванне ўмення ўзгадняць дзеянні ў сітуацыі групавога ўзаемадзеяння (міні-спектакль).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Назаві імя», «Мой любімы занятак», «Што значыць працаваць», «Лепім фігуру».

### Чацвёрты дзень

**1. Вызначэнне галоўных і другарадных прымет прадметаў на аснове параўнання і абагульнення.**

Развіццё ўстойлівай увагі, умення паслядоўнага аналізу, параўнання прадмета на аснове вызначэння розных прымет. Развіццё вобразнага мыслення, уменняў дзейнічаць адпаведна правілу, мадэліраваць лік з дапамогай графаў. Самаправерка, узаемаправерка, самаацэнка згодна з крытэрыямі: дакладна, хутка. Самастойнае складанне гульнёвых практыкаванняў. Прадстаўленне ўласных варыянтаў рашэння задачы на дошцы.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Падарожжа ў горад», «Няўважлівы мастак», «Жаба-падарожніца», «Што мы ведаем пра жабу», «Жабы-сяброўкі».

**2. Асваенне элементаў пісьма.**

Развіццё дробнай маторыкі пальцаў, каардынацыі кісці рукі. Арыенціроўка на лісце сшытка ў лінейку. Практыкаванне ва ўзнаўленні элементаў пісьма. Увядзенне новай формы самаацэнкі. Крытэрыі самаацэнкі: прыгожа, акуратна. Абагульненне прадметаў на аснове вызначэння агульных прымет і адрозненняў. Фарміраванне навыкаў узаемадзеяння ў парнай і групавой рабоце.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гімнастыка для пальчыкаў», «Вучуся пісаць», «Загадкі», «Параўнай карцінкі», «Пластылінавыя павучкі», «Збяры карцінку».

**3. Правілы ветлівасці.**

Вызначэнне ўяўленняў дзяцей аб маральных якасцях чалавека. Замацаванне правілаў ветлівасці. Развіццё здольнасці разумець эмацыянальны стан чалавека па міміцы. Развіццё добразычлівых адносін да равеснікаў. Арганізацыя групавой работы (псіхалагічныя гульні для развіцця згуртаванасці дзяцей, эмацыянальнага дабрабыту ў групе).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Ветлівасць», «Ветлівыя словы», «Збяры добрыя словы ў кошык», «Добры (дрэнны) настрой», «Наш настрой», «Поры года», «Перадача настрою».

## Пяты дзень

**1. Засваенне арыенціровачнай асновы разумовых дзеянняў.**

Развіццё адвольнай увагі, мысліцельных дзеянняў: абагульнення, класіфікацыі. Фарміраванне ўменняў планаваць дзеянні ў адпаведнасці з інструкцыяй, прапаноўваць свае варыянты выканання задання, ацэньваць вынікі работы па крытэрыю наяўнасці памылак, абгрунтоўваць прычыны сваіх няўдач.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Слова заблудзілася», «Мы лічым», «Палічы фігуркі», «Папугай Гоша».

**2. Асваенне прыёмаў лагічнага запамінання.**

Развіццё сканцэнтраванасці зрокавай памяці на аснове аналізу, асваенне прыёмаў лагічнага запамінання (групаванне, абагульненне, класіфікацыя). Абагульненне прадметаў па істотных прыметах (агароднiна, садавіна, ягады). Знаёмства з гульнёй «Танграм». Развіццё дзеянняў успрымання (суаднясенне, расчляненне) пры трансфігурацыі геаметрычных фігур.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Паглядзі, запомні, намалюй», «Класіфікацыя», «Танграм», «Запамінанне малюнкаў».

**3. Дабро і зло ў жыцці чалавека.**

Выхаванне маральных і этычных нормаў паводзін дзяцей, дарослага чалавека. Ацэньванне маральных учынкаў людзей (добрыя і нядобрыя). Развіццё здольнасці да суперажывання, узаемадапамогі, патрэбнасці ў выкананні добрых спраў, учынкаў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Дружныя воплескі», «Добрыя і нядобрыя справы», «Лісты добрага казачніка», «Намалюем добрыя справы», «Што такое добра, што такое дрэнна».

## Шосты дзень

**1. Развіццё ўяўлення.**

Злучэнне кропак па правіле з выкарыстаннем лінейкі. Трансфігурацыя геаметрычных фігур па канкрэтным адлюстраванні (па ўзоры). Запамінанне поўнай інструкцыі, планаванне і карэкціроўка ўласных дзеянняў у ходзе выканання задання. Арганізацыя парнай або групавой работы. Складанне правілаў

гульні. Выяўленне ведаў дзяцей аб прадстаўніках жывёльнага свету.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гімнастыка для пальчыкаў», «Гномік», «Злучы кропкі», «Танграм», «Схаваны малюнак», «Хованкі з жывёламі».

**2. Развіццё адвольнай увагі.**

Развіццё ўменння знаходзіць словы-антонімы (без назвы). Арганізацыя работы ў групах. Эксперыментаванне (доследы па захаванні даўжыні). Фарміраванне ўяўленняў аб мностве метадам графаў. Міні-гутарка пра мурашоў. Практыкаванні ў фармуляванні варыянтаў выканання заданняў. Дамалёўванне фігур, фантазіраванне.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гавары наадварот», «Эксперыментаванне», «Мурашыныя норкі», «Дамалюй фігуру».

**3. Абагульненне і класіфікацыя прадметаў па розных прыметах.**

Навучанне правільнай пастаноўцы пытанняў, падпарадкаваных пэўнай логіцы. Апісальнае паведамленне «Мае любімыя цацкі». Навучанне алгарытму апісання. Практыкаванне ў абагульненні і класіфікацыі цацак па розных прыметах. Расказ па памяці з апорай на арыенціры. Запамінанне слоў з выкарыстаннем парных сэнсавых сувязей.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Так—не», «Паглядзі — запомні», «Мая любімая цацка», «Якія бываюць цацкі», «Лабірынт», «Сэнсавыя сувязі».

## Сёмы дзень

**1. Разуменне навучальнай задачы.**

Знаходжанне агульнага спосабу рашэння задачы на аснове практычных дзеянняў; на вобразным узроўні з апорай на картку. Суаднясенне атрыманага рэзультату з правільным адказам. Практыкаванне ў абгрунтаванні спосабу рашэння, здзяйсненні самакантролю, узаемадапамогі, ацэньванні вынікаў сваёй дзейнасці. Задачы на кемлівасць з палачкамі (адлічванне зададзенай колькасці палачак, выкладванне геаметрычных фігур

з палачак прыёмам прыбудовы). Прасторавая арыентацыя на лісце ў клетку. Самастойнае выкананне заданняў у сшытку.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Адгадай загадку», «Знайдзі чацвёртую фігуру», «Папугай Гоша», «Фігуркі з палачак», «Кропкі, палачкі».

**2. Развіццё маўленчай актыўнасці.**

Завучванне верша, развіццё адвольнага запамінання. Складанне расказаў, гісторый з апорай на парныя карцінкі ў парнай або групавой рабоце. Узгадненне дзеянняў у сітуацыі навучальнага супрацоўніцтва. Складанне апісальнага расказу. Дамалёўванне незакончаных фігур. Практыкаванні ў тлумачэнні сюжэта малюнка, ва ўменні слухаць сваіх равеснікаў, радавацца іх дасягненням.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Маленькія гісторыі», «Складзём расказ», «Чароўны лес».

**3. Падрыхтоўка рукі да пісьма.**

Развіццё дробнай маторыкі пальцаў, каардынацыі рухаў кісці рукі. Злучэнне кропак двума спосабамі. Дамалёўванне элементаў малюнка. Практыкаванне ў абвядзенні элементаў пісьма. Самаацэнка выніку ў адпаведнасці з крытэрыямі: акуратна, прыгожа, дакладна. Маральнае заахвочванне дзяцей. Стварэнне радаснага эмацыянальнага настрою.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гімнастыка для пальчыкаў», «Злучы кропкі», «Уніз па рацэ», «Рыбакі», «Раскладзі навобмацак».

### Восьмы дзень

**1. Складанне алгарытму мысліцельных дзеянняў.**

Самастойнае фармуляванне варыянтаў выканання заданняў, правілаў гульні. Суаднясенне ўласнага выніку з узорам. Развіццё ўмення знаходзіць памылкі, карэкціраваць няправільныя дзеянні. Развіццё здольнасці ўяўляць сябе на месцы іншага, крытычнасці, абароны ўласнай пазіцыі. Абагульненне і супастаўленне прымет, рашэнне задачы па алгарытме.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Спартыўныя чалавечкі», «Левая—правая рука», «Лева—права», «Папугай Гоша», «Фігура, якой не хапае».

**2. Запамінанне шматкампанентнай інструкцыі.**

Развіццё зрокавай каардынацыі. Фармуляванне правілаў гульні. Развіццё разумовых аперацый параўнання, класіфікацыі. Развіццё геаметрычнага ўяўлення, умення выконваць дзеянне ў адпаведнасці з правілам. Запамінанне паслядоўнасці дзеянняў, знакаў. Развіццё творчага ўяўлення.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні*: «Злучы кропкі», «Так—не», «Танграм», «Схаваны малюнак», «Марскі сюжэт».

**3. Зносіны ў сітуацыі супрацоўніцтва.**

Развіццё адвольнай увагі, рэгуляцыі паводзін, уменняў узгадняць дзеянні з равеснікамі, вынаходлівасці ў праблемных сітуацыях. Арганізацыя групавога супрацоўніцтва: развіццё навыкаў зносін, здольнасці свабодна выказваць думкі, гаварыць аб сваіх інтарэсах, жаданнях. Развіццё станоўчых эмацыянальных узаемаадносін дзяцей, умення ўваходзіць у вобраз, выразнасці рухаў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Зайцы і моркаўкі», «Разразныя карцінкі», «Чароўны свет», «Калектыўны малюнак», «Зайчыкі на лясной палянцы».

## Дзявяты дзень

**1. Планаванне і кантроль, замацаванне спосабаў рашэння.**

Запамінанне шматкампанентнай інструкцыі. Узнаўленне паслядоўнасці дзеянняў. Развіццё ўменняў знаходзіць супярэчнасці, разважаць, рабіць вывады. Засваенне незалежнасці колькасці ад прасторавага размяшчэння, спосабаў рашэння задання. Выкладванне геаметрычных фігур з палачак. Абгрунтаванне варыянтаў рашэння; фарміраванне правілаў гульні. Знаходжанне заканамернасцей на аснове супастаўлення шэрагу прымет.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Колькі?», «Выкладванне геаметрычных фігур», «Два рады», «Складзі фігуру», «Фігура, якой не хапае».

**2. Мадэліраванне колькасных адносін.**

Развіццё прасторавай арыентацыі на лісце ў клетку, умення абагульняць і класіфікаваць аб'екты па розных прыметах. Скла-

данне, прыдумванне загадак. Практыкаванне ў абгрунтаванні свайго варыянта рашэння задачы. Мадэліраванне колькасных адносін метадам графаў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Намалюй гэтак сама», «Адгадкі», «Чацвёрты лішні», «Птушыныя гняздзечкі», «Фігура, якой не хапае».

**3. Развіццё прыёмаў запамінання і ўзнаўлення.**

Развіццё слыхавога ўспрымання, уменне ўзгадняць дзеянні адно з адным. Суаднясенне выніку з узорам. Маральнае заахвочванне дзяцей за іх дасягненні. Асваенне прыёмаў запамінання: групаванне, сэнсавыя сувязі. Арганізацыя парнай і групавой работы.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Залатая рыбка», «Домік лесніка», «Запомні па групах», «Запомні словы парамі», «Запомні навобмацак».

## Дзясяты дзень

**1. Групаванне па розных прыметах.**

Развіццё адвольнай увагі, уменняў складаць апісальны расказ аб раслінах, адрозніваць цёплыя і халодныя тоны, складаць букет з розным па колькасці і тоне спалучэннем кветак. Групаванне кветак па розных прыметах, абагульненне кветак па галоўных і другарадных прыметах. Загадкі па тэме «Кветкі». Творчы малюнак на тэму «Кветкі».

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Схаваная расліна», «Складзі букет», «Канкрэтызацыя паняццяў», «Чацвёрты лішні», «Загадкі—адгадкі», «Кветкавая клумба».

**2. Развіццё каардынацыі і дробнай маторыкі рук.**

Уяўленне дзяцей аб прафесіях. Завучванне верша «Майстры». Трансфігурацыя з геаметрычнымі фігурамі (контурнае і сілуэтнае адлюстраванне фігуры чалавека). Развіццё каардынацыі кісці рукі і дробнай маторыкі пальцаў: азнаямленне з тэхнікай выканання штрыхоўкі, развіццё ўменняў рэгуляваць сілу націскання алоўка, ручкі. Выкананне элементаў пісьма. Ацэньванне вынікаў па крытэрыях: якасць, акуратнасць, адпаведнасць узору, дакладнасць, лоўкасць, гібкасць рухаў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гімнастыка для пальчыкаў», «Танграм», «Меткі стралок», «Штрыхоўка», «Вучуся пісаць», «Малюнак з завязанымі вачамі».

**3. Абагульненне ведаў аб правілах дарожнага руху.**

Выяўленне ведаў дзяцей аб правілах дарожнага руху. Абагульненне адказаў. Развіццё здольнасці да ўзнаўлення цэласнага вобраза з элементаў. Арганізацыя групавой або парнай работы. Працяг знаёмства з азбукай у карцінках. Развіццё ўменняў прыдумваць і фармуляваць правілы гульні, тлумачыць варыянты рашэння практыкаванняў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Дамалюй малюнак», «Пералёт матылькоў», «Правілы дарожнага руху».

## Адзінаццаты дзень

**1. Абагульненне і класіфікацыя аб'ектаў па розных прыметах.**

Замацаванне ўменняў фармуляваць правілы гульні, працаваць па алгарытме. Навучанне супастаўленню выніку з правільным адказам. Самаацэнка выніку згодна з крытэрыямі: колькасць памылак, дакладнасць, уважлівасць. Прасторавая арыентацыя з апорай на нагляднасць. Абагульненне і класіфікацыя прадметаў і аб'ектаў па розных прыметах.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Балерыны, якія танцуюць», «Вясёлыя клоўны», «Папугай Гоша», «Чацвёрты лішні».

**2. Развіццё адвольнай увагі.**

Развіццё адвольнай увагі, умення ўзгадняць дзеянні з равеснікамі. Складанне сюжэтнага малюнка ў парах. Расказы дзяцей аб падзеях з жыцця Дзюймовачкі. Творчы малюнак на тэму «Прыгоды Дзюймовачкі». Зняцце напружання, стомленасці; эмацыянальнае ўспрыманне адно аднаго.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Сонейка», «Збяры карцінку», «З жыцця Дзюймовачкі», «Дзе схавалася Дзюймовачка», «Перадача пачуццяў».

**3. Часавыя ўяўленні.**

Развіццё ўменняў знаходзіць заканамернасць змен у радзе аб'ектаў. Узаемадапамога пры самастойным выкананні прак-

тыкаванняў. Выяўленне ведаў дзяцей аб днях тыдня. Абазначэнне дзён тыдня колерамі вясёлкі. Замацаванне паслядоўнасці дзён тыдня на кругавой мадэлі. Складанне мадэлі тыдня з каляровых квадратаў. Замацаванне назваў і паслядоўнасці дзён тыдня ў гульнёвай сітуацыі і пры рашэнні лагічных задач.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Адгадай, колькі ў якой руцэ», «Знайдзі заканамернасць», «Сяміколерная красачка», «Мадэліраванне тыдня», «Жывыя дзянькі», «Лагічныя задачы».

### Дванаццаты дзень

**1. Раскажы аб птушках і іх адлюстраванне ў малюнках.**

Развіццё адвольнай увагі. Развіццё аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці шляхам параўнання малюнкаў з аднолькавым сюжэтам. Трансфігурацыя геаметрычных фігур па сілуэтным і контурным адлюстраванні вобразаў жывёл, птушак. Замацаванне ўменняў выконваць заданне па інструкцыі. Фарміраванне навыкаў узаемадзеяння ў калектыўнай сітуацыі. Расказы аб птушках (па жаданні дзяцей).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Птушка-прыгажуня», «Адрозненне», «Танграм», «Схаваны малюнак», «Збяры карцінку».

**2. Асваенне прыёмаў запамінання і ўзнаўлення.**

Замацаванне навыкаў прасторавай арыентацыі: прама, направа, налева. Запамінанне маршруту па арыенцірах. Развіццё прыёмаў рацыянальнага запамінання і ўзнаўлення: пры дапамозе трайных сэнсавых сувязей, сэнсавых суадносін з апорай на карцінкі; кадзіравання. Практыкаванне ва ўзнаўленні слоў па адным з варыянтаў гульняў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Слухай і запамінай», «Як праехаць», «Запамінанне слоў», «Запомні карцінкі», «Піктаграма», «Запомні рытм».

**3. Мадэліраванне колькасных адносін.**

Злучэнне кропак з дапамогай лінейкі, арыентуючыся на лічбы або колер у пэўным парадку. Развіццё ўмення планаваць разумовыя дзеянні ў адпаведнасці з інструкцыяй. Практыкаванне ў складанні алгарытму дзеянняў. Развіццё ўменняў

здзяйсняць кантроль, узаемаправерку, ацэнку вынікаў згодна з крытэрыем колькасці памылак. Аказанне дапамогі і ўзаемадапамогі пры выкананні задання. Мадэліраванне колькасных адносін метадам графаў. Практыкаванне ў сумесным узгадненні адказу ў гульні «Загадкі—адгадкі».

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Злучы кропкі», «Геаметрычная матрыца», «Паштальён», «Загадкі—адгадкі».

## Трынаццаты дзень

**1. Граматычнае канструяванне.**

Практыкаванне ў вылучэнні і вымаўленні асобных гукаў. Граматычнае канструяванне: змяненне катэгорыі колькасці слоў, пісьмовае кадзіраванне. Складанне расказу па сюжэтным малюнку ў парнай або групавой рабоце. Практыкаванне ў прадстаўленні расказу ўсёй групай. Развіццё здольнасці знаходзіць заканамернасць змяненняў у радзе фігур, уменне разважаць, рабіць вывады, фармуляваць правілы гульні па знаку «??» («праблема»).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Назаві гук», «Адгадай, чый гук», «Хто як голас падае», «Апошні гук за табой», «Змяненне слоў», «Расказ па карцінцы», «Намалюй слова», «Знайдзі заканамернасць».

**2. Прасторавая арыентацыя на лісце паперы ў клетку.**

Развіццё аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці (навучанне алгарытму паслядоўнасці аналізу). Злучэнне кропак згодна з правілам без дапамогі лінейкі. Выкананне задання па слоўнай інструкцыі. Арыентацыя на лісце паперы ў клетку. Маляванне па клетках (сабака, кот). Практыкаванне ў самакантролі, самаправерцы.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гімнастыка для пальчыкаў», «Няўважлівы мастак», «Злучы кропкі», «Намалюй гэтак сама», «Графічны дыктант».

**3. Успрыманне часавай працягласці.**

Развіццё адвольнасці ўвагі. Выкананне задання з абмежаваннем часу. Фарміраванне навыкаў планавання разумовых дзеянняў. Ацэньванне вынікаў згодна з крытэрыямі: колькасць радоў знакаў, колькасць памылак, акуратнасць. Выклад-

ванне геаметрычных фігур з зададзенай колькасці палачак. Пераўтварэнне фігур пэўным спосабам. Пошук заканамернасці ў чаргаванні фігур. Складанне незвычайных гісторый з дапамогай схематычных малюнкаў. Развіццё ўменняў узгадняць дзеянні ў сітуацыі супрацоўніцтва.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Мінутка—гадзіна», «Тры мінуты», «Пераўтварэнне фігур», «Фігуры, якіх не хапае», «Цікавыя гісторыі».

## Чатырнаццаты дзень

**1. Трансфігурацыя з геаметрычнымі фігурамі.**

Вылучэнне геаметрычных фігур пры дапамозе зрокавага расчлянення. Трансфігурацыя з геаметрычнымі фігурамі па контурным і сілуэтным адлюстраванні вобраза. Творчае выкладванне фігур. Развіццё ўмення выконваць заданне па слоўнай інструкцыі. Фарміраванне навыкаў узаемадзеяння ў калектыўнай гульнёвай сітуацыі, умення аказваць неназойлівую дапамогу сваім равеснікам.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Знайдзі фігуру», «Танграм», «Свята», «Графічны дыктант», «Маляванне па клетках», «Разразныя карцінкі».

**2. Маляванне на тэму «Мая настаўніца».**

Гутаркі на тэмы «Мой сябар», «Мая настаўніца». Расказы і адказы дзяцей па знаку «паднятая рука». Малюнак на тэму «Мая настаўніца». Фарміраванне добразычлівых адносін адно да аднаго. Развіццё навыкаў зносін. Выяўленне адносін дзяцей да школы, іх пераваг. Арганізацыя групавой работы: калектыўная работа над стварэннем узору. Зняцце напружанасці, стомленасці.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Паслухаем цішыню», «Нашы імёны», «Гутарка аб школе», «Мой сябар», «Вясёлы ўзор».

**3. Навучанне элементарным навыкам пісьма.**

Развіццё зрокавай каардынацыі без выкарыстання практычных дзеянняў. Асваенне элементаў пісьма. Практыкаванне ў ацэньванні выніку працы ў адпаведнасці з крытэрыямі: аку-

ратнасць, дакладнасць, стараннасць. Арганізацыя парнай або групавой работы на тэму «Грыбы на палянцы».

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Блытаніна», «Размінка для пальцаў», «Вучуся пісаць».

## Пятнаццаты дзень

**1. Цэлае і частка мноства.**

Развіццё ўспрымання ліку. Схематычны паказ цэлага і часткі мноства. Умоўнае абазначэнне прадметаў. Развіццё ўяўленняў аб катэгорыях «высокі», «нізкі». Эксперыментаванне. Вызначэнне заканамернасцей у змяненнях рада фігур на аснове паслядоўнага аналізу. Практыкаванне ў суаднясенні ўласнага выніку з узорам.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Скажы колькі», «Цэлае і частка», «Высокі—нізкі», «Папугай Гоша», «Фігура, якой не хапае».

**2. Асваенне прыёмаў запамінання і ўзнаўлення матэрыялу.**

Узнаўленне матэрыялу з выкарыстаннем прыёмаў запамінання (сэнсавыя сувязі, класіфікацыя, кадзіраванне). Практыкаванне ў тлумачэнні спосабаў запамінання. Самастойны падбор слоў для кадзіравання і парных сувязей.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Азбука Морзэ», «Запомні навобмацак», «Паглядзі і запомні», «Запамінанне слоў», «Класіфікацыя», «Піктаграма».

**3. Графічны дыктант, злучэнне кропак.**

Развіццё каардынацыі рухаў кісці рукі, дробнай маторыкі пальцаў. Злучэнне кропак па правіле. Графічны дыктант: практыкаванне ў прасторавай арыентацыі. Развіццё навыкаў кантролю, самарэгуляцыі.

Прапанова дзецям прыдумаць узор для дыктоўкі, самастойнае прагаворванне ўзору самому сабе і для іншых дзяцей. Практыкаванне ў штрыхоўцы з рознай сілай націскання і напрамкам.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гімнастыка для пальчыкаў», «Злучы кропкі», «Графічны дыктант», «Маляванне па клетках», «Штрыхоўка».

### Шаснаццаты дзень

**1. Абагульненне і класіфікацыя прадметаў па паняційных і функцыянальных прыметах.**

Развіццё творчага ўяўлення, стымуляванне да стварэння варыятыўных вобразаў, іх пераўтварэння. Вызначэнне заканамернасцей па шэрагу прымет. Развіццё мысліцельных аперацый абагульнення, класіфікацыі пры дапамозе вылучэння галоўных і другарадных прымет.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Перагортышы», «Папугай Гоша», «Раскладзі карцінкі», «Сакрэт», «Чацвёрты лішні».

**2. Складанне расказаў, гісторый па схематычных малюнках.**

Практыкаванне ў знаходжанні слоў-антонімаў, развіццё ўмення вызначаць і абгрунтоўваць нерэальныя падзеі ў жыцці чалавека. Арганізацыя парнай або групавой работы дзяцей: знайсці як мага больш недарэчнасцей і расказаць пра іх. Прыдумванне гісторыі-недарэчнасці. Суправаджэнне расказу педагога схематычнымі малюнкамі. Узнаўленне паслядоўнасці падзей персанажа расказу з апорай на малюнкі.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гавары наадварот», «Недарэчнасць», «Тут штосьці не так», «Малюнкі, якія гавораць».

**3. Маляванне на тэму «Мая сям'я».**

Вызначэнне ўяўленняў дзяцей аб паняцці «сям'я». Гутарка «Мая сям'я». Вызначэнне эмацыянальнага стану дзяцей у сям'і. Маляванне на тэму «Мая сям'я». Разважанне дзяцей на тэму «Хто галоўны ў сям'і».

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Хто старэйшы», «Мы — дружная сям'я»; малюнкі на тэму «Мая сям'я», «Мае абавязкі ў сям'і».

### Сямнаццаты дзень

**1. Асваенне элементарных навыкаў пісьма.**

Узнаўленне элементаў пісьма па ўзоры. Паслядоўнае злучэнне кропак без адрыву алоўка. Дамалёўванне малюнка па жаданні дзяцей. Арганізацыя парнай або групавой работы:

трансфігурацыя з геаметрычнымі фігурамі. Ацэньванне і ўзаемаацэнка вынікаў работы ў адпаведнасці з крытэрыямі: прыгожа, акуратна, справядліва. Калектыўнае складанне сюжэтнай карцінкі.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Скакалка», «Адпрасуем хустачкі для маці і дачкі», «Злучы кропкі», «Танграм», «Вучуся пісаць», «Збяром карцінку».

**2. Зарадка ў жыцці дзіцяці.**

Вызначэнне ўяўленняў аб карысці зарадкі для здароўя дзяцей, дарослых. Запамінанне рухаў чалавека пры выкананні зарадкі, узнаўленне з дапамогай малюнка. Завучванне верша «Зарадка». Развіццё прыёмаў лагічнага запамінання (асацыяцыя, кадзіраванне, класіфікацыя).

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Калі і для чаго патрэбна ранішняя зарадка», «Вясёлыя чалавечкі», «Затрымаўся — выбывай з гульні», «Піктаграма», «Класіфікацыя».

**3. Маляванне на тэму «Мой сябар» («Мае сябры»).**

Вызначэнне ўяўленняў дзяцей аб паняццях «сябар», «сяброўства». Правядзенне гутаркі «Мой сябар, мае сябры». Маляванне на тэму «Мой сябар». Складанне расказу пра сябра. Завучванне верша пра сябра. Маляванне на тэму «Мой лепшы сябар».

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Хто можа быць сябрам», «Які мой сябар»; калектыўны малюнак «Мы — сябры».

## Васямнаццаты дзень

**1. Дні тыдня, каляндар.**

Замацаванне ведаў аб днях тыдня. Правядзенне гутаркі на тэму «Каляндар у жыцці чалавека». Складанне мадэлі месяца з дапамогай каляровых квадратаў. Практыкаванне з мадэллю месяца ў парнай рабоце. Мадэліраванне колькасных адносін з дапамогай графаў. Вызначэнне заканамернасцей у змяненні рада прымет.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Жывыя дзянькі», «Гутарка пра каляндар», «Гульня з мадэллю ў парах», «Курачка і кураняты», «Да каго пеўнік пайшоў у госці», «Фігура, якой не хапае».

**2. Арыенціроўка на месцы па слоўнай інструкцыі.**

Злучэнне кропак па правілах (на выбар дзіцяці). Практыкаванне ва ўменні аналізаваць элементы пісьма, у адэкватным ацэньванні вынікаў пісьма. Практыкаванне ў арыенціроўцы на лісце паперы ў клетку па слоўнай інструкцыі. Творчы малюнак «Пяць братоў».

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Гімнастыка для пальчыкаў», «Злучы кропкі», «Пяць братоў», «Вучуся пісаць», «Графічны дыктант».

**3. Асваенне паслядоўнага аналізу.**

Суаднясенне сенсорных эталонаў з навакольнымі прадметамі. Выкладванне фігур з палачак з наступным пераўтварэннем прыёмаў перакладвання палачак. Апісальны расказ пра цацку. Вызначэнне заканамернасці на аснове паслядоўнага аналізу рада прымет. Сумеснае абмеркаванне дзецьмі спосабу рашэння.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Назаві прадмет», «Загадкі з палачкамі», «Знайдзі чацвёртую фігуру», «Цудоўны мяшочак».

## Дзевятнаццаты дзень

**1. Развіццё мысліцельных дзеянняў.**

Развіццё ўмення адрозніваць прыметы прадметаў на аснове аналізу і параўнання, знаходзіць адрозненні і абагульняць уласцівасці прадметаў. Практыкаванне ў абагульненні і групаванні аб'ектаў пры дапамозе выяўлення відавых і родавых прымет. Развіццё ўмення разумець задачу па слоўнай інструкцыі. Выключэнне лішняга слова, якое не падыходзіць па сэнсе, і абгрунтаванне выбару.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Снегавік», «Гутарка пра ляльку», «Класіфікацыя», «Чароўная лінейка», «Лішняе слова».

**2. Асваенне алгарытму абследавання.**

Навучанне паслядоўнаму аналізу на аснове параўнання. Трансфігурацыя з геаметрычнымі фігурамі (творчая работа ў групах). Развіццё зрокава-маторнай каардынацыі. Сумеснае рашэнне праблемнай задачы. Імправізацыя з геаметрычнымі фігурамі. Фармуляванне правілаў гульні, прыдумванне гуль-

нёвай сітуацыі. Засваенне неабходнасці ўзгодненасці дзеянняў для атрымання калектыўнага выніку.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Клоўны», «Танграм», «Шнуркі», «Фігура, якой не хапае», «Разразная карцінка».

**3. Элементарныя матэматычныя дзеянні.**

Выкананне задання па слоўнай інструкцыі. Самаацэнка. Узаемаправерка. Развіццё першапачатковых уяўленняў аб дзеяннях з лікамі, уменняў разважаць, абараняць сваю пазіцыю. Вызначэнне заканамернасцей на аснове паслядоўнага аналізу рада прымет. Сумеснае абмеркаванне спосабу рашэння. Замацаванне ўменняў планавання і кантролю ўласных дзеянняў.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Выкананне інструкцыі», «Задумай лік», «Лічбавыя чалавечкі», «Выкладванне геаметрычных фігур», «Фігура, якой не хапае».

## Дваццаты дзень

**1. «Што такое права».**

Правілы, жаданні, правы. Неабходнасць выканання правоў. Апавяданне Э. Машкоўскай «Маленькі Велікан».

*Дыдактычныя гульні:* «Сяміколерная красачка» і інш.

**2. Складанне расказу па апорных словах.**

Развіццё фанематычнага слыху. Складанне расказу, казкі па апорных словах. Арыенціроўка ў прасторы, на лісце паперы ў клетку па слоўнай інструкцыі. Самастойнае выкладванне геаметрычных фігур у адпаведнасці з узорам. Фарміраванне ўменняў узгадняць дзеянні ў сітуацыі супрацоўніцтва.

*Дыдактычныя гульні і практыкаванні:* «Дружныя воплескі», «Які гук заблудзіўся», «Графічны дыктант», «Танграм», «Збяры карцінку».

**3. Свята «Пасвячэнне ў вучні».**

# НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

## I клас

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне грамаце з'яўляецца пачатковым этапам сістэматычнага вывучэння роднай мовы, забяспечвае эфектыўнае лінгвістычнае і разумовае развіццё вучняў.

**Мэты** навучання грамаце — фарміраванне базавых ведаў, уменняў і навыкаў чытання і пісьма, агульнавучэбных уменняў і навыкаў; развіццё асноўных відаў вуснага і пісьмовага маўлення, пазнавальнага інтарэсу; выхаванне маральна-этычных якасцей, эмацыянальна-каштоўных адносін да навакольнай рэчаіснасці, культуры зносін.

Важным ***прынцыпам*** навучання грамаце з'яўляецца арыентацыя на асваенне нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі.

Асноўнымі **задачамі** навучання грамаце выступаюць:

- развіццё фанематычнага слыху (уменне распазнаваць і выдзяляць асобныя гукі ў слове і складзе, вызначаць іх паслядоўнасць);
- фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў роднай мовы, засваенне літар беларускага алфавіта і развіццё ўмення суадносіць іх з адпаведнымі гукамі;
- навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму;
- развіццё цікавасці да чытання як сродку пазнання, фарміраванне чытацкага кругагляду;
- развіццё звязнага вуснага маўлення;
- фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці.

Навучанне мове і развіццё маўлення разглядаецца не толькі як авалоданне вучнямі моўнымі навыкамі — фанетычнымі, граматычнымі, лексічнымі, але і як авалоданне камунікатыўнымі ўменнямі пры гутарцы дзяцей паміж сабой і з дарослымі. Важным з'яўляецца фарміраванне культуры маўлення, культуры зносін.

Авалоданне роднай мовай, развіццё моўнай здольнасці разглядаецца як аснова паўнацэннага фарміравання асобы дзіцяці шасці гадоў. Перыяд навучання грамаце прадстаўляе вялікія магчымасці для вырашэння задач разумовага, эстэтычнага і маральнага выхавання.

Чытанне і пісьмо разглядаюцца як важныя віды маўленчай дзейнасці, якія спачатку выступаюць толькі ў якасці прадмета навучання, а пасля становяцца сродкам навучання і развіцця вучняў.

Навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму ажыццяўляецца на аснове гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду з улікам сучасных дасягненняў лінгвістыкі і псіхалінгвістыкі, педагогікі і псіхалогіі, методыкі навучання роднай мове.

Беларуская графіка пабудавана на складовым (пазіцыйным) прынцыпе. Гэты прынцып з'яўляецца вызначаючым у навучанні грамаце. Ён знаходзіць сваё ўвасабленне ў абазначэнні мяккасці зычных і гука [й'] на пісьме. Літары беларускага алфавіта, што абазначаюць зычныя гукі, не ўказваюць непасрэдна на іх мяккасць ці цвёрдасць. Функцыю абазначэння цвёрдасці і мяккасці зычных у адкрытым складзе нясуць галосныя (на цвёрдасць папярэдняга зычнага ўказваюць літары ***а, о, у, ы, э,*** на мяккасць — ***е, ё, ю, я, і***). У сваю чаргу літары ***я, е, ю, ё*** ў пачатку слова і пасля галосных абазначаюць два гукі: [й'] і адпаведны галосны гук. Толькі ў кантэксце склада, арыентуючыся на наступную галосную, вучань здольны вызначыць цвёрдасць і мяккасць зычнага і правільна прачытаць склад.

У працэсе навучання вучні знаёмяцца з гукавой сістэмай роднай мовы, авалодваюць дзеяннямі гукавога аналізу слова, уменнем адрозніваць зычныя і галосныя гукі, знаёмяцца з літарамі як знакамі для абазначэння гукаў на пісьме.

На ўроках навучання грамаце ажыццяўляецца развіццё фанематычнага слыху вучняў, азнаямленне іх з асноўнымі лінгвістычнымі паняццямі — словам, сказам. Вучні атрымліваюць веды аб складовай струтуры слова, націску.

Змест навучання грамаце пабудаваны такім чынам, каб большасць зычных гукаў і літар, якімі яны абазначаюцца на пісьме, вывучаліся раней галосных. На фоне засвоеных зычных гукаў і адпаведных літар у вучняў фарміруецца асэнсаванне галоснага ў складзе. Навучанне чытанню прамых складоў ажыц-

цяўляецца «па падабенстве» — ***ма, на, ра, та, са*** і г. д. Папярэдняе вывучэнне зычных літар дазваляе вучням хутка авалодаць чытаннем прамых складоў з кожнай галоснай літарай, што вывучаецца, і перайсці да чытання слоў.

Чытанне можа выступаць у якасці сродку навучання розным вучэбным прадметам, пачынаючы з этапу авалодання чытаннем цэлымі словамі і словазлучэннямі (сказамі). Пасля асваення чытання склада і слова па складах вучні авалодваюць прыёмамі цэласнага чытання, калі дзеянне ўзнаўлення гукавой формы слова ператвараецца ў «тэхніку» — аперацыю для ажыццяўлення новага свядомага дзеяння асэнсавання сказа і кароткага тэксту.

Паралельна з навучаннем чытанню ажыццяўляецца падрыхтоўка рукі вучня да пісьма і навучанне ўласна пісьму. Першакласнікі вучацца абазначаць на пісьме гукі літарамі, складаць словы з літар і складоў, правільна спісваць літары, склады і словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем, і кароткія сказы з такіх слоў.

На занятках *па пазакласным чытанні* ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання.

У адпаведнасці з выдзеленымі раздзеламі курса навучання грамаце праграма складаецца з наступных структурных частак: *навучанне грамаце; пазакласнае чытанне; развіццё маўлення.*

# І КЛАС

## (180 гадзін)[1]

### НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

У навучанні грамаце вылучаюць перыяды: падрыхтоўчы (далітарны), букварны (асноўны) і паслябукварны.

---

[1] Настаўнік сам вызначае неабходную колькасць гадзін на кожную тэму, зыходзячы з уласнага вопыту, улічваючы падрыхтаванасць вучняў, умовы іх работы.

Урокі навучання грамаце могуць быць камбінаваныя: на адным і тым жа ўроку настаўнік можа вучыць як чытанню, так і пісьму.

## **Падрыхтоўчы (далітарны) перыяд** (12 гадзін)[1]

**Агульнае ўяўленне аб вусным і пісьмовым маўленні.**

Падзел вуснага маўлення на сказы, фарміраванне элементарнага асэнсавання функцыі сказа (сказ выражае думку, у ім пра кагосьці або аб чымсьці гаворыцца). Вызначэнне паслядоўнасці і колькасці слоў у сказе. Прыдумванне сказаў па малюнках, з зададзенай колькасцю слоў, з апорай на схемы. Адлюстраванне слоўнага складу сказа, яго лінейнасці (словы ідуць адно за адным), дынамічнасці з дапамогай схемы. Работа над інтанацыяй сказа.

Знаёмства з намінатыўнай роляй слова, з тым, што слова мае значэнне (сэнс) — словамі называюць прадметы, іх прыметы і дзеянні. Называнне аднаго і таго ж аб'екта рознымі словамі *(заяц, зайка, зайчык, бяляк...)*. Знаёмства з разнастайнасцю слоў (называнне слоў ветлівасці, «дарагіх» *(маці, Беларусь, Радзіма...)*, «ласкавых» *(мамачка, родная...)* слоў і да т. п.). Элементарнае тлумачэнне значэння таго ці іншага слова.

Развіццё фанематычнага слыху, фарміраванне ўмення выдзяляць гукі ў слове.

Выдзяленне зычнага гука ў пачатку слова. Адрозненне на слых і ў вымаўленні цвёрдых і мяккіх зычных. Падбор слоў з зададзеным гукам.

**Падрыхтоўка рукі дзіцяці да пісьма:** маляванне, расфарбоўка ўзораў, бардзюраў, абвядзенне па контуры, штрыхоўка ў розных напрамках. Напісанне элементаў літар, іх злучэнне. З першых урокаў пісьма асаблівая ўвага звяртаецца на выпрацоўку правільнай паставы вучня, умення правільна трымаць ручку пры пісьме, размяшчаць сшытак на парце.

## **Букварны (асноўны) перыяд** (140 гадзін)

### Навучанне чытанню

Вывучэнне 10 зычных літар ***(С, П, М, Т, Л, Н, Ш, Р, К, Д)***. Суаднясенне цвёрдых і мяккіх зычных гукаў і адпавед-

---

[1] На вывучэнне асобных тэм у вучэбнай праграме даецца п р ы к л а д н а я колькасць гадзін.

ных літар. Распазнаванне літар па іх характэрных прыметах (ізалявана і ў слове).

Падзел слоў на склады, вызначэнне колькасці і паслядоўнасці складоў у слове, абазначэнне саставу слова на схеме.

Знаёмства з націскным складам. Вычляненне слоўнага націску і называнне націскнога склада ізалявана. Знаёмства з сэнсаадрознівальнай роляй націску (праз параўнанне слоў тыпу ка́ра — кара́).

Вывучэнне галосных літар ***Аа, Яя, Уу, Іі.*** Правільнае суаднясенне гукаў і літар. Распазнаванне галоснага гука ў складах тыпу ЗГ («цвёрды зычны + галосны»). Чытанне такіх складоў пачаргова з кожнай вывучанай галоснай літарай.

Адрозненне на слых і ў вымаўленні зычных і галосных гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных. Выдзяленне ў словах асобных гукаў. Гукавы аналіз слова (вызначэнне паслядоўнасці гукаў у слове, іх характарыстыка — галосны ці зычны, галосны націскны ці ненаціскны, зычны цвёрды ці мяккі). Падбор слоў з зададзеным гукам. Знаёмства на практычным узроўні са звонкімі і глухімі зычнымі.

Цэласнае чытанне трох- і чатырохлітарных слоў як аснова далейшага развіцця навыку чытання шматскладовых слоў.

Фарміраванне навыку чытання на тэкстах, якія ўтрымліваюць словы са складамі ЗГ на кожную вывучаную галосную літару.

Вывучэнне астатніх зычных і галосных літар. Знаёмства з мяккім знакам і апострафам. Зварот асаблівай увагі на галосныя ***Яя, Юю, Ее, Ёё*** як літары, якія абазначаюць склад і мяккасць папярэдняга зычнага ў складзе. Чытанне слоў і тэкстаў з вывучанымі літарамі.

Паступовае навучанне свядомаму, правільнаму і плаўнаму чытанню ўголас і моўчкі асобных слоў, кароткіх сказаў і невялікіх тэкстаў, зразумелых вучням па змесце, на аснове правільнага і хуткага пазнання літар, арыенціроўкі на галосную літару.

Практычнае знаёмства са знакамі прыпынку пры чытанні сказаў («.», «!», «?», «,»).

Чытанне з паўзамі і інтанацыямі, якія адпавядаюць знакам прыпынку ў канцы сказа.

Знаёмства з правіламі гігіены чытання.

### Навучанне пісьму

Абазначэнне гукаў адпаведнымі літарамі друкаванага (на ўроках чытання) і пісьмовага шрыфтоў. Знаёмства з напісаннем усіх вялікіх і малых літар, асноўнымі тыпамі іх злучэнняў. Выпрацоўка звязнага і рытмічнага напісання літар і іх злучэнняў у словах, правільнае суаднясенне літар па велічыні, нахілу, раўнамернае размяшчэнне літар і слоў у радку. Запіс слоў і сказаў пасля іх папярэдняга склада-гукавога разбору з настаўнікам, а затым і самастойна.

Алгарытм спісвання. Спісванне слоў і сказаў з узораў (пісьмовых і друкаваных) з арфаграфічным прагаворваннем. Праверка напісанага праз параўнанне з тэкстам.

Алгарытм пісьма пад дыктоўку. Пісьмо пад дыктоўку літар, складоў і слоў, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Вялікая літара ў пачатку сказа, кропка ў канцы яго. Вялікая літара ў імёнах людзей, мянушках жывёлы, назвах гарадоў і вёсак.

Прыцягванне ўвагі дзяцей да слоў, напісанне якіх разыходзіцца з вымаўленнем (парныя звонкія і глухія зычныя).

## **Паслябукварны перыяд** (28 гадзін)

### Навучанне чытанню

Абагульненне, замацаванне ведаў і ўменняў, набытых у працэсе падрыхтоўчага і букварнага перыядаў навучання грамаце.

Удасканаленне навыку чытання. Навучанне прыёмам цэласнага чытання слова, плаўнаму, свядомаму чытанню сказа. Развіццё навыкаў асэнсаванага чытання невялікіх твораў розных жанраў (вершаў, апавяданняў, казак, забаўлянак, загадак, прыказак і інш.).

Фарміраванне ўмення адрозніваць звязны тэкст ад набору сказаў.

Развіццё ўмення чытаць тэкст выразна, перадаваць сваё стаўленне да прачытанага.

### Навучанне пісьму

Удасканальванне навыкаў пісьма. Захаванне вучнямі асноўных гігіенічных патрабаванняў да пісьма. Замацаванне графіч-

на правільных напісанняў літар і спосабаў злучэння іх у слове. Практыкаванні вучняў у рытмічным напісанні літар, складоў, слоў, невялікіх сказаў (2—3 словы).

Удасканальванне ўмення правільна (без пропускаў, перастановак і скажэнняў літар і складоў) спісваць невялікія тэксты з дошкі і падручніка, пісаць словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Падзел слоў на склады, перанос слоў па складах.

Практычнае прымяненне правілаў напісання вялікай літары ў імёнах людзей і мянушках жывёлы, назвах гарадоў і вёсак; афармленне сказаў (вялікая літара ў пачатку, кропка ў канцы сказа).

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ[1]

**Даступнае кола чытання.** Невялікія мастацкія творы беларускіх і рускіх (у перакладзе на беларускую мову) пісьменнікаў (1—2 старонкі) з дзіцячай кнігі аб'ёмам 8—20 старонак, назва якой, ілюстрацыі на вокладцы і ў тэксце поўнасцю адпавядаюць яе зместу. Дзіцячыя кнігі ў адпаведным афармленні (багата ілюстраваныя, з буйным шрыфтам). Кніжкі-маляванкі з серыі «Мая першая кніжка».

Вядучы метад навучання — чытанне-разглядванне дзіцячых кніг.

**Тэматыка чытання.** Творы для чытання настаўнікам услых: аўтарскія, народныя творы (вершы, дзіцячыя песні, казкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі, апавяданні) з яркай і разнастайнай эмацыянальнай афарбоўкай на ўсе асноўныя тэмы дзіцячага чытання: аб Радзіме, подзвігах, працы, дзецях, жывёле і раслінах, прыгодах і чарадзействе.

**Работа з дзіцячай кнігай.** Фарміраванне чытацкага кругагляду (адна кніга на кожных занятках); выхаванне цікавасці да дзіцячых кніг, уменне адрозніваць кнігі па змесце, правільна называць іх, прачытваючы прозвішчы аўтара і загаловак; прымаць удзел у самых простых літаратурных гульнях па прачытаных у класе кнігах; выкарыстанне ўзораў літаратурнай мовы

---

[1] Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз у два тыдні, займаючы другую частку ўрока чытання.

(загадкі, песенькі і г. д.); выкананне правілаў гігіены чытання і захавання кніг.

У *паслябукварны перыяд* працягваецца работа па фарміраванні ўмення правільна называць кнігу (загаловак, прозвішча аўтара). Чытанне ўслых назвы дзіцячай кнігі на вокладцы, тлумачэнне яе і суаднясенне са зместам твора.

Пазнаванне знаёмых эпізодаў і сітуацый на ілюстрацыях дзіцячых кніг, уменне назваць герояў, узнавіць змест эпізоду або сітуацыі з апорай на ілюстрацыю. Уменне расказваць аб прачытаным.

Знаёмства з бібліятэкай. Выбар кнігі ў бібліятэцы (кніжная выстаўка, ілюстраваны рэкамендацыйны спіс, плакат).

***Асноўныя паняцці, якія засвойваюць вучні.*** Кніга, твор. Аўтар кнігі, твора. Пісьменнік (паэт). Назва (загаловак) кнігі (твора). Вокладка, старонка.

## РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ[1]

**Гукавая культура мовы.** Развіццё ў дзяцей слыхавой памяці і моўнага апарату, увагі да гукавога боку мовы (сваёй і чужой). Удасканальванне моўных навыкаў: навучанне нармальнаму тэмпу і рытму мовы, правільнаму моўнаму дыханню, патрэбнай гучнасці (уменне гаварыць без напружання) і правільнаму інтанаванню (уменне паніжаць і павышаць голас).

Навучанне вымаўленню слоў у адпаведнасці з нормамі арфаэпіі, з захаваннем націску.

Правільнае вымаўленне гукаў роднай мовы, дакладнае ўжыванне падобных гукаў, якія найбольш часта блытаюцца дзецьмі: [л]—[р], [с]—[з], [ш]—[ж], [п]—[б], [с]—[ш] і г. д. (ізаляванае вымаўленне, а таксама гукі ў словах, фразах і скорагаворках).

**Работа над словам.** Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка дзяцей. Правільнае ўжыванне слоў — назваў прадметаў, прымет, дзеянняў і тлумачэнне іх значэння. Аб’яднанне і адрозненне прадметаў па істотных прыметах, правільнае ўжыванне відавых і родавых слоў-назваў.

---

[1] Работа па развіцці маўлення ажыццяўляецца на кожным уроку на працягу вучэбнага года.

Выхаванне чуйнасці да сэнсавых адценняў слоў *(слон, слонік, сланяня)*, адрозненне і разуменне самых простых выпадкаў мнагазначнасці слоў (*іголка швейная, медыцынская* і інш.), аманіміі *(лісічкі, каса)*.

Выпрацоўка ўмення карыстацца словам у правільнай граматычнай форме, свядомае далучэнне дзіцяці да нормаў літаратурнай мовы.

**Работа над сказам і звязным маўленнем.** Удасканальванне моўных навыкаў, атрыманых дзецьмі да школы. Абдумванне адказаў на пытанні настаўніка, дакладнае фармуляванне, ужыванне ў адказе сказаў рознага тыпу.

Пераказ знаёмай казкі ці невялікага апавядання (па пытаннях настаўніка).

Складанне па малюнку ці серыі малюнкаў невялікага апавядання (пад кіраўніцтвам настаўніка).

Адказы на пытанні па прачытаных сказах і тэкстах.

Слоўнае маляванне з дапамогай настаўніка па прачытаным. Дапаўненне сюжэта, самастойнае прыдумванне падзей, як папярэдніх, так і наступных да адлюстраваных.

Выказванне сваіх уражанняў ад прагледжаных мультфільмаў, тэлеперадач, тэатральных спектакляў. Выказванне сваіх уражанняў ад экскурсій, назіранняў.

Адгадванне загадак, тлумачэнне сэнсу прыказак і прымавак, якія блізкія да жыццёвага вопыту дзяцей.

Завучванне на памяць вершаў, пацешак, песень, лічылак і ўзнаўленне іх з захаваннем інтанацыі, якая дыктуецца зместам.

Выхаванне ўважлівых і добразычлівых адносін да адказаў і расказаў іншых вучняў.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны в е д а ц ь:

гукі і літары беларускай мовы, разумець іх асноўнае адрозненне (гукі вымаўляем, літары пішам);

на памяць 4—6 вершаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

вычляняць словы ў сказе, гукі ў слове, вызначаць іх паслядоўнасць;

адрозніваць зычныя і галосныя гукі, цвёрдыя і мяккія, звонкія і глухія зычныя;

злітна чытаць аднаскладовыя і двухскладовыя словы і плаўна па складах — шматскладовыя;

вызначаць месца націску ў слове;

выразна, без скажэнняў пісаць малыя і вялікія літары, правільна злучаць іх у словах;

правільна спісваць словы і сказы, напісаныя ад рукі і надрукаваныя;

граматна (без пропускаў, скажэнняў літар) пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем;

ужываць вялікую літару ў пачатку, кропку ў канцы сказа;

ужываць вялікую літару на пачатку ўласных імёнаў (імёнаў і прозвішчаў людзей, мянушак жывёлы, назваў гарадоў і вёсак);

слухаць невялікія казкі, вершы, апавяданні і па пытаннях настаўніка або па ілюстрацыях расказваць тое, пра што слухалі;

чытаць невялікія творы і вусна расказваць, пра што чыталі;

расказваць пра падзеі з уласнага жыцця;

складаць апавяданне па карціне, серыі малюнкаў (па пытаннях настаўніка);

правільна называць знаёмыя кнігі.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## II—IV класы

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Моўная адукацыя на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне культуры мовы вучняў, станаўленне маральных якасцей асобы, актывізацыю пазнаваўчай дзейнасці, развіццё мовы і мыслення. Патрэбнасць вучняў у выкарыстанні беларускай мовы як асноўнага сродку зносін паміж людзьмі забяспечваецца пачуццёва-вобразным успрыманнем функцыянальных уласцівасцей моўных адзінак, практычнымі ўменнямі звязна выказваць свае думкі і пачуцці ў вуснай і пісьмовай формах, засваеннем фанетычных, лексічных і граматычных нормаў беларускай літаратурнай мовы.

Навучанне роднай мове ў I—IV класах вядзецца ў некалькіх узаемазвязаных накірунках: моўная адукацыя, развіццё культуры мовы вучняў, выхаванне духоўных якасцей асобы.

**Мэтай** навучання вучняў беларускай мове з’яўляецца фарміраванне ўменняў і навыкаў валодання вуснай і пісьмовай мовай як сродкам зносін на аснове засваення функцыянальных уласцівасцей моўных адзінак.

**Задачы** навучання беларускай мове ў I—IV класах:

- фарміраванне пазнавальнай актыўнасці вучняў, іх маральных, этычных і эстэтычных якасцей у працэсе вывучэння роднай мовы;
- асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці;
- асэнсаванне тэксту, сказа, слова і гука як моўных адзінак;
- засваенне фанетычных, лексічных і граматычных ведаў;
- фарміраванне камунікатыўнай культуры вучняў;
- развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;

- узбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў, засваенне вымаўленчых нормаў, правілаў правапісу;
- удасканаленне каліграфічных навыкаў.

Навучанне беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі абумоўлена важнейшымі сістэмаўтваральнымі **прынцыпамі** моўнай адукацыі вучняў.

***Сістэмна-функцыянальны прынцып*** забяспечвае правільнае ўжыванне вучнямі моўных адзінак розных узроўняў з пункта гледжання значэння, структурных асаблівасцей і функцыянальных уласцівасцей. Пры гэтым веды пра сістэму мовы выступаюць як важнейшая ўмова развіцця пазнавальнай актыўнасці і культуры мовы вучняў.

Практычная накіраванасць навучання вучняў беларускай мове абумоўлена ***камунікатыўна-дзейнасным прынцыпам***. Яго сутнасць заключаецца ў тым, каб навучыць дзяцей ажыццяўляць моўныя дзеянні ў рэальных абставінах. Гэты прынцып непасрэдна звязаны з развіццём вуснай і пісьмовай мовы вучняў. Трэба заўважыць, што дзеці, якія вывучаюць родную мову, не адчуваюць асаблівых цяжкасцей пры вуснай камунікацыі, спісванні тэкстаў, але асаблівыя намаганні прыкладваюць пры навучанні напісанню ўласных пісьмовых тэкстаў у адпаведнасці з існуючымі правіламі беларускай мовы.

***Лінгвадыдактычны прынцып*** пашырае дзейнасны падыход да моўнай адукацыі вучняў пачатковых класаў, рэалізацыя якога прадугледжвае авалоданне агульнавучэбнымі ўменнямі: аналізаваць прачытанае, засвойваць новыя звесткі, абагульняць, вызначаць сувязі, падбіраць патрэбны матэрыял, ствараць тэксты, разважаць, даваць ацэнку, прымяняць веды і ўменні на практыцы.

У аснове адбору зместу навучання беларускай мове ў пачатковых класах ляжыць ***моўнацэнтрычны прынцып***, які дазваляе арганізаваць працу вучняў на канкрэтным моўным матэрыяле для фарміравання ведаў пра моўныя адзінкі і іх функцыянальныя асаблівасці, уменняў, якія неабходны для актыўных моўных дзеянняў і развіцця культуры моўных зносін.

Навучанне беларускай мове мае **практычную накіраванасць.** Гэта забяспечваецца за кошт зместу і структуры ву-

чэбнага матэрыялу, які размешчаны па асноўных раздзелах: «Тэкст», «Сказ», «Слова», «Гукі мовы і літары». Раздзел «Гукі мовы і літары» падаецца ў II класе ў поўным аб'ёме, астатнія разглядаюцца па ***лінейна-канцэнтрычным*** прынцыпе ў кожным класе, што дазваляе асэнсоўваць моўныя з'явы ва ўзаемасувязі з моўнымі дзеяннямі. Вывучэнне кожнага раздзела накіравана на фарміраванне ў вучняў агульных паняццяў аб моўных фактах, развіццё практычных уменняў вычляняць моўныя адзінкі на аснове засваення іх асаблівасцей функцыянавання.

Уступны раздзел ***«Родная мова»*** мае накіраванасць на фарміраванне ў вучняў устойлівай ўвагі да роднай беларускай мовы. Вучням раскрываюцца асаблівасці вуснай і пісьмовай мовы, асноўныя яе функцыі, даюцца асобныя правілы моўнага этыкету.

Вывучэнне раздзела ***«Тэкст»*** у кожным класе забяспечвае вучняў неабходнымі ведамі і ўменнямі для актыўных моўных дзеянняў, асэнсавання моўных з'яў, стварэння тэкстаў з улікам рэальных моўных абставін. Асаблівасцю вывучэння тэксту з'яўляецца тое, што ён разглядаецца як вынік маўленчай дзейнасці. Гатовы тэкст вучні могуць перабудаваць, пераказаць, падзяліць на часткі і вызначыць іх унутраную сувязь, скласці план тэксту. Пры стварэнні ўласнага тэксту важна звяртаць увагу дзяцей на адпаведнасць фактычнага матэрыялу тэме і задуме выказвання.

Абагульненыя звесткі пра тэкст маюць практычную накіраванасць, якой прадугледжваецца:

1) удакладненне ўяўленняў вучняў пра тэкст як адзінку выказвання, якая звычайна складаецца з некалькіх сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе;

2) фарміраванне ўмення адрозніваць апавядальныя і апісальныя тэксты, а таксама практычнае азнаямленне з тэкстам-разважаннем;

3) пераказ і стварэнне ўласных тэкстаў розных тыпаў.

Пры вывучэнні раздзела ***«Сказ»*** дзеці засвойваюць сказ як асноўную камунікатыўную адзінку мовы, вучацца вызначаць граматычную аснову сказа, устанаўліваць сувязь паміж словамі

ў сказе, ужываць сказы з аднароднымі членамі, знаёмяцца з markers рознымі па мэце выказвання сказамі (апавядальнымі, пытальнымі і пабуджальнымі), іх інтанацыяй, знакамі прыпынку ў канцы сказаў.

Раздзел ***«Слова»*** змяшчае звесткі пра слова як лексічную адзінку мовы, як назву таго, што можа быць прадметам думкі. У вучняў фарміруюцца ўяўленні пра лексічнае значэнне слова, састаў слова і падзел слоў на часціны мовы. Праграмай прадугледжваецца азнаямленне вучняў з мнагазначнымі словамі, ужываннем слоў у прамым і пераносным значэнні, словамі з блізкім і супрацьлеглым значэннем.

Вывучэнне слова звязана з вызначэннем яго лексічнага значэння, устанаўленнем марфалагічнай будовы і аднясеннем слова да пэўнай часціны мовы. Улічваючы важнасць ведаў пра састаў слова для развіцця мовы вучняў і іх арфаграфічнай пісьменнасці, праграмай прадугледжана вывучэнне значымых частак слова, падбор аднакаранёвых (роднасных) слоў, а таксама ўтварэнне слоў пры дапамозе прыставак і суфіксаў.

У пачатковых класах вучні знаёмяцца з часцінамі мовы, вучацца праводзіць элементарны марфалагічны разбор назоўніка, прыметніка, займенніка, дзеяслова.

Для фарміравання ў вучняў арфаграфічных уменняў і навыкаў асаблівае значэнне мае знаёмства са змяненнем назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў на практычным узроўні. Дзеці вучацца ўжываць прыслоўі і службовыя словы ў сказах.

Раздзел ***«Гукі мовы. Літары»*** вырашае задачы ўдасканалення фанетычных і графічных уменняў і навыкаў вучняў. Пры вывучэнні раздзела даецца агульнае паняцце пра гукавы састаў слова, ролю галосных і зычных гукаў у слове, удасканальваюцца арфаграфічныя ўменні, якія звязаны з напісаннем галосных у ненаціскным становішчы, абазначэннем цвёрдых і мяккіх, звонкіх і глухіх, падоўжаных зычных на пісьме. Адпрацоўваюцца ўменні правільна называць літары алфавіта і карыстацца ім, суадносіць у словах гукі і літары.

Навучанне моўнаму аналізу ў пачатковых класах праводзіцца ў межах элементарнага фанетычнага, лексічнага, марфалагічнага і сінтаксічнага разбору: гука-літарны разбор слова,

разбор слоў па саставе, разбор па часцінах мовы, разбор па членах сказа. Акрамя таго, вучні засвойваюць асобныя правілы правапісу і пунктуацыі, нормы вымаўлення, удасканальваюць каліграфічныя навыкі пісьма ў сувязі з вывучэннем асноўных раздзелаў праграмы.

# II КЛАС

**(102 гадзіны)**

## **РОДНАЯ МОВА** (4 гадзіны)

Беларуская мова — мова беларускага народа. Беларуская і руская мовы — роднасныя (блізкія паміж сабой).

Формы мовы: вусная і пісьмовая. Асаблівасці вуснай і пісьмовай мовы.

Родная мова як сродак зносін паміж людзьмі (агульнае паняцце). Ужыванне слоў і зваротаў ветлівасці.

## **ГУКІ МОВЫ. ЛІТАРЫ**

(54 гадзіны, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на кантрольнае спісванне і 1 гадзіна — на кантрольную работу па тэме)

### **Агульнае паняцце пра гукі і літары** (5 гадзін)

Гук як адзінка вуснай мовы. Вычляненне гукаў са слоў. Роля гукаў у адрозненні слоў.

Абазначэнне гукаў літарамі на пісьме. Алфавіт. Назвы літар алфавіта. Практычнае значэнне алфавіта. Знаёмства з арфаграфічным слоўнікам.

### **Галосныя гукі** (17 гадзін)

Абазначэнне галосных гукаў на пісьме літарамі ***а, о, у, і, ы, э, е, ё, ю, я***. Абазначэнне літарамі ***е, ё, ю, я, і*** гукаў [й′э], [й′о], [й′у], [й′а], [й′і] у словах *(пераехаць, ёлка, юшка, яма, маіх)*.

Склады слова. Роля галосных ва ўтварэнні складоў. Падзел слова на склады і для пераносу.

Націск у слове. Абазначэнне націску на пісьме (´): *го́рад — гарады́.* Роля націску ў адрозненні слоў. Націскныя і ненаціскныя галосныя ў словах. Правапіс галосных ***о, э—а*** *і* ***е, ё—я*** ў словах.

***Кантрольнае спісванне.***

## **Зычныя гукі** (32 гадзіны)

Парныя цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме літарамі ***е, ё, ю, я, і.*** Мяккі знак ***(ь)*** для абазначэння мяккасці зычных. Няпарныя цвёрдыя гукі [ж], [ч], [ш], [р], [дж], [ц]. Напісанне галосных ***а, о, у, ы, э*** пасля літар, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя гукі *(даждж**ы**, ц**э**гла).*

Вымаўленне слоў з цвёрдымі [д], [т] і мяккімі [дз′], [ц′] зычнымі. Напісанне ***е, ё, і, ю, я*** пасля мяккіх зычных [дз′], [ц′]: *гнязд**о** — у гнязд**зе**, і**ду** — і**дзе**ш, хола**д** — хала**дзі**льнік, пош**та** — на пош**це**, жы**та** — у жы**це**.*

Парныя звонкія і глухія зычныя: [б]—[п], [б′]—[п′], [д]—[т], [дз′]—[ц′], [з]—[с], [з′]—[с′], [ж]—[ш], [дж]—[ч], [г]—[х], [г′]—[х′]. Няпарныя звонкія зычныя: [р], [л], [л′], [м], [м′], [н], [н′], [в], [в′], [й′], [ў]. Няпарныя глухія зычныя: [к], [ф]. Вымаўленне і напісанне слоў са звонкімі і глухімі зычнымі. Літары, якія пры напісанні слоў трэба правяраць (агульнае паняцце аб арфаграме). Спосабы праверкі напісання парных звонкіх і глухіх зычных: *гры**б** — гры**б**ок, ду**б** — ду**б**ы, сцежка — сцежачка, казка — казачка.*

Гука-літарны разбор слоў.

Падоўжаныя зычныя [з′:], [с′:], [дз′:], [ц′:], [л′:], [н′:], [ж:], [ч:], [ш:] у словах: *збо**жж**а, кало**сс**е, жы**цц**ё* і інш. Вымаўленне і правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі. Абазначэнне на пісьме падоўжаных зычных падвоеным напісаннем адпаведнай літары *(насе**нн**е, бага**цц**е).* Абазначэнне на пісьме падоўжанага гука [дз′] спалучэннем літар ***ддз***: *асяро**ддз**е, стаго**ддз**е.* Падзел слоў з падоўжанымі зычнымі для пераносу.

Літары ***у, ў*** (***у*** нескладовае). Правапіс ***ў*** (***у*** нескладовага) у словах *(дрэ**ў**ца, пайшо**ў**, Я**ў**ген, пайшлі **ў** школу).* Правіла пераносу слоў з ***ў***: *за**ў**-тра, Я**ў**-ген.*

Літары ***і*, *й*** (***і*** нескладовае). Правапіс літары ***й*** пасля галосных у сярэдзіне ці на канцы слова *(лінейка, мой)*. Правіла пераносу слоў з ***й***: *соней-ка, зай-чык.*

Раздзяляльныя знакі ў словах. Напісанне апострафа (’) у словах перад галоснымі ***е, ё, ю, я, і*** *(з’езд, пад’ём, сям’я, вераб’і)*. Напісанне раздзяляльнага мяккага знака ***(ь)*** у словах пасля зычных ***дз, з, л, н, с, ц*** перад галоснымі ***е, ё, ю, я, і,*** калі яны абазначаюць два гукі [й′э], [й′о], [й′у], [й′а], [й′і] *(паштальён, палью, мільён).*

***Кантрольная работа па тэме.***

## ТЭКСТ

(6 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца
на навучальны пераказ тэксту)

Агульнае паняцце пра тэкст. Тэма тэксту. Прыметы тэксту: тэматычнае адзінства сказаў, сувязь сказаў у тэксце, закончанасць. Супастаўленне тэксту і асобных сказаў, якія не аб’яднаны агульнай тэмай. Сэнсавая сувязь сказаў у тэксце.

Загаловак тэксту. Падбор загалоўка да тэксту.

Падзел тэксту на часткі: пачатак, асноўная частка, заключная частка.

***Навучальны пісьмовы пераказ апавядальнага тэксту па пытаннях.***

## СКАЗ

(9 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца
на кантрольную работу па тэме)

Сказ як адзінка мовы (агульнае паняцце).

Асноўныя прыметы сказа. Сэнсавая і інтанацыйная закончанасць сказа. Вычляненне сказаў з тэксту. Вялікая літара ў пачатку сказа. Знакі прыпынку ў канцы сказаў: кропка, пытальнік, клічнік.

Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе. Слова, якое абазначае, што гаворыцца аб прадмеце гутаркі.

Сувязь слоў у сказе. Вызначэнне сувязі слоў у сказе па пытаннях.

## СЛОВА

(26 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на кантрольную работу па тэме, 1 гадзіна — на навучальны пераказ і 1 гадзіна — на кантрольны дыктант з граматычным заданнем)

Слова як моўная адзінка (агульнае паняцце). Вычляненне слова са сказа. Значэнне слова. Словы з блізкім значэннем. Словы з супрацьлеглым значэннем. Падбор слоў з блізкім і супрацьлеглым значэннямі. Знаёмства з тлумачальным слоўнікам.

Агульнае паняцце аб назвах прадметаў. Абазначэнне словамі прадметаў і з'яў рэчаіснасці. Словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанні х т о? або ш т о? Роля ў мове слоў, якія абазначаюць прадметы. Напісанне з вялікай літары слоў, якія абазначаюць імёны, імёны па бацьку і прозвішчы людзей, клічкі жывёл, назвы краін, гарадоў, вёсак, рэк, азёраў.

Агульнае паняцце аб назвах прымет прадметаў. Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я? Роля ў мове слоў, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

***Навучальны пісьмовы пераказ апісальнага тэксту па апорных словах.***

Агульнае паняцце аб назвах дзеянняў прадметаў. Словы, якія абазначаюць дзеянні і адказваюць на пытанні ш т о р а б і ц ь? ш т о з р а б і ц ь? Роля ў мове слоў, якія абазначаюць дзеянні прадметаў. Асобнае напісанне слова ***не*** са словамі, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

Агульнае паняцце аб прыназоўніках. Прыназоўнікі ***у, на, з, па, да, ад, над, пад, каля*** і іх роля ў забеспячэнні сувязі слоў у сказе. Асобнае напісанне прыназоўнікаў з іншымі словамі ў словазлучэнні, сказе.

Зменная і нязменная часткі слова. Агульнае паняцце аб канчатку і аснове слова. Выдзяленне канчатка і асновы ў слове.

## ПАЎТАРЭННЕ (3 гадзіны)

Вусная і пісьмовая мова. Гукі і літары мовы. Правапіс галосных ***о, э, а і е, ё—я***. Правапіс у словах цвёрдых і мяккіх, звонкіх і глухіх зычных, апострафа і раздзяляльнага мяккага

знака. Тэма тэксту. Сувязь слоў у сказе. Знакі прыпынку ў канцы сказаў. Словы, якія маюць значэнне прадмета, прыметы прадмета, дзеяння. Аснова і канчатак слова.

***Каліграфічнае пісьмо.*** Выкананне правілаў гігіены пісьма: правільная пасадка за школьнай партай, сталом, размяшчэнне пісьмовых прыналежнасцей, падручніка на стале.

Удасканаленне навыкаў правільнага напісання літар, рацыянальных спосабаў злучэння літар у словах. Напісанне малых і вялікіх літар у парадку ўскладнення іх формы.

Практыкаванні па развіцці рытмічнасці, плаўнасці пісьма.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ І ЎМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

**1. Гукі мовы. Літары.**

Вучні павінны в е д а ц ь:

беларускі алфавіт;

аб адрозненні галосных і зычных гукаў;

аб складаўтваральнай ролі галосных гукаў;

аб націску ў словах;

аб цвёрдых і мяккіх зычных;

аб парных звонкіх і глухіх зычных.

Вучні павінны ў м е ц ь:

правільна пісаць словы, сказы, тэксты з захаваннем нормаў пісьма;

вычляняць гукі са слоў;

размяшчаць словы ў алфавітным парадку;

адшукваць словы ў слоўніку;

падзяляць словы на склады і для пераносу;

вызначаць націскныя і ненаціскныя склады;

пісаць словы з галоснымі ***о, э—а*** і ***е, ё—я***;

абазначаць на пісьме мяккасць зычных галоснымі літарамі і мяккім знакам ***(ь)***;

пісаць словы з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі;

пісаць словы з падоўжанымі зычнымі;

пісаць словы з раздзяляльнымі знакамі;

пісаць ***дз, ц*** у словах;

пісаць ***ў*** (***у*** нескладовае) у словах;

пісаць ***і, й*** (***і*** нескладовае) ў словах;

правільна вымаўляць гукі, спалучэнні гукаў, словы.

**2. Тэкст.**

Вучні павінны в е д а ц ь аб:

тэксце як моўнай адзінцы;

тэме тэксту;

загалоўку тэксту.

Вучні павінны ў м е ц ь:

адрозніваць тэкст ад набору сказаў, якія не звязаны паміж сабою;

падбіраць загаловак да тэксту;

вызначаць тэму тэксту;

пераказваць тэкст па пытаннях.

**3. Сказ.**

Вучні павінны в е д а ц ь аб:

сказе як адзінцы мовы;

словах у сказе, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што аб гэтым гаворыцца.

Вучні павінны ў м е ц ь:

вызначаць межы сказа;

правільна афармляць сказ на пісьме:

пачынаць пісаць сказ з вялікай літары;

ставіць кропку, пытальнік або клічнік у канцы сказа;

вызначаць сувязь слоў у сказе па пытаннях;

вызначаць словы ў сказе, якія абазначаюць пра каго або пра што гаворыцца і што гаворыцца аб гэтым.

**4. Слова.**

Вучні павінны в е д а ц ь аб:

слове як моўнай адзінцы;

словах, якія абазначаюць назвы прадметаў, прыметы прадметаў, дзеянні прадметаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

вычляняць слова са сказа;

ставіць пытанні х т о? ш т о? да слоў, якія абазначаюць назвы прадметаў;

ставіць пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я? да слоў, якія абазначаюць назвы прымет прадметаў;

ставіць пытанні ш т о р а б і ц ь? ш т о з р а б і ц ь? да слоў, якія абазначаюць назвы дзеянняў прадметаў;

ужываць прыназоўнікі ***на, у, з, па, да, ад, пад, над, каля.***

Слоўнікавыя словы

*Акварыум, бібліятэка, выйграць, герой, дзверы, дождж, калектыў, майстар, медаль, месяц, метро, мяккі, навакolle, надвор'е, памяць, песня, подзвіг, пыласос, Радзіма, рукзак, Рэспубліка Беларусь, свята, спектакль, стадыён, сябар, тэатр, хадзьба, цвёрды, чацвер, экскурсія, яблык.*

# III КЛАС

## (105 гадзін)

### **ПАЎТАРЭННЕ** (3 гадзіны)

Вызначэнне тэмы тэксту. Падбор загалоўка да тэксту. Вызначэнне слоў у сказе, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што аб гэтым гаворыцца. Пастаноўка знакаў прыпынку ў канцы сказаў. Распазнаванне і адрозненне слоў, якія абазначаюць назвы прадметаў, прымет прадметаў, дзеянняў. Вызначэнне націску ў слове. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме. Напісанне парных звонкіх і глухіх зычных.

### ТЭКСТ

(7 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на навучальнае сачыненне і 1 гадзіна — на навучальны пераказ)

Асноўная думка тэксту. Выказванне асноўнай думкі ў тэксце сказам, загалоўкам.

***Навучальнае сачыненне па малюнку або серыі малюнкаў.***

Агульнае паняцце пра тыпы тэксту: апавяданне і апісанне.

План тэксту. Апорныя сказы ў тэксце. Складанне плана тэксту.

***Навучальны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту па калектыўна складзеным плане.***

### СКАЗ

(17 гадзін , з якіх 1 гадзіна адводзіцца на кантрольную работу па тэме)

Падзел сказаў паводле мэты выказвання: апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя. Інтанацыя сказаў. Падзел сказаў паводле інтанацыі. Клічныя сказы. Інтанацыя клічнага сказа.

Агульнае паняцце пра галоўныя члены сказа. Дзейнік і выказнік як аснова сказа. Вызначэнне асновы сказа. Пашырэнне асновы сказа іншымі словамі.

Агульнае паняцце пра даданыя члены сказа (без падзелу на віды). Словы ў сказе, якія звязаны з дзейнікам. Словы ў сказе, якія звязаны з выказнікам. Вызначэнне сувязі слоў у сказе пры дапамозе пытанняў.

Разбор сказаў па членах сказа.

## СЛОВА

(71 гадзіна, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на навучальны пераказ, 1 гадзіна — на навучальнае сачыненне, 1 гадзіна — на кантрольны дыктант, 2 гадзіны — на кантрольныя работы і 1 гадзіна — на кантрольны дыктант з граматычным заданнем)

### Лексічнае значэнне слова (9 гадзін)

Агульнае паняцце пра мнагазначныя словы. Ужыванне слоў у прамым і пераносным значэнні. Сінонімы. Антонімы. Падбор сінонімаў і антонімаў. Словы, якія маюць блізкае гучанне, але рознае значэнне. Высвятленне значэння слова пры дапамозе тлумачальнага слоўніка.

***Навучальны выбарачны пераказ апавядальнага тэксту па плане.***

### Састаў слова (24 гадзіны)

Корань слова. Аднакаранёвыя словы. Падбор аднакаранёвых слоў. Напісанне галосных і зычных зычных у корані слова.

Прыстаўка як частка слова. Ужыванне ў мове слоў з прыстаўкамі. Правапіс прыставак ***аб-, ад-, над-, пад-***. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на ***-з (-с)***. Перанос слоў з прыстаўкамі. Апостраф у словах з прыстаўкамі *(аб’ехаць, пад’ехаць)*. Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня *(аддаць, рассыпаць)*. Напісанне прыставак і прыназоўнікаў.

***Навучальнае сачыненне па малюнку.***

Суфікс як частка слова. Ужыванне ў мове слоў з суфіксамі. Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса: *(лімонны, ранні)*.

Разбор слоў па саставе.

## **Часціны мовы** (35 гадзін)

Назоўнік як часціна мовы (агульнае паняцце). Вылучэнне назоўніка па значэнні і пытанні сярод іншых часцін мовы. Назоўнікі, якія абазначаюць назвы жывых і нежывых прадметаў. Род назоўнікаў. Назоўнікі мужчынскага, жаночага і ніякага роду. Змяненне назоўнікаў па ліках. Назоўнікі адзіночнага і множнага ліку. Утварэнне множнага ліку пры дапамозе канчаткаў ***-ы, -і***: *сасна — сосн-**ы**, конь — кон-**і***.

Прыметнік як часціна мовы (агульнае паняцце). Вылучэнне прыметніка па значэнні і пытанні сярод іншых часцін мовы. Сувязь прыметніка з назоўнікам у сказе. Змяненне прыметнікаў па родах і ліках у залежнасці ад назоўнікаў, з якімі яны звязаны: ***сонечны** дзень, **сонечнае** надвор'е, **сонечныя** дні*.

Дзеяслоў як часціна мовы (агульнае паняцце). Вылучэнне дзеяслова па значэнні і пытанні сярод іншых часцін мовы. Агульнае паняцце аб змяненні дзеяслова па часах. Дзеясловы цяперашняга, прошлага і будучага часу. Вызначэнне часу дзеяслова па пытанні. Дзеясловы адзіночнага і множнага ліку. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах. Правапіс ***не*** з дзеясловамі.

## **ПАЎТАРЭННЕ** (7 гадзін)

Вызначэнне асноўнай думкі тэксту. Ужыванне апісальных і апавядальных тэкстаў. Падрабязны пераказ тэксту па плане. Вызначэнне асновы сказа (дзейніка і выказніка). Пашырэнне асновы сказа іншымі словамі. Разбор слоў па саставе. Вызначэнне роду і ліку назоўнікаў. Вызначэнне роду і ліку прыметнікаў. Вызначэнне часу і ліку дзеясловаў.

***Каліграфічнае пісьмо.*** Замацаванне гігіенічных навыкаў пісьма.

Пісьмо ў сшытках з разліноўкай у адну лінейку.

Напісанне складаных для вучняў літар і злучэнняў.

Звязнае, рытмічнае пісьмо слоў, сказаў і тэкстаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ І ЎМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

**1. Тэкст.**

Вучні павінны в е д а ц ь аб:

асноўнай думцы тэксту;

тэкстах-апісаннях і тэкстах-апавяданнях.

Вучні павінны ў м е ц ь:

вызначаць тэму і асноўную думку тэксту;

складаць план тэксту;

падрабязна пераказваць тэкст па плане.

**2. Сказ.**

Вучні павінны в е д а ц ь аб:

апавядальных, пытальных і пабуджальных сказах;

дзейніку і выказніку як аснове сказа.

Вучні павінны ў м е ц ь:

вызначаць апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы;

правільна афармляць клічныя сказы на пісьме;

вызначаць аснову сказа (дзейнік і выказнік);

пашыраць аснову сказа іншымі словамі;

вызначаць сувязь дзейніка і выказніка з іншымі словамі па пытаннях.

**3. Слова.**

Вучні павінны в е д а ц ь аб:

мнагазначных словах;

прамым і пераносным значэнні слова;

словах з блізкім значэннем;

словах з супрацьлеглым значэннем;

значымых частках слова;

напісанні прыставак і прыназоўнікаў;

назоўніку, прыметніку, дзеяслове як часцінах мовы.

Вучні павінны ў м е ц ь:

ужываць словы ў прамым і пераносным значэнні;

падбіраць словы з блізкім і супрацьлеглым значэннем;

вызначаць у слове значымыя часткі;

пісаць прыстаўкі ***аб-, ад-, над-, пад-*** і прыстаўкі, якія заканчваюцца на -***з (-с)***;

пісаць словы з апострафам пасля прыставак;

пісаць галосныя і зычныя ў аднакаранёвых словах;

пісаць словы з падваеннем зычных на стыку кораня і суфікса;

разбіраць словы па саставе;

адрозніваць назоўнікі, прыметнікі і дзеясловы як часціны мовы;

вызначаць род і лік назоўнікаў;

вызначаць род і лік прыметнікаў;

вызначаць час і лік дзеясловаў;

пісаць ***не*** з дзеясловамі.

### Слоўнікавыя словы

*Адцвітаць, бутэрброд, восеньскі, гарадскі, драўляны, зімародак, камбайн, камбайнер, крыштальны, навыперадкі, напрадвесні, напрасткі, натхнёны, наўздагон, павяваць, пясчаны, саламяны, самацветы, сардэчны, суседні, цвісці.*

## IV КЛАС

### (105 гадзін)

### ПАЎТАРЭННЕ (6 гадзін)

Вызначэнне прымет тэксту. Выказванне асноўнай думкі ў тэксце. Вызначэнне сувязі сказаў у тэксце. Ужыванне апавядальных і апісальных тэкстаў.

***Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту з элементамі апісання.***

Вызначэнне апавядальных, пытальных і пабуджальных сказаў. Ужыванне ў мове клічных сказаў.

Вызначэнне асновы сказа. Устанаўленне сувязі слоў па пытаннях.

Вызначэнне роду назоўнікаў. Змяненне назоўнікаў па ліках. Змяненне прыметнікаў па родах і ліках. Устанаўленне сувязі прыметніка з назоўнікам у сказе. Змяненне дзеясловаў па ліках і часах.

Вызначэнне саставу слова. Напісанне прыставак. Ужыванне прыставак і суфіксаў у словах.

## ТЭКСТ

(7 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на навучальнае сачыненне і 1 гадзіна — на навучальны пераказ тэксту)

Сродкі сувязі сказаў у тэксце: парадак слоў у сказе, замяшчальныя словы (на практычным узроўні). Выкарыстанне сродкаў сувязі сказаў у тэксце.

Агульнае знаёмства з тэкстам-разважаннем. Складанне вусных тэкстаў-разважанняў.

***Навучальны выбарачны пераказ апісальнага тэксту.***

Агульнае паняцце аб частках тэксту. Часткі апавядальных тэкстаў. Часткі апісальных тэкстаў. Падзел тэксту на часткі. Сувязь паміж часткамі тэксту.

***Навучальнае сачыненне на аснове ўласных назіранняў над прыродай.***

## СКАЗ

(15 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на кантрольную работу па тэме)

Паняцце пра аднародныя члены сказа. Сказы з аднароднымі дзейнікамі. Сказы з аднароднымі выказнікамі. Сродкі сувязі аднародных членаў сказа: інтанацыя пералічэння аднародных членаў сказа; словы ***і, а, але***, якія могуць злучаць аднародныя члены сказа. Знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа. Вызначэнне і ўжыванне аднародных членаў сказа.

## СЛОВА

(73 гадзіны)

### Назоўнік

(29 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на кантрольны дыктант і 1 гадзіна — на кантрольную работу па тэме)

Змяненне назоўнікаў па склонах. Назвы склонаў і склонавыя пытанні. Вызначэнне склону назоўніка ў сказе (з апорай на табліцу).

Змяненне назоўнікаў жаночага роду з канчаткам ***-а (-я)*** у назоўным склоне адзіночным ліку (1-е скланенне). Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (з апорай на табліцу).

Змяненне назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку (2-е скланенне). Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (з апорай на табліцу).

Змяненне назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку з нулявым канчаткам у назоўным склоне (3-е скланенне). Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення (з апорай на табліцу).

Змяненне назоўнікаў у множным ліку. Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў назоўнікаў у множным ліку (з апорай на табліцу).

### Прыметнік

(15 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на кантрольную работу па тэме)

Змяненне прыметнікаў па ліках, родах (у адзіночным ліку) і склонах.

Змяненне прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку па склонах. Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку (з апорай на табліцу).

Змяненне прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку па склонах. Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку (з апорай на табліцу).

Змяненне прыметнікаў множнага ліку па склонах. Вызначэнне склону прыметніка множнага ліку па пытанні і склоне назоўніка, да якога ён адносіцца. Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў прыметнікаў множнага ліку (з апорай на табліцу).

### Займеннік

(5 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на навучальнае сачыненне)

Агульнае паняцце пра займеннік як часціну мовы. Асабовыя займеннікі: ***я, мы*** — 1-я асоба; ***ты, вы*** — 2-я асоба; ***ён, яна, яно, яны*** — 3-я асоба. Лік асабовых займеннікаў. Род асабовых займеннікаў. Змяненне асабовых займеннікаў па склонах (з апорай на табліцу).

Правапіс прыназоўнікаў з займеннікамі.

***Навучальнае сачыненне на прапанаваную тэму (пра сваіх сяброў або сям'ю).***

## Дзеяслоў

(20 гадзін, з якіх 1 гадзіна адводзіцца на навучальны пераказ, 1 гадзіна — на кантрольную работу па тэме і 1 гадзіна — на кантрольны дыктант з граматычным заданнем)

Змяненне дзеясловаў па часах і ліках.Назіранні над неазначальнай формай дзеяслова).

***Навучальны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту па плане.***

Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне). Утварэнне асабовых формаў дзеясловаў (з апорай на табліцу). Азнаямленне з напісаннем асабовых канчаткаў дзеясловаў цяперашняга і будучага часу (з апорай на табліцу). Адрозненне асабовых канчаткаў дзеясловаў (I і II спражэнняў, з апорай на табліцу).

Змяненне дзеясловаў прошлага часу па ліках. Змяненне дзеясловаў прошлага часу адзіночнага ліку па родах. Суфікс ***-ў*** дзеясловаў мужчынскага роду. Суфікс ***-л-*** дзеясловаў жаночага і ніякага роду.

**Прыслоўе** (4 гадзіны)

Агульнае паняцце аб прыслоўі як часціне мовы. Роля прыслоўяў у мове. Напісанне прыслоўяў.

**ПАЎТАРЭННЕ** (4 гадзіны)

Падзел апавядальных і апісальных тэкстаў на структурныя часткі. Складанне плана тэксту. Пераказ тэксту паводле плана. Вызначэнне аднародных членаў сказа. Напісанне склонавых канчаткаў назоўнікаў 1, 2 і 3-га скланенняў (з апорай на табліцу). Напісанне канчаткаў прыметнікаў (з апорай на табліцу). Напісанне канчаткаў дзеясловаў (з апорай на табліцу і памятку).

***Каліграфічнае пісьмо.*** Выкарыстанне рацыянальных спосабаў злучэння літар у словах.

Практыкаванні ў развіцці навыкаў рытмічнасці пісьма, якія садзейнічаюць яго паскарэнню.

Работа па ўдасканаленні почырку вучняў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ І ЎМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

**1. Тэкст.**

Вучні павінны в е д а ц ь:

аб асноўных сродках сувязі сказаў у тэксце;

аб частках апісальных і апавядальных тэкстаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

падзяляць апавядальныя і апісальныя тэксты на часткі;

распазнаваць тэксты-разважанні;

складаць план тэксту;

сцісла пераказваць апавядальныя і апісальныя тэксты па плане (пад кіраўніцтвам настаўніка).

**2. Сказ.**

Вучні павінны в е д а ц ь:

аб аднародных членах сказа;

аб сувязі аднародных членаў сказа;

правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа.

Вучні павінны ў м е ц ь:

вызначаць і ўжываць аднародныя члены сказа;

ужываць інтанацыю і словы ***і, а, але*** для сувязі аднародных членаў сказа;

ставіць знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі сказа.

**3. Слова.**

Вучні павінны в е д а ц ь:

аб змяненні назоўнікаў па склонах;

назвы склонаў і склонавыя пытанні;

аб змяненні назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку з канчаткамі ***-а, -я*** па склонах (1-е скланенне);

аб змяненні назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку па склонах (2-е скланенне);

аб змяненні назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку з нулявым канчаткам па склонах (3-е скланенне);

аб змяненні назоўнікаў множнага ліку па склонах;

аб змяненні прыметнікаў па родах, ліках і склонах;

аб займенніку як часціне мовы;

аб асабовых займенніках;

аб змяненні асабовых займеннікаў;

аб неазначальнай форме дзеяслова;

аб змяненні дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне);

аб змяненні дзеясловаў прошлага часу па ліках і родах (у адзіночным ліку);

аб прыслоўі як часціне мовы.

Вучні павінны  у м е ц ь:

змяняць назоўнікі па склонах (з апорай на табліцу);

вызначаць склон назоўнікаў у сказе па склонавых пытаннях (з апорай на табліцу);

вызначаць склонавыя канчаткі назоўнікаў 1, 2 і 3-га скланенняў (з апорай на табліцу);

вызначаць склонавыя канчаткі назоўнікаў множнага ліку (з апорай на табліцу);

вызначаць склонавыя канчаткі прыметнікаў (з апорай на табліцу);

ужываць асабовыя займеннікі;

вызначаць неазначальную форму дзеяслова;

змяняць дзесловы цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (з апорай на табліцу);

вызначаць асабовыя канчаткі дзеясловаў цяперашняга і будучага часу (з апорай на табліцу);

змяняць дзеясловы прошлага часу па ліках;

змяняць дзеясловы прошлага часу адзіночнага ліку па родах;

ужываць у дзеясловах прошлага часу мужчынскага роду суфікс -***ў***;

ужываць у дзеясловах прошлага часу жаночага і ніякага роду суфікс -***л***-.

## Слоўнікавыя словы

*Абшар, апетыт, ашчадны, вастрыё, веласіпед, да пабачэння, дзьмуць, звілісты, ззяць, лагчына, ледзьве, меншы, наводдаль, паштальён, позні, просьба, сёння, спякотны, сувязь, схільнасць, сцюдзёны, тэлеграма, улетку, упэўненасць, цьмяны, чацвёрты.*

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

## II—IV класы

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Літаратура з’яўляецца адным з самых магутных сродкаў далучэння дзяцей да нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, фарміравання іх светапогляду. Спасціжэнне духоўнай культуры, першаснае пазнанне свету ажыццяўляецца праз мастацкае слова, праз створаныя мастаком вобразы, грамадзянскую і маральную пазіцыі аўтара мастацкага твора. Мастацкая мова выступае ў якасці агульнакультурнага асяроддзя для навучэнцаў. Выхаваўчы патэнцыял мастацкіх твораў дазваляе сфарміраваць у вучняў базавыя нормы грамадзянскай і духоўнай культуры.

Як самастойны прадмет у пачатковых класах літаратура не вывучаецца, але на ўроках літаратурнага чытання закладваецца прапедэўтыка літаратурнай адукацыі. Яе аснову складае ўменне правільна, асэнсавана і выразна чытаць мастацкія тэксты, якое фарміруецца на працягу ўсіх чатырох гадоў навучання. На першай ступені адукацыі вучэбны прадмет «Літаратурнае чытанне» прызначаны ўвесці вучняў у свет мастацкай літаратуры, прывіць любоў да чытання кніг, закласці асновы чытацкай культуры і чытацкай самастойнасці. Літаратурнае чытанне ў пачатковых класах выступае ў якасці арганічнага звяна адзінай і непарыўнай сістэмы літаратурнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

Змест пачатковай літаратурнай адукацыі грунтуецца на метадалагічных пазіцыях, якія звязаны з рэалізацыяй асобасна арыентаванага і культуралагічнага падыходаў.

У аснову адбору навучальнага матэрыялу пакладзены наступныя прынцыпы: нацыянальна-культурная адметнасць матэрыялу, мастацка-эстэтычны, літаратуразнаўчы, прынцып пазнання мастацкай мовы як формы існавання духоўнай куль-

туры беларусаў, адпаведнасць складанасці зместу навучання вучэбным і ўзростава-псіхалагічным магчымасцям вучняў, адпаведнасць аб'ёму зместу навучання наяўнаму часу, які адводзіцца на прадмет згодна з вучэбным планам.

Асноўнымі ***прынцыпамі навучання*** з'яўляюцца наступныя: развіцця асобы; псіхалагічнай камфортнасці; авалодання культурай; уліку псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры вучнямі II—IV класаў, практычнай накіраванасці, творчага характару навучання, прынцып пераемнасці паміж рознымі этапамі літаратурнай адукацыі і ўзаемасувязі з урокамі беларускай мовы, музыкі, выяўленчага мастацтва, прадметам «Чалавек і свет».

**Мэты** прадмета «Літаратурнае чытанне» — шляхам чытання і разумення сэнсу літаратурных твораў далучаць вучняў да нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, фарміраваць яго як выхаванага чытача, які валодае трывалымі ўменнямі і навыкамі чытання, спосабамі самастойнай работы з тэкстам і дзіцячай кнігай, выяўляе цікавасць да чытання кніг, праяўляе грамадзянскія, маральныя, эстэтычныя пачуцці і творчую актыўнасць.

Дасягненню гэтых мэт спрыяе вырашэнне наступных **задач:**

- развіццё сродкамі мовы і літаратуры інтэлектуальных і творчых здольнасцей вучняў, грамадзянскіх і маральна-этычных якасцей асобы;
- развіццё цікавасці да чытання, пашырэнне кола чытання вучняў, іх начытанасці;
- навучанне правільнаму, усвядомленаму, выразнаму чытанню ўголас у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення; самастойнаму чытанню моўчкі («самому сабе»);
- фарміраванне чытацкіх уменняў і першапачатковых ведаў аб літаратуры, якія неабходны для паўнавартаснага ўспрымання і разумення вучнямі мастацкіх твораў і навукова-пазнавальных тэкстаў.

Мэты і задачы літаратурнага чытання вызначаюць асноўныя **напрамкі** прадмета: культуралагічнае развіццё вучня; авалоданне навыкам чытання, уменнем выразна чытаць, чытацкімі ўменнямі, ведамі аб літаратуры на ўзроўні ўяўленняў;

чытанне і вывучэнне лепшых твораў дзіцячай класічнай, сучаснай беларускай і замежнай літаратуры; уключэнне вучняў у творчую дзейнасць у сувязі з чытаннем; работа з дзіцячай кнігай.

Сістэматычнае навучанне літаратурнаму чытанню пачынаецца пасля навучання грамаце.

Праграма па літаратурным чытанні складаецца з наступных раздзелаў: «Тэматыка чытання», «Чытанне вучняў», «Чытацкія ўменні і першапачатковыя веды вучняў аб літаратуры», «Пазакласнае чытанне», «Асноўныя патрабаванні да падрыхтоўкі вучняў».

Раздзел ***«Тэматыка чытання»*** ўключае пералік тэм, якія ўваходзяць у кола чытання вучняў II—IV класаў і складаюць змест падручніка па літаратурным чытанні.

У раздзеле ***«Чытанне вучняў»*** змешчаны патрабаванні да чытання. Вызначаюцца як розныя віды і спосабы чытання, так і якасныя кампаненты чытання. Бегласць чытання індывідуальная і адпавядае хуткасці маўлення вучня. Фарміраванне навыкаў чытання ажыццяўляецца як шляхам шматразовага мэтанакіраванага чытання ў ходзе работы над зместам літаратурнага твора, так і з дапамогай спецыяльных практыкаванняў.

Асаблівасцю вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» з’яўляецца фарміраванне і развіццё ўменняў і навыкаў чытання (правільнасць, усвядомленасць, выразнасць, бегласць) на розных ступенях навучання.

Развіццё ўмення чытання ў першы год навучання прадугледжвае фарміраванне механізму чытання ўголас цэлымі словамі, інтанацыйнае аб’яднанне слоў у словазлучэнні і сказы, павелічэнне тэмпу чытання.

У другі год навучання выпрацоўваюцца ўменні не толькі чы-таць цэлымі словамі ўголас, але і чытаць моўчкі («самому сабе»).

У трэці і чацвёрты гады навучання адпрацоўваюцца тэмп і рацыянальныя спосабы чытання. Уменне чытаць, закладзенае ў I і II класах, аўтаматызуецца і пераўтвараецца ў навык чытання.

Правільнасць і бегласць чытання як паказчыкі якасці навыку выпрацоўваюцца пры дапамозе спецыяльных трэніровачных практыкаванняў і ў працэсе звароту да прыёму шматра-

зовага чытання, у ходзе якога вучань неаднаразова перачытвае тэкст, і тым самым не толькі забяспечвае пранікненне ў ідэю мастацкага твора, але і дабіваецца правільнага і беглага чытання.

Усвядомленным лічыцца такое чытанне, якое прадугледжвае разуменне зместу ўсяго твора, яго частак, асобных слоў і выразаў, разуменне паслядоўнасці падзей, вобразнай сістэмы твора, пазіцыі аўтара; яно спрыяе ўзнікненню ўласных адносін вучня да прачытанага.

Выразнасць чытання з'яўляецца адным з паказчыкаў усвядомленага чытання. На працягу навучання ў пачатковых класах вучні практычна авалодваюць выразнымі сродкамі чытання, у выніку чаго яны з дапамогай інтанацыі перадаюць тыя пачуцці і думкі, якія пакладзены аўтарам у эмацыянальна-вобразны і ідэйны змест твора.

Раздзел ***«Чытацкія ўменні і першапачатковыя веды вучняў аб літаратуры»*** ўключае пералік ўменняў, якімі авалодваюць вучні ў працэсе практычнай работы над літаратурнымі творамі: арыентаванне ў змесце твора; вызначэнне паслядоўнасці падзей; ацэньванне ўчынкаў дзеючых асоб; вылучэнне ў тэксце слоў, сказаў, урыўкаў, якія апісваюць герояў, карціны прыроды; вызначэнне галоўнай думкі твора; знаходжанне і разуменне сэнсу вобразных сродкаў мастацкага твора; самастойнае чытанне твораў і кніг па прапанаванай тэме, у адпаведнасці з пэўным жанрам або аўтарскай прыналежнасцю і інш. Фарміраванне чытацкіх уменняў адбываецца не паслядоўна, а паралельна адно аднаму ў працэсе работы з тэкстам.

Пры вывучэнні літаратурных твораў вучні практычным шляхам набываюць наступныя першапачатковыя веды аб літаратуры: пра асаблівасці апавядання, казкі, верша, байкі, твораў фальклору (прыказкі, лічылкі, загадкі, песенькі); вучацца адрозніваць народныя і аўтарскія казкі; пра выяўленчыя сродкі мастацкай мовы; пра сродкі выразнага чытання літаратурнага твора (паўзу, лагічны націск, тон, тэмп, рытм); назапашваюць веды аб аўтарах, з творчасцю якіх пазнаёміліся на ўроках класнага і пазакласнага чытання; набываюць літаратурныя ўяўленні пра будову твора, яго галоўную думку, герояў, аўтарскія адносіны да падзей.

Неад’емнай часткай вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» з’яўляецца ***пазакласнае чытанне***.

**Мэта** пазакласнага чытання — пазнаёміць вучняў з дзіцячай літаратурай, якая ўваходзіць у кола іх чытання, фарміраваць цікавасць да кнігі, уменне працаваць з ёй, выхоўваць патрэбу ў самастойным чытанні.

Праграмай прадугледжана знаёмства з беларускай і замежнай дзіцячай кнігай. Вучні самастойна выбіраюць неабходныя кнігі па прапанаванай тэме, карыстаюцца даведачным апаратам кнігі, бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогай. Веды пра кнігі і аўтараў набываюцца ў працэсе непасрэднай практычнай дзейнасці з дзіцячымі кнігамі — калектыўнай, індывідуальнай і групавой.

У працэсе класнага і пазакласнага чытання вучні знаёмяцца з творамі вядомых беларускіх пісьменнікаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Васіля Віткі, Артура Вольскага, Максіма Танка, Янкі Брыля, Алеся Якімовіча, Авяр’яна Дзеружынскага, Змітрака Бядулі, Васіля Жуковіча, Уладзіміра Ягоўдзіка, Васіля Хомчанкі, Кандрата Крапівы і інш.

## Пазакласнае чытанне

Урокі пазакласнага чытання ў II—IV класах праводзяцца адзін раз на месяц і ўваходзяць у агульную колькасць гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне прадмета «Літаратурнае чытанне».

З улікам узросту і развіцця вучняў пазакласнае чытанне ўмоўна можна падзяліць на некалькі этапаў:

I клас — *падрыхтоўчы этап* — знаёмства з дзіцячай літаратурай на аснове разгляду і чытання кніг настаўнікам. Кнігі падбіраюцца багата ілюстраваныя, з буйным шрыфтам, невялікія па аб’ёме (8—16 старонак), у тыповым афармленні (г. зн. на першай старонцы вокладкі — прозвішча аўтара, загаловак, ілюстрацыя, якая адпавядае загалоўку). Для чытання рэкамендуецца адбіраць кароткія вершы, апавяданні, казкі, загадкі.

II клас — *пачатковы этап* — знаёмства з дзіцячай кнігай на аснове самастойнага разгляду і чытання вучнямі незнаёмай кнігі па тэме ўрока.

На гэтым этапе падбіраюцца кнігі ў тыповым афармленні аб'ёмам у 8—30 старонак. Для калектыўнай працы пад кіраўніцтвам настаўніка прапануюцца кнігі з ускладненым афармленнем: з графічна ўскладненымі надпісамі; з дапаўняльнымі надпісамі на першай старонцы вокладкі і інш. У якасці вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваецца дзіцячая мастацкая, навукова-мастацкая і навукова-пазнавальная кніга па розных тэмах і жанрах.

III клас — *асноўны этап*, калі павялічваецца колькасць часу на самастойнае чытанне. У гэты перыяд вучням рэкамендуецца чытаць кнігі аб'ёмам ад 16 да 150 старонак. Вучэбным матэрыялам з'яўляецца мастацкая, навукова-пазнавальная, даведачная кніга ўсіх відаў і тыпаў, дзіцячы перыядычны друк.

IV клас — *заключны этап* чытання прадугледжвае самастойнае чытанне кніг самага рознага аб'ёму (ад 16 да 300 старонак). У якасці вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца сусветная дзіцячая мастацкая літаратура, навукова-пазнавальная, даведачная кніга, дзіцячыя часопісы і газеты. Чытацкі кругагляд дзяцей пашыраецца за кошт гістарычных апавяданняў, прыгодніцкай і фантастычнай літаратуры.

Кнігі для чытання і разгляду павінны быць рознымі па структуры:

- кніга, якая змяшчае адзін твор аднаго аўтара;
- кніга, якая складаецца з некалькіх твораў аднаго аўтара;
- кніга, у якую ўваходзяць творы розных аўтараў.

У працэсе работы з кнігай вучні з н а ё м я ц ц а:

- з відамі літаратуры (мастацкая, навукова-мастацкая, навукова-пазнавальная, даведачная, дзіцячы перыядычны друк);
- з відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі (кніжная выстаўка, плакат, рэкамендацыйны паказальнік, каталог);
- са знешнімі прыметамі кніг (загаловак, ілюстрацыя, прозвішча аўтара, змест, падзагаловак, прадмова, пасляслоўе, выдавецтва);
- з правіламі гігіены чытання і беражлівымі адносінамі да кніг.

Працуючы з кнігай, вучні набываюць наступныя **ўменні і навыкі**:

- выбіраць кнігу ў адпаведнасці з пастаўленай настаўнікам мэтай;
- чытаць самастойна дзіцячыя кнігі;
- вызначаць прыкладны змест незнаёмай кнігі па інфармацыі, змешчанай на вокладцы, тытульным лісце, у прадмове, пасляслоўі, ілюстрацыях;
- карыстацца відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі.

## II КЛАС

### Тэматыка чытання (102 гадзіны)[1]

1. Уводзіны. Ці любіш ты кнігу? (1 гадзіна).
2. Зямля бацькоўская, святая... (5 гадзін).
3. Душа народа ў песнях, казках тых жыве (12 гадзін).
4. І восень на прызбу ступіла... (22 гадзіны).
5. Зноў да нас прыйшла зіма... (24 гадзіны).
6. Ідзе вясна ў шумлівых водах... (21 гадзіна).
7. Прыходзіць лета звонкае... (10 гадзін).
8. Ты — багацце маё і любоў... (7 гадзін).

### Чытанне вучняў

Станаўленне механізму чытання.

Правільнае і ўсвядомленае чытанне слоў у адпаведнасці з арфаэпічнымі нормамі.

Авалоданне спосабамі чытання цэлымі словамі ўголас і моўчкі («самому сабе»).

Паступовае павелічэнне тэмпу чытання.

Авалоданне сродкамі выразнага чытання і захаванне інтанацыі сказа, паўз з апорай на знакі прыпынку; выдзяленне

---

[1] У гэтую колькасць уваходзіць 9 гадзін, адведзеных на пазакласнае чытанне.

лагічным націскам слоў, захаванне рытму пры чытанні вершаў; зварот да адпаведнага тону і тэмпу чытання ў залежнасці ад зместу твора.

Фарміраванне здольнасці ацэньваць сваё і пачутае чытанне ў адпаведнасці з правільнасцю і выразнасцю.

### Чытацкія ўменні і першапачатковыя веды вучняў аб літаратуры

На працягу навучальнага года ў працэсе практычнай работы над зместам літаратурнага твора вучні з дапамогай настаўніка авалодваюць наступнымі ў м е н н я м і:

- прагназаваць змест тэксту па ілюстрацыях і загалоўку;
- арыентавацца ў змесце прачытанага па пытаннях настаўніка і з дапамогай выбарачнага чытання знаходзіць адказ;
- тлумачыць значэнне слоў, ужытых у тэксце;
- вызначаць герояў, іх учынкі;
- знаходзіць эпізод з апісаннем учынка дзеючай асобы;
- характарызаваць герояў на падставе ўчынкаў і паводзін;
- выказваць уласныя адносіны да герояў, іх учынкаў;
- з дапамогай настаўніка вызначаць тэму і галоўную думку твора;
- назіраць за будовай апавядання, з дапамогай настаўніка вылучаць яго часткі (па пытаннях настаўніка, па вызначаных загалоўках);
- раскрываць змест ілюстрацый да твора, знаходзіць у тэксце пачатак і канец урыўкаў, да якіх падаюцца ілюстрацыі;
- ілюстраваць змест твора малюнкамі (вуснае і графічнае маляванне), прыдумваць подпісы да іх;
- падрабязна пераказваць прачытанае з дапамогай пытанняў настаўніка, ілюстрацый або паводле плана;
- вызначаць агульны эмацыянальны настрой паэтычнага твора;
- знаходзіць апісанні прыроды шляхам выбарачнага чытання;
- назіраць за асаблівасцямі фальклорных жанраў (калыханак, лічылак, загадак, скорагаворак, казак).
- назіраць за асаблівасцямі казачнага жанру: выдзяляць зачын, канцоўку, казачныя вобразныя выразы, з дапамо-

гай настаўніка знаходзіць іх у тэксце, выкарыстоўваць у пераказе;

- калектыўна складаць казку па серыях малюнкаў або малюнку і апорных словах;
- інсцэніраваць асобныя эпізоды мастацкага твора, насычаныя дыялогамі;
- адрозніваць празаічны твор ад паэтычнага;
- вызначаць жанр прачытанага ці праслуханага твора або кнігі;
- арыентавацца ў кнізе: знаходзіць у змесце прозвішча аўтара, назву патрэбнага твора і старонку.

## Пазакласнае чытанне
(пачатковы этап, 9 гадзін)

**Кола чытання.** Дзіцячая мастацкая, навукова-мастацкая і навукова-пазнавальная кніга па розных тэмах і жанрах з ускладненым тыповым афармленнем аб'ёмам у 8—30 старонак. Пажадана, каб творы для самастойнага чытання вучняў не перавышалі 4—5 старонак. На ўроку пазакласнага чытання вучні знаёмяцца не з адной, а з некалькімі кнігамі (ад 2 да 4), якія аб'яднаны паміж сабой адной тэмай і адным або некалькімі жанрамі.

**Тэматыка чытання** суадносіцца з тэматыкай урокаў літаратурнага чытання і можа пашырацца: пра Радзіму, подзвігі народа і асобнага чалавека, жыццё людзей у пэўных грамадскіх і побытавых абставінах, пра прыроду, жывёл і расліны, падарожжы, прыгоды і чараўніцтвы.

**Работа з дзіцячай кнігай (веды і ўменні).** З дапамогай бібліятэкара выбіраць неабходныя кнігі для работы на ўроку і самастойнага чытання з улікам тэмы, жанру, аўтара па прапанове настаўніка.

Вызначаць прыкладны змест незнаёмай дзіцячай кнігі па яе знешніх паказчыках: прозвішчы аўтара, загалоўку, ілюстрацыях.

Знаёміцца з відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі (кніжная выстаўка, плакат, рэкамендацыйны ўказальнік).

Суадносіць знаёмыя творы з прозвішчамі пісьменнікаў.

Калектыўна аднаўляць змест прачытанага па пытаннях настаўніка і ілюстрацыях, даваць асабістую ацэнку паводзінам і ўчынкам герояў.

Праяўляць акуратнасць і беражлівыя адносіны да кніг.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

прозвішчы пісьменнікаў, з творчасцю якіх знаёміліся неаднаразова на ўроках літаратурнага чытання, назву, змест твораў, якія найбольш спадабаліся;

на памяць 6—8 вершаў.

Вучні павінны н а б ы ц ь у я ў л е н н е аб:

народных і літаратурных творах;

вершаваных і празаічных творах.

Вучні павінны ў м е ц ь:

правільна і асэнсавана чытаць уголас цэлымі словамі з захаваннем інтанацыі сказа і паўз;

ацэньваць сваё і пачутае чытанне ў адпаведнасці з правільнасцю і выразнасцю;

правільна называць прачытаны твор (прозвішча аўтара, загаловак);

адказваць на пытанні па фактычным змесце твора;

раскрываць змест ілюстрацый да твора, знаходзіць урыўкі тэксту, якія адпавядаюць ілюстрацыі;

вызначаць герояў, іх учынкі; характарызаваць герояў па ўчынках і паводзінах;

выказваць уласную ацэнку падзей і герояў;

знаходзіць эпізод з апісаннем учынку дзеючай асобы;

вызначаць тэму і галоўную думку твора з дапамогай настаўніка;

з дапамогай настаўніка дзяліць твор на часткі, складаць план, падрабязна пераказваць мастацкі твор па гатовым плане;

адрозніваць практычна калыханку, лічылку, загадку, скорагаворку, казку, апавяданне, верш; прыводзіць прыклады апавядання, казкі з шэрагу вывучаных твораў;

пад кіраўніцтвам настаўніка выконваць вышэйпералічаныя ўменні работы з дзіцячай кнігай.

# III КЛАС

## **Тэматыка чытання** (105 гадзін)[1]

1. Уводзіны. Бывай лета! (1 гадзіна).
2. Люблю цябе, Белая, Белая Русь!.. (5 гадзін).
3. У ведаў краіну, у свет таямніцаў... (24 гадзіны).
4. Восень, восень залатая сее радасць на зямлі... (13 гадзін).
5. Ляжыць зямля ў адзенні белым... (23 гадзіны).
6. Якое хараство — вясна! Вясне мы ўсе заўсёды рады... (21 гадзіна).
7. Дзівоснае лета з дарамі прыйшло (11 гадзін).
8. Сваю дарагую Радзіму, як родную маці, люблю... (7 гадзін).

## Чытанне вучняў

Развіццё ўмення чытаць хутка цэлымі словамі ўголас і моўчкі («самому сабе»).

Фарміраванне якасных кампанентаў чытання: правільнасці, свядомасці і выразнасці.

Удасканаленне ўменняў карыстацца сродкамі выразнага чытання: захаванне апавядальнай, пытальнай і клічнай інтанацыі сказа, граматычных паўз, адпаведных знакам прыпынку, сэнсавых паўз. Выдзяленне пры чытанні з дапамогай лагічнага націску слоў — пералічэнняў прадметаў, дзеянняў, якасцей, слоў-параўнанняў, слоў-пытанняў, важных па сэнсе слоў.

Захаванне рытму пры чытанні верша. Захаванне тону і тэмпу чытання ў залежнасці ад эмацыянальнага стану дзеючай асобы, эмацыянальнага настрою твора.

Фарміраванне ўмення вызначаць задачу выразнага чытання (што трэба перадаць слухачам пры чытанні).

Развіццё здольнасці ацэньваць сваё і пачутае чытанне ў адпаведнасці з правільнасцю і выразнасцю.

---

[1] У гэту колькасць уваходзіць 9 гадзін, адведзеных на пазакласнае чытанне.

## Чытацкія ўменні і першапачатковыя веды вучняў аб літаратуры

На працягу навучальнага года ў працэсе практычнай работы над зместам новых літаратурных твораў вучні развіваюць чытацкія уменні:

- выяўляць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі (паслядоўныя, часавыя, прасторавыя, прычынныя);
- тлумачыць значэнне незразумелых слоў праз кантэкст і з дапамогай слоўніка;
- вызначаць тэму і галоўную думку твора (з дапамогай настаўніка і самастойна);
- называць галоўную дзеючую асобу, вызначаць яе ўчынак, матывы ўчынку;
- назіраць за эмацыянальным станам галоўнай асобы, суадносіць стан з учынкам, знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць стан, настрой героя;
- знаходзіць з дапамогай выбарачнага чытання апісанне героя (партрэт, мова);
- вызначаць адносіны аўтара да героя, знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць адносіны аўтара;
- характарызаваць героя мастацкага твора па яго ўчынку, паводзінах, перажываннях;
- выказваць уласныя адносіны да дзеючых асоб, іх учынкаў, зместу твора;
- назіраць за будовай апавядання, з дапамогай настаўніка вызначаць яго сэнсавыя часткі;
- з дапамогай настаўніка і самастойна складаць план апавядання; падрабязна і сцісла (пад кіраўніцтвам настаўніка) пераказваць яго змест па плане;
- выбарачна пераказваць твор (асобны эпізод ці апісанне карціны прыроды);
- калектыўна складаць творчыя пераказы;
- вызначаць агульны эмацыянальны настрой паэтычнага твора, пачуцці, якія перадае паэт, знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць настрой і пачуцці паэта;
- назіраць за будовай верша (вершаваны радок, рытм і рыфма, вобразная мова);

- назіраць за выразнымі словамі, якія ствараюць вобразы ў мастацкім творы: азначэннямі, параўнаннямі, словамі з пераносным значэннем, словамі і выразамі, якія перадаюць адухаўленне з'яў прыроды, вылучаць іх з тэксту, тлумачыць значэнне;
- узнаўляць мастацкія вобразы шляхам слоўнага малявання дзеючай асобы, карцін прыроды;
- назіраць за эмацыянальна-ацэначнымі словамі, вылучаць іх са сказаў, вызначаць сэнсавую ролю;
- назіраць за жанравымі асаблівасцямі мастацкіх твораў і практычна адрозніваць жанры (загадка, прыказка, казка, апавяданне, верш);
- калектыўна і самастойна складаць загадкі, вершы па апорных словах і аналогіі;
- калектыўна і самастойна складаць апавяданні па серыях малюнкаў або малюнку і апорных словах;
- інсцэніраваць казкі, нескладаныя сюжэтныя творы, насычаныя дыялогамі, асобныя эпізоды мастацкага твора;
- вызначаць жанр прачытанага ці праслуханага твора;
- арыентавацца ў кнізе: знаходзіць у змесце прозвішча аўтара, назву патрэбнага твора і старонку.

### Пазакласнае чытанне
(асноўны этап, 9 гадзін)

**Кола чытання.** Дзіцячая мастацкая, навукова-мастацкая, навукова-пазнавальная кніга з ускладненым тыповым афармленнем аб'ёмам ад 16 да 150 старонак на беларускай і рускай мовах; кнігі-даведнікі (звыш 150 старонак), дзіцячыя часопісы і газеты.

На ўроку пазакласнага чытання дзеці знаёмяцца не з адной, а з некалькімі кнігамі (ад 3 да 5), якія аб'яднаны паміж сабой адной тэмай і адным ці некалькімі жанрамі.

**Тэматыка чытання** суадносіцца з тэматыкай урокаў літаратурнага чытання і можа пашырацца: пра Радзіму, яе гісторыю, навакольны свет, аднагодкаў, людзей гераічных прафесій, прыроду, падарожжы, прыгоды і чараўніцтвы.

**Работа з дзіцячай кнігай (веды і ўменні).** З дапамогай бібліятэкара і самастойна выбіраць неабходную кнігу ў адпаведнасці з пастаўленай настаўнікам мэтай.

Вызначаць прыкладны змест незнаёмай кнігі па інфармацыі, змешчанай на вокладцы, тытульным лісце, у прадмове, пасляслоўі, ілюстрацыях.

Правільна называць кнігу і прачытаны з яе твор.

Устанаўліваць тэму творчасці пісьменніка па шэрагу кніг.

Ведаць прозвішчы беларускіх пісьменнікаў, з якімі пазнаёміліся на ўроках пазакласнага чытання, аб чым і на якія тэмы яны пішуць.

Карыстацца відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі (рэкамендацыйны ўказальнік, тэматычная картатэка, кніжная выстаўка).

Аднаўляць змест прачытанага па пытаннях настаўніка і ілюстрацыях, вылучаць эпізод твора і пераказваць яго змест, ацэньваць паводзіны і ўчынкі герояў, выказваць адносіны да іх.

Праяўляць акуратнасць і беражлівыя адносіны да кніг.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

прозвішчы беларускіх пісьменнікаў, з якімі знаёміліся неаднаразова на ўроках літаратурнага чытання, назву, змест твораў, якія найбольш спадабаліся;

на памяць 6—8 вершаў;

Вучні павінны н а б ы ц ь у я ў л е н н і аб:

творах фальклору (калыханка, пацешка, песенька, заклічка, лічылка, скорагаворка, прыказка, загадка, казка);

творах мастацкай літаратуры (казка, апавяданне, верш, байка);

навукова-пазнавальных творах;

сродках выразнага чытання літаратурнага твора (паўза, лагічны націск, тон, тэмп, рытм).

Вучні павінны ў м е ц ь:

правільна і асэнсавана чытаць цэлымі словамі ўголас і моўчкі («самому сабе»);

выразна чытаць твор з захаваннем інтанацыі сказа, паўз, лагічнага націску;

ацэньваць сваё і пачутае чытанне ў адпаведнасці з правільнасцю і выразнасцю;

фармуляваць тэму і галоўную думку твора (самастойна і з дапамогай настаўніка);

тлумачыць значэнне незразумелых слоў праз кантэкст і з дапамогай слоўніка;

з дапамогай настаўніка вылучаць сэнсавыя часткі твора; складаць план тэксту; падрабязна пераказваць мастацкі твор паводле гатовага плана;

называць галоўную дзеючую асобу, вызначаць яе ўчынак, матывы ўчынку; знаходзіць у тэксце апісанне дзеючай асобы;

знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць настрой героя, яго думкі, перажыванні;

знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць адносіны аўтара да падзей і герояў;

характарызаваць героя па паводзінах і ўчынках; даваць уласную ацэнку ўчынкам і героям;

вылучаць у творы мастацкія (вобразныя) словы, тлумачыць іх значэнне;

узнаўляць мастацкія вобразы (слоўнае маляванне дзеючай асобы, краявіду);

знаходзіць у тэксце паэтычнага твора словы, якія перадаюць настрой і пачуцці паэта;

адрозніваць творы розных жанраў (казка, апавяданне, верш), прыводзіць прыклады апавядання, казкі, верша з шэрагу вывучаных твораў;

пад кантролем настаўніка выконваць вышэйпералічаныя ўменні работы з дзіцячай кнігай.

## IV КЛАС

### **Тэматыка чытання** (105 гадзін)[1]

1. Краіна мая, радасць мая, песня мая маладая… (6 гадзін).
2. Раніцаю ў школу сыдземся мы зноў… (12 гадзін).
3. Кажуць, у дарозе восень залатая… (17 гадзін).
4. Дзе карані твае, адкуль твой род пачаўся… (6 гадзін).

---

[1] У гэту колькасць уваходзіць 9 гадзін, адведзеных на пазакласнае чытанне.

5. Мы ўсе старацца будзем дзеля карысці людзям (10 гадзін).

6. Мяккі снег лятае пухам, і канца яму няма... (20 гадзін).

7. Вясна прыйшла, каб святам стаць... (20 гадзін).

8. Слава травам, слава кветкам, слава летнім яркім дням... (14 гадзін).

## Чытанне вучняў

Удасканаленне ўмення чытаць хутка цэлымі словамі ўголас і моўчкі («самому сабе»).

Удасканаленне якасных кампанентаў чытання: правільнасці, свядомасці, выразнасці, бегласці.

Удасканаленне ўмення выкарыстоўваць сродкі выразнага чытання: паўзы ў адпаведнасці са знакамі прыпынку, гучнасць у адпаведнасці з эмацыянальным станам дзеючай асобы, лагічны націск на важных у сэнсавых адносінах словах, фразах, інтанацыю сказа.

Развіццё ўмення самастойна вызначаць задачу выразнага чытання (што трэба перадаць слухачам пры чытанні).

Развіццё здольнасці ацэньваць сваё і пачутае чытанне ў адпаведнасці з правільнасцю і выразнасцю.

## Чытацкія ўменні і першапачатковыя веды вучняў аб літаратуры

На працягу навучальнага года ў працэсе практычнай работы над зместам новых літаратурных твораў вучні ўдасканальваюць чытацкія **ў м е н н і**:

- выяўляць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі ў творы;
- вызначаць тэму і галоўную думку твора;
- вылучаць галоўных і другарадных дзеючых асоб, аналізаваць іх узаемаадносіны, учынкі, матывы ўчынкаў, параўноўваць іх, выяўляць эмацыянальны стан дзеючых асоб;
- знаходзіць у тэксце апісанні дзеючых асоб, пейзажныя замалёўкі, выконваць слоўнае маляванне карцін, якія ўзніклі пасля чытання;
- характарызаваць дзеючую асобу па яе ўчынку, паводзінах, перажываннях;
- выяўляць адносіны аўтара да героя, яго ўчынкаў;

- выказваць уласныя адносіны да дзеючых асоб, іх учынкаў, зместу твора;
- працаваць з тэкстам: дзяліць яго на часткі, складаць план, падрабязна, выбарачна (асобны эпізод ці апісанне карціны прыроды) і сцісла (з дапамогай настаўніка) пераказваць мастацкі твор;
- калектыўна складаць творчыя пераказы;
- знаходзіць у тэксце вобразныя словы і выразы, тлумачыць іх значэнне, узнаўляць мастацкія вобразы паводле прачытанага;
- вылучаць з тэксту эмацыянальна-ацэначныя словы, асэнсоўваць іх функцыянальнае прызначэнне;
- асэнсоўваць значэнне і ролю прыказак, трапных выразаў, ужытых у тэксце;
- вызначаць агульны эмацыяльны настрой паэтычнага твора, пачуцці, якія перадае паэт, суадносіць іх з уласнымі ўражаннямі, знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць настрой і пачуцці паэта;
- адрозніваць фальклорныя жанры (загадка, прыказка, казка, народная песня, пацешка і інш.) ад літаратурных (апавяданне, верш, літаратурная казка).

### Пазакласнае чытанне
(заключны этап, 9 гадзін)

**Кола чытання.** Сусветная дзіцячая мастацкая літаратура, навукова-пазнавальная, даведачная кніга, гістарычная, прыгодніцкая і фантастычная літаратура (аб’ёмам да 300 старонак), дзіцячыя часопісы і газеты.

Кнігі для чытання павінны быць рознымі па структуры: кніга, якая змяшчае адзін твор аднаго аўтара; кніга, якая складаецца з некалькіх твораў аднаго аўтара; кніга, у якую ўваходзяць творы розных аўтараў.

**Тэматыка чытання** суадносіцца з тэматыкай урокаў літаратурнага чытання і можа пашырацца: пра Радзіму, гераічныя ўчынкі ў імя Радзімы, пра працу людзей і адносіны да яе, пра павагу, клопат, удзячнасць старэйшым, пра жыццё дзяцей і дарослых, пра ўзаемаадносіны дзяцей у калектыве і ў сям’і, узаемаадносіны паміж чалавекам і прыродай, пра жывёл і

расліны, пра поры года, пра чарадзейнае і фантастычнае, пра гісторыю машын і рэчаў, пра герояў, пісьменнікаў, дзеячаў навукі і мастацтва.

**Работа з дзіцячай кнігай.** Самастойна і з дапамогай бібліятэкара знаходзіць у бібліятэцы кнігі па пэўнай тэме чытання, карыстаючыся рэкамендацыйным паказальнікам, кніжнай выстаўкай або адкрытым доступам да кніжных паліц.

Самастойна знаёміцца з новай кнігай перад чытаннем.

Свабодна арыентавацца ў кнізе па інфармацыі на вокладцы, тытульным лісце, змесце, а таксама разглядаючы кніжныя ілюстрацыі.

Устанаўліваць тэму творчасці пісьменніка па шэрагу кніг.

Ведаць 2—3 кнігі найбольш вядомых беларускіх дзіцячых пісьменнікаў.

Аднаўляць змест прачытанага па пытаннях настаўніка і ілюстрацыях, вылучаць эпізод твора і пераказваць яго змест, ацэньваць паводзіны і ўчынкі герояў, выказваць адносіны да іх.

Праяўляць акуратнасць і беражлівыя адносіны да кніг.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

прозвішчы беларускіх пісьменнікаў, з якімі знаёміліся неаднаразова на ўроках літаратурнага чытання, назву, змест твораў, якія найбольш спадабаліся;

сродкі выразнага чытання ўголас (паўза, лагічны націск, тон, тэмп);

на памяць 6—8 вершаў;

элементы кнігі (вокладка, тытульны ліст, змест, ілюстрацыя);

правілы беражлівых адносін да кніг.

Вучні павінны н а б ы ц ь у я ў л е н н і аб:

асаблівасцях твораў фальклору (калыханкі, лічылкі, скорагаворкі, загадкі, прыказкі, казкі);

асаблівасцях аўтарскіх мастацкіх твораў (казкі, апавядання, верша, байкі);

мастацкіх сродках выразнасці (вобразныя словы і выразы, параўнанні, адухаўленне з'яў прыроды, эмацыянальна-ацэначныя словы).

Вучні павінны ў м е ц ь:

чытаць правільна, асэнсавана і бегла цэлымі словамі ўголас і моўчкі («самому сабе»);

чытаць выразна ўголас мастацкія творы розных жанраў, карыстаючыся сродкамі інтанацыйнай выразнасці (тон, тэмп, паўза, лагічны націск);

вызначаць тэму і галоўную думку твора;

працаваць з тэкстам: дзяліць яго на часткі, складаць план, падрабязна, выбарачна і сцісла (з дапамогай настаўніка) пераказваць мастацкі твор паводле гатовага плана;

знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць настрой героя, яго думкі, перажыванні;

знаходзіць у тэксце словы, якія перадаюць адносіны аўтара да падзей і герояў;

характарызаваць героя па яго ўчынках і паводзінах;

даваць уласную ацэнку падзеям і героям;

выяўляць у тэксце мастацкія сродкі выразнасці;

знаходзіць у тэксце паэтычнага твора словы, якія перадаюць настрой і пачуцці паэта;

адрозніваць фальклорныя жанры (загадка, прыказка, казка, народная песня, пацешка і інш.) ад літаратурных (апавяданне, верш, літаратурная казка);

прыводзіць прыклады казак народных і літаратурных, вершаў і апавяданняў з шэрагу вывучаных твораў, твораў фальклору (загадка, лічылка, песенька, прыказка);

называць традыцыйную тэматыку кніг для дзяцей малодшага школьнага ўзросту (пра Радзіму, герояў, дзяцей, жывёл і расліны, поры года, чарадзейнае і фантастычнае, гісторыю машын і рэчаў, дзеячаў навукі і мастацтва);

самастойна выбіраць і чытаць дзіцячыя кнігі, часопісы, газеты;

знаходзіць у бібліятэцы кнігі па пэўнай тэме чытання, карыстаючыся рэкамендацыйным паказальнікам або адкрытым доступам да кніжных паліц, кніжнай выстаўкай;

свабодна арыентавацца ў кнізе па інфармацыі на вокладцы, тытульным лісце, у змесце, па ілюстрацыі;

карыстацца відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі.

# РУССКИЙ ЯЗЫК

## I—IV классы

### ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

**Цель** обучения русскому языку в II—IV классах учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения — научить учащихся свободно общаться на русском языке в устной и письменной форме, читать и понимать художественную литературу на русском языке.

Обучение осуществляется в единстве с решением воспитательных задач, осознания неразрывности и взаимодействия языка, культуры и личности ученика.

**Задачи** курса русского языка:

- формирование представлений о системе русского языка, его фонетике, лексике, грамматике;
- овладение языковыми знаниями, умениями, навыками;
- формирование орфографических и пунктуационных умений и навыков;
- формирование коммуникативных и речевых умений и навыков;
- развитие связной устной и письменной речи, мышления учащихся;
- знакомство с элементами культуры и быта русского народа;
- формирование культуры речевого общения и поведения;
- привитие интереса к русскому языку и русской литературе;
- эстетическое и нравственное воспитание детей средствами языка и литературы.

Программа по русскому языку базируется на ситуативно-тематическом, дифференциально-систематическом, коммуникативно-речевом и культуросообразном **принципах.**

Реализация ***ситуативно-тематического принципа***, положенного в основу отбора содержания программы для I класса (устный курс), позволяет выделить перечень конкретных тем

и ситуаций общения, которые актуальны для детей 6-летнего возраста и учитывают их познавательный интерес и возрастные особенности. Одновременно лексика и речевые модели отобранных тем и ситуаций обеспечивают элементарное общение учащихся I класса на русском языке в простейших жизненных ситуациях.

***Дифференциально-систематический принцип*** означает, что явления русского языка излагаются в программе системно, однако особое внимание уделяется фактам русского языка, составляющим его специфику, отличающим его от белорусского языка. Ознакомление учащихся с такими явлениями проводится по специальной методике, позволяющей школьникам усваивать их осознанно, отличать от сходных фактов белорусского языка и тем самым предупреждать интерференционные ошибки. Дифференциально-систематический принцип предполагает также осуществление опоры на родной язык, на те факты белорусского языка, которые совпадают с соответствующими явлениями русского языка. Они естественно входят в речевое сознание школьников и осмысливаются ими как элементы русской языковой системы.

***Коммуникативно-речевой принцип*** означает ориентацию на взаимосвязанное обучение всем видам речевой деятельности (аудированию, говорению, чтению, письму) с тем, чтобы сформировать у учащихся способность (умения, навыки) решать языковыми средствами коммуникативные задачи в разных ситуациях общения. Языковой материал при таком подходе изучается не как самоцель, а на функциональной основе, когда внимание учащихся сосредоточивается на осознании роли (функции) изучаемых конкретных фактов языка для создания речевых высказываний в устной и письменной форме.

***Принцип культуросообразности*** означает направленность содержания языкового образования в начальной школе на формирование у младших школьников не только познавательных ценностей, но и воспитание средствами русского языка культурных, духовных, нравственных качеств личности ученика. Речевой материал в программе рассматривается как источник знаний о языке, культуре и быте русского народа, как средство нравственного и эстетического воспитания школьников, приви-

тия им интереса к изучению русского языка и русской литературы, формирования культуры речевого поведения и общения.

Структурно программа по русскому языку состоит из четырех **разделов:** подготовительный устный курс (I класс), вводный курс — особенности русского языка (II класс), язык и речь (II—IV классы). В каждом из разделов решаются свои конкретные задачи, которые подчинены основным целям обучения русскому языку.

## Подготовительный устный курс

Устный курс представляет собой предварительный этап в системе обучения русскому языку учащихся I класса учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения. Этот курс выполняет в основном адаптационную роль и направлен на формирование у учащихся первоначальных умений речевой деятельности на русском языке — слушания и говорения.

Содержание устного курса очерчено 20 отобранными на основе ситуативно-тематического принципа темами и ситуациями общения, которые отражены и раскрыты в прозаических и стихотворных текстах русского фольклора (сказки, загадки, скороговорки, считалки, речевки), текстах русской детской классики, произведениях современных прозаиков и поэтов и которые отвечают возрастным особенностям учащихся I класса, учитывают их потребности и интересы и способствуют формированию нравственной, эмоциональной, эстетической сторон личности младшего школьника.

**Задачи** устного курса:

- формирование умения воспринимать (слушать, слышать и понимать) русскую устную речь и отличать ее от белорусской устной речи;
- развитие фонематического слуха учащихся, формирование первоначальных навыков русской устной речи (произношение отдельных слов, скороговорок, потешек, заучивание стихов со специфическими русскими звуками [г], [г′], [р′], [ч′], [щ′], [д′], [т′]);
- обогащение и активизация русского словарного запаса учащихся;

- формирование умения вести элементарные диалоги, создавать небольшие собственные высказывания на русском языке (с опорой на образец, наводящие вопросы учителя, ситуативные картинки);
- воспитание культуры речи, практическое усвоение и активизация в устной речи учащихся формул речевого этикета — приветствия, прощания, благодарности;
- расширение представлений об окружающей действительности, нравственное и эстетическое воспитание через восприятие произведений русской классической и современной детской литературы и устного народного творчества;
- знакомство с элементами русской культуры и быта;
- привитие интереса к изучению русского языка;
- формирование первоначального навыка чтения на русском языке (чтение отдельных слов, графический облик и лексический смысл которых совпадают в русском и белорусском языках, а также отдельных предложений из 2—5 слов).

Решение поставленных задач осуществляется в процессе слухового восприятия учащимися различных по жанру произведений классической и современной русской детской литературы, произведений русского фольклора и последующего организованного общения на русском языке учащихся с учителем и друг с другом. Русские литературные тексты предъявляются учащимся как через образцовую русскую речь учителя (чтение и рассказывание), так и в форме звукозаписи (грамзапись, аудиокассеты), через видеокассеты, диафильмы. Прослушивание текстов сопровождается дальнейшим выполнением системы заданий на проверку адекватности восприятия учащимися содержания текстов и включения их в творческий процесс создания собственных высказываний на русском языке: это ответы на вопросы учителя; драматизация, инсценирование сказок; разыгрывание диалогов; использование лексических игр; заучивание наизусть скороговорок, стихов; рисование иллюстраций и т. д. Перечисленные задания и формы работы способствуют тому, что каждый учащийся становится активным и равноправным участником всех коммуникативно-речевых процессов в классе.

## Вводный курс. Особенности русского языка

**Задачи** вводного курса:

- ознакомление учащихся со звуко-буквенной системой русского языка и формирование навыков произношения специфических русских звуков [г], [г′], [р′], [ч′], [щ′], [д′], [т′];
- ознакомление со специфическими буквами русского алфавита ***и, щ, ъ*** и формирование навыка чтения слов, предложений, текстов с этими буквами;
- обогащение словаря учащихся;
- формирование у учащихся умения строить высказывания на русском языке (ответы на вопросы по содержанию прочитанных текстов, пересказ текстов);
- формирование умения грамотно списывать слова и предложения, не содержащие трудных орфограмм;
- практическое усвоение формул речевого этикета;
- эстетическое и нравственное воспитание учащихся.

Занятия на этом этапе обучения проводятся в виде интегрированных уроков (без разделения на уроки языка и чтения). Это комплексные многоцелевые уроки. Их основная задача — развитие русской речи учащихся и формирование навыков русского литературного произношения.

## Язык и речь

Главными **задачами**, которые решаются при изучении данного раздела, являются:

- усвоение фонетической и графической систем русского языка;
- формирование представлений о составе слова, понятий о морфемах;
- формирование грамматических представлений и понятий в области морфологии и синтаксиса, их осознание с функциональной точки зрения;
- формирование умения использовать грамматические явления в собственной речи;
- овладение элементарными пунктуационными нормами;
- формирование представлений об основном законе письма в русском языке, умений и навыков в области правописания, воспитание орфографической зоркости;

- формирование основных речеведческих представлений и понятий и на их основе формирование умения пересказывать готовые тексты и строить собственные связные высказывания с соблюдением основных требований, предъявляемых к связной речи.

Реализация важнейшей цели данного учебного курса — развитие русской речи учащихся — требует систематической взаимосвязанной работы над языком и речью в течение всего периода обучения. Достижению этой цели будут способствовать: восприятие учащимися речи и ее анализ; осознание речи как коммуникативной деятельности, осмысление видов речи; овладение рядом конкретных представлений и понятий в области связной речи (текст, его структура, тема, заголовок, основная мысль; типы текстов и особенности их построения); формирование умения строить связные высказывания (устные и письменные) в соответствии с коммуникативными целями; обогащение словаря учащихся русской лексикой, работа над лексическим значением слов, их отношениями с другими словами (синонимы, антонимы, родственные слова); овладение учениками умением использовать слова в предложении в соответствии с литературными нормами языка; формирование орфографических и пунктуационных навыков; формирование языковых представлений и понятий в области фонетики, лексики, словообразования, грамматики и осмысление функционального назначения данных языковых явлений в речи.

Выполнение требований программы предусматривает использование, кроме учебника, других средств обучения, прежде всего ***тетради*** на печатной основе, назначение которой многопланово. Тетрадь по русскому языку на печатной основе является средством оперативного контроля знаний и умений учащихся, их самостоятельной работы, индивидуального и дифференцированного подхода к обучению. Ее применение экономит учебное время, позволяет использовать нетрадиционные формы работы, повышает познавательную активность учащихся.

# I КЛАСС

## (30 ч)

## ПОДГОТОВИТЕЛЬНЫЙ УСТНЫЙ КУРС[1]

Русская речь, различение устной русской и белорусской речи.

Произведения русского фольклора, русской детской классики, современных детских писателей и поэтов (восприятие на слух). Обогащение словаря учащихся русской лексикой.

Построение элементарных высказываний (ответы на вопросы по содержанию текста, драматизация и ролевое воспроизведение текстов).

Воспроизведение готовых диалогов, разыгрывание диалогов (по образцу, по заданной ситуации). Построение элементарных высказываний в простейших ситуациях общения.

Произношение специфических русских звуков [г], [г′], [р′], [ч′], [щ′], [д′], [т′] (формирование первоначальных навыков).

Формулы русского речевого этикета — приветствия, прощания, благодарности, извинения (практическое усвоение).

Раскрашивание и рисование иллюстраций к прослушанным текстам.

Лексические игры, разгадывание ребусов, отгадывание загадок.

Чтение (эпизодическое) отдельных слов, несложных предложений из 2—5 слов (начиная со второй половины года).

## ТЕМАТИКА УСТНОГО КУРСА

### I. Слушаем, запоминаем, говорим, играем (20 ч)

1. Мы изучаем русский язык (1 ч).
2. Знакомство (1 ч).
3. Осень школьная пришла (1 ч).
4. Давайте дружить (1 ч).

---

[1] Подготовительный устный курс изучается после завершения курса «Введение в школьную жизнь».

5. Моя семья (1 ч).
6. Учимся вежливости (5 ч).
7. Праздник чудный — Новый год (1 ч).
8. Что такое хорошо и что такое плохо (3 ч).
9. Солнце, воздух и вода — наши лучшие друзья (2 ч).
10. Добро не умрет, и зло пропадет (1 ч).
11. Мамин день (1 ч).
12. Без труда не выловишь рыбку из пруда (1 ч).
13. Кем быть? (1 ч).

### II. **Слушаем, говорим, учимся читать** (10 ч)

1. В слова играем, друг друга понимаем (2 ч).
2. Сказка — в жизни подсказка (2 ч).
3. Наши домашние любимцы (1 ч).
4. Земное чудо — лес (1 ч).
5. С любовью к природе (1 ч).
6. Учимся видеть прекрасное (2 ч).
7. День за днем (1 ч).

## ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К ЗНАНИЯМ, УМЕНИЯМ И НАВЫКАМ УЧАЩИХСЯ I КЛАССА

Учащиеся должны з н а т ь:

наизусть заученные скороговорки, стихи;

формулы речевого этикета: приветствия, прощания, благодарности.

Учащиеся должны у м е т ь:

различать русскую и белорусскую речь на слух;

понимать общий смысл прослушанных произведений;

прогнозировать содержание, а также устанавливать последовательность событий по данным к текстам иллюстрациям и рисункам;

правильно произносить (имитация вслед за учителем) отдельные звуки, а также слова, скороговорки, стихи со специфическими русскими звуками [г], [г′], [р′], [ч′], [щ′], [д′], [т′];

отвечать на вопросы по содержанию текста, используя слова вопросов;

вести элементарные ситуативные диалоги с 4—6 репликами-вопросами и репликами-ответами;

читать по слогам отдельные слова, совпадающие по графическому начертанию и лексическому значению в русском и белорусском языках, предложения (из 2—5 слов).

# II КЛАСС

## (72 ч)

### ВВОДНЫЙ КУРС. ОСОБЕННОСТИ РУССКОГО ЯЗЫКА (12 ч)[1]

Специфические звуки русского языка: [г], [г′], [р′], [ч′], [щ′], [д′], [т′].

Специфические буквы русского алфавита: ***и, щ, ъ***.

Чтение и списывание слов, предложений и небольших текстов. Составление и запись словосочетаний и предложений (по образцам, опорным словам).

Ответы на вопросы по содержанию текстов (прочитанных учащимися самостоятельно или воспринятых на слух); пересказ несложных текстов.

Составление небольших высказываний (по вопросам учителя, по картинкам).

Звуковой анализ односложных и двусложных слов типа *конь, оре́х*.

### Перечень тем вводного курса и его фонетико-графическое содержание

Буква ***и***. Чтение слов с буквой ***и***. Письмо буквы ***и*** (заглавной и строчной).

Звуки [г], [г′]: произношение и обозначение на письме *(гром, гитара, пироги)*; звук [к] на месте буквы ***г*** в конце слова *(луг, друг)*.

---

[1] Интегрированный вводный курс изучается в течение 4 недель по 3 часа в неделю (4 часа добавлены из уроков литературного чтения).

Звук [р′]: произношение и обозначение на письме *(б**р**юки, две**рь**)*. Различение звуков [р]—[р′].

***О*** в ударных и безударных слогах. Произнесение (при чтении) звука [а] на месте буквы ***о*** в начале слова и в первом предударном слоге после твердых согласных в словах типа ***о**го́нь, в**о**да́, н**о**га́*.

***Е, я*** в ударных и безударных слогах. Произнесение (при чтении) звука [и] на месте букв ***е, я*** в безударных слогах слов типа *в**е**дро́, п**я**та́к, за́**я**ц*.

Звук [т′]: произношение и обозначение на письме *(**т**ихо, ап**т**ека)*.

Звук [д′]: произношение и обозначение на письме *(**д**ень, **д**я**д**я)*; звук [т′] на месте букв ***дь*** в конце слова *(тетра**дь**, медве**дь**)*.

Звук [ч′]: произношение и обозначение на письме *(до**чь**, **ч**ай, гра**ч**)*.

Звук [щ′]: произношение и обозначение на письме *(**щ**ука, товари**щ**)*. Буква ***щ*** (заглавная и строчная).

Разделительный твердый знак ***(ъ)***. Написание слов с разделительным твердым знаком *(с**ъ**есть, в**ъ**ехать, об**ъ**яснить)*.

Этика речи. Формулы речевого этикета: приветствия, прощания, благодарности.

## ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К ЗНАНИЯМ, УМЕНИЯМ И НАВЫКАМ УЧАЩИХСЯ

Учащиеся должны з н а т ь:

буквы русского алфавита (печатные и рукописные, строчные и заглавные);

наизусть несколько (не менее 5) стихотворений, скороговорок, считалок.

Учащиеся должны у м е т ь:

правильно произносить (в собственной речи и при чтении) все звуки русского языка, в том числе звуки [г], [г′], [р′], [ч′], [щ′], [д′], [т′];

- соблюдение пауз внутри и в конце предложения с опорой на знаки препинания (запятую, двоеточие, точку с запятой и тире), между абзацами;
- выделение с помощью логического ударения слов, обозначающих перечисление предметов, действий, качеств, слов-сравнений, слов-обращений, важных по смыслу слов;

---

[1] В данное количество входит 4 часа на внеклассное чтение.

- соблюдение тона и темпа чтения в зависимости от эмоционального настроения произведения, состояния героев;
- определение с помощью учителя задачи выразительного чтения: что необходимо передать слушателям при чтении.

Развитие умения оценивать свое и чужое чтение с позиций правильности и выразительности.

### Читательские умения и литературные представления, которые формируются у учащихся

На протяжении учебного года на новом литературном материале в процессе практической работы с текстом, с опорой на знания и умения, полученные на уроках по предмету «Літаратурнае чытанне», происходит дальнейшее развитие читательских умений учащихся и накопление их литературных представлений.

Учащиеся овладевают умениями:

- прогнозировать содержание, эмоциональный характер и жанр произведения по иллюстрациям, заголовку, опорным словам;
- выявлять слова и выражения, которые препятствуют пониманию прочитанного, определять их значение через контекст и с помощью словаря;
- определять время и место событий, устанавливать смысловые связи между событиями: последовательные и причинные;
- определять тему и основную мысль произведения, соотносить заглавие произведения с его темой и основной мыслью;
- выделять действующих лиц, называть главного героя, определять его поступок и причину поступка;
- наблюдать за эмоциональным состоянием героя и соотносить это состояние с поступком;
- выделять в тексте предложения, которые описывают состояние, чувства действующих лиц, отношение к ним писателя (по метким словам, прямому высказыванию);
- находить с помощью выборочного чтения описание картин природы;
- представлять в своем воображении героя, картину природы и рассказывать об этом;

- высказывать свое отношение к содержанию произведения, давать свою оценку поступку, герою;
- определять общее эмоциональное настроение поэтического произведения;
- наблюдать за формой повествования художественного произведения: от чьего имени ведется рассказ, кем рассказано стихотворение;
- наблюдать за построением эпического произведения, с помощью учителя определять его структурные части: начало, развитие действия, концовка;
- самостоятельно и с помощью учителя составлять план текста, подробно и выборочно (с помощью учителя) пересказывать прочитанное по плану;
- коллективно составлять творческий пересказ;
- иллюстрировать содержание произведения рисунками (словесное и графическое рисование), придумывать подписи к ним;
- инсценировать несложное сюжетное произведение (сказка, рассказ) либо отдельные его эпизоды;
- находить в стихотворении рифму, примеры звукоподражания;
- находить в произведении слова, которые передают одушевление природных явлений; образные слова и выражения, объяснять их значение;
- находить в произведении эмоционально-оценочные слова, определять их смысловую роль;
- наблюдать за жанровыми особенностями басни: действующие лица — животные; подразумеваемый (иносказательный) смысл, насмешка, ирония автора, мораль — основная мысль басни;
- самостоятельно ориентироваться в книге по оглавлению.

### Внеклассное чтение

**Круг чтения.** Небольшие художественные, научно-художественные и научно-познавательные произведения для самостоятельного чтения из детских книг русских писателей; детские журналы и газеты по выбору учителя, книги-справочники, словари.

На уроках внеклассного чтения дети знакомятся не с одной, а с несколькими книгами (от 2 до 4), объединенными общей темой или жанром.

**Тематика чтения** определяется в соответствии с тематикой уроков литературного чтения, а также может расширяться: о Родине, о ее героях, о разных людях: детях и взрослых, храбрецах и трусах, трудолюбивых и ленивых и т. д., о животных и растениях, о машинах и вещах, приключениях и фантастике.

**Работа с детской книгой**. Знания, умения и навыки работы с детской книгой такие же, как и на уроках внеклассного чтения на белорусском языке.

С помощью библиотекаря и самостоятельно выбирать книги в соответствии с поставленной учителем целью.

Ориентироваться в содержании книги по информации на обложке, титульном листе, по иллюстрациям. Уметь пользоваться оглавлением.

Определять тему творчества писателя по его книгам.

Уметь пользоваться справочной литературой, читать детские газеты и журналы, работать в библиотеке (школьной, районной).

Желательно, чтобы в классной библиотеке были подшивки детских журналов и газет на русском языке, художественные произведения русских писателей.

## ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К ПОДГОТОВКЕ УЧАЩИХСЯ III КЛАССА

Учащиеся должны з н а т ь:

фамилии писателей, с творчеством которых знакомились неоднократно на уроках литературного чтения (А. Пушкин, Л. Толстой, И. Крылов, В. Бианки, Г. Скребицкий, А. Барто);

названия и содержание наиболее понравившихся произведений;

наизусть 4 стихотворения, рекомендованные для заучивания.

Учащиеся должны и м е т ь п р е д с т а в л е н и е о:

произведениях устного народного творчества (песня, закличка, небылица);

басне и ее особенностях;

средствах выразительного чтения: пауза, логическое ударение, тон голоса, темп чтения.

Учащиеся должны у м е т ь:

читать целыми словами правильно, с соблюдением фонетико-орфоэпических норм русского языка:

правильно произносить при чтении специфические русские звуки [г], [г′], [р′], [ч′], [щ′], [д′], [т′],

произносить при чтении звук [л] на конце глаголов прошедшего времени мужского рода единственного числа *(пел)* и в словах типа *волк*,

звук [в] перед согласными в начале, середине и конце слов *(вниз, автор, лев)*,

произносить при чтении [й] в словах, оканчивающихся на ***-ый, -ий, -ой***; [-ово], [-ево] в прилагательных и местоимениях родительного падежа единственного числа мужского рода и среднего рода *(крас**ного**, на**шего**)*; [-цца] в глагольных формах *(купа**ться**)*,

правильно произносить при чтении буквосочетания ***жи — ши, же — ше;***

читать выразительно стихи и прозу, используя интонацию предложения, паузы, логическое ударение, соблюдая тон и темп чтения, соответствующий эмоциональному состоянию героя, эмоциональному настроению произведения;

правильно называть прочитанное произведение (фамилия автора, заглавие);

прогнозировать содержание произведения по иллюстрациям, заголовку, опорным словам;

определять тему и основную мысль произведения (самостоятельно и с помощью учителя);

устанавливать связь между событиями в изучаемом произведении;

находить в тексте описания действующих лиц и описания природы;

находить в тексте слова, которые указывают на эмоциональное состояние (настроение, чувства) героя;

представлять в своем воображении героя, картину природы и рассказывать об этом;

характеризовать героя на основании его поступка;

определять (с помощью учителя и самостоятельно) отношение автора произведения к событиям и героям;

оценивать события, поступки героев и выражать к ним свое отношение;

определять общее эмоциональное настроение стихотворения-описания;

находить в стихотворении рифму, примеры звукоподражания, образные слова и выражения, объяснять их значение;

самостоятельно делить произведение на части, выделять главное в каждой части, составлять план текста (самостоятельно и с помощью учителя); подробно и выборочно (под руководством учителя) пересказывать произведение;

узнавать загадки, небылицы, народные песни; пословицы;

различать сказку, рассказ, басню.

## IV КЛАСС

### Тематика чтения по учебнику «Литературное чтение» (35 ч)[1]

1. У истоков народной мудрости (5 ч).
2. По волшебной тропинке пойдешь — в сказочный мир попадешь (4 ч).
3. Наедине с живой природой (6 ч).
4. У каждого месяца свои порядки (10 ч).
5. Жизнь дана на добрые дела (5 ч).
6. Веселая семейка (5 ч).

### Чтение учащихся

Совершенствование навыка чтения целыми словами в темпе, соответствующем скорости разговорной речи ученика. Освоение способа чтения «про себя».

Формирование правильного чтения по-русски с соблюдением фонетико-орфоэпических норм русского языка.

Формирование умения оценивать свое и чужое чтение в соответствии с орфоэпическими нормами русского языка.

---

[1] В данное количество входит 4 часа на внеклассное чтение.

Овладение средствами выразительного чтения:

- соблюдение интонации конца предложения, пауз внутри и в конце предложения; между абзацами, между стихотворными строфами;
- выделение с помощью логического ударения важных по смыслу слов;
- соблюдение тона и темпа чтения в зависимости от эмоционального состояния героя и эмоционального настроения произведения;
- самостоятельное определение задачи выразительного чтения: что необходимо передать слушателям при чтении.

Совершенствование умения оценивать свое и чужое чтение с позиций правильности и выразительности.

### Читательские умения и литературные представления, которые формируются у учащихся

На протяжении учебного года на новом литературном материале в процессе практической работы с текстом с опорой на знания и умения, полученные на уроках по предмету «Літаратурнае чытанне», происходит совершенствование читательских умений учащихся и накопление их литературных представлений.

Учащиеся овладевают умениями:

- прогнозировать содержание, эмоциональный характер и жанр произведения по иллюстрациям, заголовку, опорным словам;
- выявлять слова и выражения, которые препятствуют пониманию прочитанного;
- объяснять лексическое значение непонятных слов через контекст и с помощью словаря;
- устанавливать причинно-следственные связи между событиями;
- определять тему и главную мысль произведения;
- выделять главное действующее лицо произведения и второстепенные действующие лица, анализировать их взаимоотношения, поступки;

- определять эмоциональное состояние персонажей и соотносить его с поступками;
- определять авторское отношение к событиям, героям;
- находить в тексте описания персонажей, картин природы, представлять в своем воображении героя, картину природы и рассказывать об этом;
- характеризовать героя на основании его поведения, переживаний и поступков и выражать свое отношение к нему;
- самостоятельно делить текст на смысловые части, составлять план, подробно, выборочно (отдельный эпизод, описание персонажа, описание картины природы) и кратко (с помощью учителя) пересказывать литературное произведение по готовому плану;
- коллективно составлять творческий пересказ;
- иллюстрировать содержание произведения рисунками (словесное и графическое рисование);
- инсценировать сюжетное произведение (сказка, рассказ) либо отдельные его эпизоды;
- коллективно сочинять сказку, рассказ по опорным словам;
- наблюдать за особенностями стихотворного произведения (рифмой, стихотворной строкой, средствами выразительности);
- определять общее эмоциональное настроение поэтического произведения;
- выявлять настроение, чувства поэта, вызванные живописными картинами;
- самостоятельно находить в тексте образные слова и выражения, объяснять их значение;
- находить в произведении слова и выражения, которые передают одушевление природных явлений, рассказывать о возникших образах;
- находить в тексте эмоционально-оценочные слова, рассуждать, почему именно это слово выбрано автором, как оно характеризует героя;
- наблюдать за устойчивыми выражениями, объяснять их значение, составлять с ними предложения;
- наблюдать за особенностями былины (главные герои — богатыри);

- выявлять особенности сказки; выделять в ней зачин, повторяющийся основной эпизод, концовку, элементы волшебного, сказочные выражения;
- отличать фольклорные жанры (сказка, былина, пословица, загадка) от литературных (рассказ, басня, стихотворение, литературная сказка);
- самостоятельно ориентироваться в книге по оглавлению;
- самостоятельно пользоваться методическим и ориентировочно-справочным аппаратом учебника (обращаться к сноскам, знать условные обозначения).

### Внеклассное чтение

**Круг чтения**. Художественные, научно-художественные, научно-познавательные книги (о природе, путешествиях, открытиях, очерки о Родине); приключенческая детская книга, справочная детская литература (книги-справочники, детские энциклопедии, словари); детские журналы и газеты по выбору учителя.

Для чтения предлагаются произведения из книг разного объема: от 16 до 300 и более страниц (книги-сборники, собрания сочинений детских писателей, энциклопедические словари).

**Тематика чтения** определяется в соответствии с тематикой уроков литературного чтения, а также может расширяться: о Родине, ее истории, детях-героях, о ребятах-сверстниках и их делах, жизни детей в других странах, о природе, животных и растениях, о науке и технике (о машинах, вещах, космосе), о писателях, музыкантах, художниках, артистах, о путешествиях, приключениях и фантастике.

**Работа с детской книгой.** Самостоятельно и с помощью библиотекаря подбирать книги на определенную тему чтения, пользуясь видами библиотечно-библиографической помощи: рекомендательными указателями, книжной выставкой, открытым доступом к книжным полкам, авторским каталогом.

Самостоятельно знакомиться с новой книгой перед чтением: рассматривать ее с целью ориентировки в содержании по иллюстрациям, заглавию, фамилии автора, оглавлению, предисловию или введению, послесловию об авторе (если они есть в книге).

Самостоятельно читать детские книги, журналы, газеты.

Самостоятельно работать со справочной литературой: словарями, справочниками, энциклопедиями.

Определять тему творчества писателя по его книгам.

Отвечать на вопросы по содержанию самостоятельно прочитанной книги, оценивать поведение и поступки героев, определять личностное отношение к поступкам и героям.

Работать в библиотеке, пользоваться услугами читального зала, открытым доступом к справочной литературе.

## ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К ПОДГОТОВКЕ УЧАЩИХСЯ IV КЛАССА

Учащиеся должны з н а т ь:

фамилии писателей, с творчеством которых знакомились неоднократно на уроках литературного чтения (А. Плещеев, Н. Некрасов, Ф. Тютчев, К. Паустовский);

названия и содержание наиболее понравившихся произведений;

наизусть 4 стихотворения, рекомендованные для заучивания;

элементы книги (обложка, титульный лист, оглавление, иллюстрация и др.);

правила бережного отношения к книгам.

Учащиеся должны и м е т ь п р е д с т а в л е н и я:

о былине и ее особенностях;

о литературной сказке и ее особенностях;

об особенностях стихотворного произведения.

Учащиеся должны у м е т ь:

читать целыми словами правильно, с соблюдением фонетико-орфоэпических норм русского языка;

соблюдать нормы словесного ударения в изученных словах, у которых в русском и белорусском языках не совпадает место постановки ударения (*крапи́ва, реме́нь, ве́рба* и др.);

оценивать свое и чужое чтение в соответствии с орфоэпическими нормами русского языка;

читать правильно, осознанно, целыми словами вслух и молча в темпе, который не препятствует пониманию прочитанного;

читать выразительно вслух стихи и прозу, пользуясь основными средствами интонационной выразительности (эмоциональный тон, темп, ритм, пауза, логическое ударение);

оценивать свое и чужое чтение в соответствии с задачей выразительного чтения;

правильно называть произведение (фамилия автора, заглавие);

различать жанры детской художественной литературы (сказка, рассказ, стихотворение, басня);

различать произведения фольклора (загадка, пословица, песенка, сказка, былина);

приводить примеры сказок народных и литературных (их авторов), стихов и рассказов из круга детского чтения (их авторов);

называть тематику книг для детского чтения (о Родине, ее героях, о детях, труде людей, о природе, животных, растениях, о приключениях, путешествиях, фантастике);

самостоятельно читать детские книги, журналы, газеты;

самостоятельно работать со справочной литературой: словарями, справочниками, детскими энциклопедиями;

подбирать книги в библиотеке (самостоятельно и с помощью библиотекаря) по заданной теме, по авторской принадлежности;

правильно называть книгу (фамилия автора, заглавие);

узнавать, о чем написана книга по информации на обложке, титульном листе, по оглавлению, иллюстрациям;

пользоваться видами библиотечно-библиографической помощи;

самостоятельно применять обозначенные в программе читательские умения работы с текстом.

# МАТЭМАТЫКА

## I—IV класы

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма распрацавана на аснове канцэпцыі матэматычнай адукацыі і стандарту па вучэбным прадмеце «Матэматыка».

**Мэты навучання матэматыцы.** Пачатковае навучанне матэматыцы з'яўляецца, з аднаго боку, састаўной часткай агульнага пачатковага навучання, а з другога — асновай для далейшага вывучэння матэматыкі і іншых вучэбных дысцыплін.

Першы аспект патрабуе ўзгодненасці навучання матэматыцы з іншымі кампанентамі пачатковага навучання: развіццём маўлення, выпрацоўкай навыкаў чытання і пісьма, фізічным развіццём, азнаямленнем з навакольным светам, выхаваннем мастацкага густу, навучаннем бачыць і ствараць прыгожае. Другі аспект прадугледжвае фарміраванне ў вучняў элементарных матэматычных уяўленняў і лагічных структур мыслення, якія рыхтуюць вучняў да выкарыстання матэматычных ведаў у паўсядзённым жыцці і паспяховага засваення ведаў і авалодання спосабамі дзейнасці пры далейшым навучанні як матэматыцы, так і іншым вучэбным прадметам.

Праз пачатковае навучанне матэматыцы адбываецца першаснае засваенне колькасных адносін і прасторавых формаў навакольнага свету, выпрацоўваюцца ўменні прымяняць аналіз, сінтэз, аналогію, абагульненне, абстрагаванне, канкрэтызацыю. Навучанне матэматыцы не толькі прывучае дакладна выконваць разнастайныя прадпісанні, але і фарміруе агульныя прыёмы пошукавай дзейнасці, развівае гібкасць і крытычнасць мыслення, вучыць прагназаваць і ацэньваць свае дзеянні.

Гэта прадвызначае наступныя **мэты пачатковага навучання матэматыцы:**

- авалоданне матэматычнымі ведамі, якія неабходны для практычнай дзейнасці, вывучэння іншых дысцыплін і працягу адукацыі;

- развіццё ўменняў і навыкаў, неабходных не толькі для матэматычнай дзейнасці, але і для паўнавартаснага жыцця ў грамадстве;
- выпрацоўка правільных уяўленняў пра магчымасці матэматыкі ў пазнанні і апісанні рэчаіснасці;
- выхаванне такіх рыс характару асобы, як мэтанакіраванасць, настойлівасць у пераадоленні цяжкасцей, самастойнасць, крытычнасць і варыятыўнасць мыслення.

**Структура пачатковага курса матэматыкі.** Аснову пачатковага курса матэматыкі складае лінія лікаў і арыфметычных дзеянняў над імі. Лініі велічынь, геаметрычных фігур і алгебраічная з'яўляюцца спадарожнымі.

Курс матэматыкі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі мае лінейна-канцэнтрычную будову. У ім вылучаюцца наступныя канцэнтры: далікавы перыяд, адназначныя лікі, двухзначныя лікі да 20, двухзначныя, трохзначныя, чатырохзначныя, мнагазначныя лікі.

Пераход да кожнага наступнага канцэнтра суправаджаецца не толькі пашырэннем мноства вядомых лікаў, але і сістэматызацыяй і паглыбленнем ведаў, увядзеннем новых элементаў у дзейнасць вучняў. Канцэнтрызм спрыяе таксама фарміраванню агульных уяўленняў пра адну з найважнейшых матэматычных структур — мноства натуральных лікаў.

Скразнымі ў пачатковым навучанні матэматыцы з'яўляюцца лініі тэкставых задач, алгарытмічная лінія і эўрыстычная лінія.

Рашэнне тэкставых задач з'яўляецца найважнейшым сродкам фарміравання матэматычных паняццяў, прадухіляе фармалізм у засваенні ведаў, узмацняе развіццёвы эфект навучання матэматыцы. Авалоданне шматлікімі алгарытмамі, засваенне эўрыстычных прыёмаў з'яўляецца неабходнай умовай паўнавартаснай сацыялізацыі вучня.

**Арганізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу.** Вучэбна-выхаваўчы працэс у I—IV класах арганізуецца з улікам узроставых асаблівасцей вучняў, спецыфікі вучэбнага прадмета «Матэматыка», яго месца і ролі ў навучанні. Настаўнік мае права самастойна выбіраць прыёмы навучання з тым, каб забяспечыць дасягненне мэт пачатковага навучання матэматыцы.

Навучанне матэматыцы павінна быць арганізавана такім чынам, каб кожны вучань мог дасягнуць абавязковых вынікаў, а таксама меў магчымасць рэалізаваць свае адукацыйныя запатрабаванні ў вобласці матэматыкі.

Вучань павінен не толькі атрымаць пэўныя веды, але і навучыцца выкарыстоўваць іх пры рашэнні вучэбных задач і задач прыкладнога характару. Мінімальны ўзровень цяжкасці задач вызначаецца абавязковымі вынікамі навучання, якія зафіксаваны ў адукацыйным стандарце. Разам з тым вучням, якія дасягнулі абавязковых вынікаў, прапануюцца больш складаныя задачы.

У працэсе пачатковага навучання матэматыцы трэба рацыянальна спалучаць гульнёвыя, тлумачальна-ілюстрацыйныя і эўрыстычныя метады. Навучанне праз гульню прадугледжвае выкарыстанне спецыяльных навучальных гульняў, у якіх адлюстроўваюцца найважнейшыя матэматычныя ідэі.

Навучанне матэматыцы павінна садзейнічаць развіццю ў вучняў навыкаў вуснага маўлення, пісьма, работы з кнігай. Неабходна клапаціцца пра фарміраванне элементаў арганізацыі разумовай дзейнасці: ставіць мэты, шукаць шляхі для іх дасягнення, планаваць паслядоўнасць дзеянняў, аналізаваць розныя варыянты, ацэньваць магчымыя наступствы і вынікі.

Пры навучанні матэматыцы ў I—IV класах важна забяспечыць засваенне як сэнсу новых паняццяў, так і пэўных фактаў і алгарытмаў. Гэта дасягаецца праз выкарыстанне ў навучанні прадметнай дзейнасці, розных відаў нагляднасці, матэматычных уяўленняў і ведаў пры рашэнні як вучэбных задач, так і задач з практычным зместам.

Фарміраванню паняцця ***ліку*** спрыяе дзейнасць з прадметамі (лічыльным матэрыялам), малюнкамі. Аперыраванне канечнымі мноствамі прадметаў садзейнічае засваенню ***саставу ліку***, служыць асновай для ўвядзення аперацый ***складання*** і ***аднімання*** лікаў. Сэнс складання і аднімання раскрываецца праз рашэнне адпаведных задач. Веды пра склад лікаў першага дзясятка неабходныя для авалодання складаннем і адніманнем лікаў у межах 20. Разрадны састаў лікаў служыць у далейшым асновай аперыравання мнагазначнымі лікамі. У та-

кой паслядоўнасці адбываецца і засваенне дзеянняў ***множання*** і ***дзялення***: ад дзеянняў з прадметамі і іх выявамі праз засваенне сэнсу дзеянняў і запамінанне табліцы множання адназначных лікаў да алгарытму дзеянняў над мнагазначнымі лікамі.

Засваенне ***ўласцівасцей арыфметычных дзеянняў*** спрыяе выкананню вылічэнняў рацыянальнымі спосабамі, служыць асновай для рашэння ўраўненняў. ***Алгебраічныя паняцці*** зменнай, ураўнення, няроўнасці разглядаюцца ў пачатковым курсе матэматыкі на прапедэўтычным узроўні і выконваюць дапаможную ролю.

Важным з практычнага пункта гледжання аспектам прымянення лікаў з'яўляюцца ***вымярэнні велічыняў***. Вучні павінны атрымаць уяўленне пра тое, што суаднясенне з пэўнай велічынёй таго ці іншага ліку адбываецца ў выніку спецыяльнай працэдуры — працэдуры вымярэння велічыні з дапамогай выбранай адзінкі вымярэння. У I—IV класах вучні знаёмяцца з вымярэннем даўжыні, масы, часу, плошчы.

Адной з мэт пачатковага навучання матэматыцы з'яўляецца асваенне навакольнай прасторы, развіццё прасторавых уяўленняў. Гэтаму служыць вывучэнне ***геаметрычнага матэрыялу***: знаёмства з целамі, паверхнямі, лініямі, вылучэнне фігур пэўнай формы, некаторых характарыстык гэтых фігур.

## I КЛАС

**(120 гадзін)**

### Параўнанне прадметаў і мностваў прадметаў, прасторавыя і часавыя ўяўленні (16 гадзін)

Атаясамліванне і адрозніванне прадметаў па адной уласцівасці: форме (круглыя, трохвугольныя, квадратныя, прамавугольныя), памеры (малыя, вялікія), колеры. Узаемнае размяшчэнне прадметаў: *зверху, знізу, вышэй, ніжэй, злева, справа, лявей, правей, перад, за, паміж, побач.* Часавыя ўяўленні: *спачатку, потым, раней, пазней, да, пасля.*

Класіфікацыя прадметаў па адной і дзвюх уласцівасцях.

Упарадкаванне прадметаў дадзенага мноства. Параўнанне мностваў прадметаў па колькасці: *больш, менш, столькі ж, больш на, менш на.*

Называнне лікаў ад 1 да 20. Лічэнне прадметаў.

### **Адназначныя лікі** (34 гадзіны)

Назвы, паслядоўнасць і абазначэнне лікаў 1, 2, 3, 4, 5.

Лік 0 і яго абазначэнне.

Параўнанне лікаў. Знакі «>», «<», «=».

Атрыманне ліку дадаваннем адзінкі да папярэдняга ліку, адніманнем адзінкі ад ліку, які ідзе непасрэдна за ім. Знакі «+» і «−». Састаў лікаў 2, 3, 4, 5.

Лікі 6, 7, 8, 9. Параўнанне адназначных лікаў. Дадаванне і адніманне адзінкі. Састаў лікаў 6, 7, 8, 9.

Складанне і адніманне адназначных лікаў на аснове лічэння прадметаў. Складанне і адніманне з нулём.

Рашэнне простых задач на знаходжанне сумы і рознасці.

### **Двухзначныя лікі да 20** (60 гадзін)

Лік 10. Састаў ліку 10. Утварэнне лікаў ад 11 да 20 прылічваннем адзінкі. Называнне, чытанне і запіс лікаў ад 11 да 20. Дзесяцічны састаў лікаў да 20.

Параўнанне лікаў у межах 20.

Складанне і адніманне лікаў у межах 20 без пераходу праз дзясятак. Назвы кампанентаў складання і аднімання. Узаемасувязь складання і аднімання.

Табліца складання лікаў у межах 10. Прыёмы складання і аднімання лікаў: прылічванне (адлічванне) па адным, складанне (адніманне) па частках, выкарыстанне перамяшчальнай уласцівасці складання, адніманне з апорай на састаў ліку.

Знаёмства з прыёмам падбору невядомага кампанента складання (аднімання) па вядомых кампаненце і выніку дзеяння ($\square + 2 = 5$; $3 + \square = 7$; $\square - 3 = 4$; $7 - \square = 5$).

Лікавыя выразы ў 1—2 дзеянні: чытанне, запіс, знаходжанне значэння.

Рашэнне простых задач на павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак.

Пункт. Прамая і крывая лініі. Адрэзак. Даўжыня адрэзка. Параўнанне адрэзкаў па даўжыні. Вымярэнне даўжыні адрэзка. Адзінкі вымярэння даўжыні: *сантыметр, дэцыметр*.

Адзінка вымярэння часу: *гадзіна*.

### **Паўтарэнне за I клас** (10 гадзін)

Нумарацыя адназначных лікаў і двухзначных лікаў да 20.

Складанне і адніманне лікаў у межах 10. Табліца складання і аднімання. Прыёмы складання і аднімання. Складанне і адніманне лікаў у межах 20 без пераходу праз дзясятак.

Рашэнне простых задач на знаходжанне сумы і рознасці, павелічэнне або памяншэнне ліку на некалькі адзінак.

Геаметрычныя фігуры. Распазнаванне фігур па форме, памерах.

Прамая. Адрэзак. Вымярэнне даўжыні пры дапамозе лінейкі.

Вызначэнне часу з дакладнасцю да гадзіны.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ I КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

паслядоўнасць лікаў ад 0 да 20;

дзесяцічны састаў лікаў ад 10 да 20;

табліцу складання ў межах 10 і адпаведныя выпадкі аднімання.

Вучні павінны ў м е ц ь:

лічыць прадметы ў межах 20;

чытаць і запісваць лікі ў межах 20;

параўноўваць лікі ў межах 20;

рашаць задачы на знаходжанне сумы і рознасці, павелічэнне або памяншэнне ліку на некалькі адзінак у 1 дзеянне ў межах 20 без пераходу праз дзесятак;

параўноўваць адрэзкі па даўжыні.

# II КЛАС

## (136 гадзін)

### **Паўтарэнне за I клас** (10 гадзін)

Нумарацыя адназначных лікаў.

Прыёмы складання і аднімання лікаў у межах 10.

Лікі да 20. Дзесяцічны састаў лікаў да 20. Параўнанне лікаў.

Назвы кампанентаў пры складанні і адніманні.

Адзінкі вымярэння даўжыні: *сантыметр, дэцыметр*.

Рашэнне простых задач.

### **Таблічнае складанне і адпаведныя выпадкі аднімання** (28 гадзін)

Прыёмы вуснага складання адназначных лікаў з пераходам праз дзясятак. Прыёмы аднімання лікаў з пераходам праз дзясятак.

Табліца складання адназначных лікаў.

Рашэнне простых задач на рознаснае параўнанне, на знаходжанне невядомага складаемага, памяншаемага, аднімаемага.

Састаўная задача. Рашэнне састаўных задач у 2 дзеянні.

### **Лікі ад 21 да 100** (13 гадзін)

Вусная і пісьмовая нумарацыя двухзначных лікаў у межах 100. Разрадны састаў двухзначных лікаў. Прадстаўленне двухзначных лікаў у выглядзе сумы разрадных складаемых. Параўнанне двухзначных лікаў.

Адваротная задача.

Даўжыня. Адзінка вымярэння даўжыні: *метр*.

Час. Адзінкі вымярэння часу: *гадзіна, мінута*. Вызначэнне часу па цыферблатным гадзінніку.

### **Пазатаблічнае складанне і адніманне лікаў у межах 100** (57 гадзін)

Прыёмы вуснага складання і аднімання двухзначных лікаў: па частках; з вылучэннем разрадаў; з прымяненнем пе-

рамяшчальнай уласцівасці складання; адніманне з апорай на разрадны састаў ліку.

Алгарытмы пісьмовага складання і аднімання двухзначных лікаў. Праверка складання і аднімання.

Лікавыя выразы ў два дзеянні з дужкамі і без дужак: чытанне, запіс і знаходжанне значэння.

Узнаўленне падборам лікаў у запісах віду: $\square + a = b$; $a + \square = b$; $\square - a = b$; $a - \square = b$; $\square > a$; $\square < b$; $a + \square > b$; $\square - a > b$; $a - \square > b$.

Прамы вугал. Прамавугольнік. Квадрат.

Ломаная. Звёны ломанай. Даўжыня ломанай. Перыметр трохвугольніка, чатырохвугольніка.

### **Множанне і дзяленне** (23 гадзіны)

Простыя задачы, якія раскрываюць сэнс множання. Назвы кампанентаў пры множанні. Табліцы множання ліку 2 і на 2, ліку 3 і на 3.

Простыя задачы, якія раскрываюць сэнс дзялення. Назвы кампанентаў пры дзяленні. Табліцы дзялення на лікі 2 і 3, а таксама з дзеллю 2 і 3.

Перыметр прамавугольніка, квадрата.

### **Паўтарэнне за II клас** (5 гадзін)

Вусная і пісьмовая нумарацыя двухзначных лікаў.

Прыёмы вуснага складання і аднімання двухзначных лікаў.

Алгарытмы пісьмовага складання і аднімання двухзначных лікаў.

Рашэнне простых і састаўных задач.

Вуглы. Прамы вугал. Прамавугольнік. Перыметр прамавугольніка і квадрата.

Адзінкі вымярэння даўжыні; суадносіны паміж імі.

Адзінкі вымярэння часу; суадносіны паміж імі.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

паслядоўнасць лікаў ад 0 да 100;

разрадны састаў двухзначных лікаў;
табліцу складання адназначных лікаў і адпаведныя выпадкі аднімання;
прыёмы вуснага і пісьмовага складання і аднімання;
назвы кампанентаў аперацый складання, аднімання;
адзінкі вымярэння даўжыні: *метр, дэцыметр, сантыметр*;
адзінкі вымярэння часу: *гадзіна, мінута.*

Вучні павінны у м е ц ь:
чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 100;
рашаць задачы ў 1—2 дзеянні на складанне, адніманне;
знаходзіць падборам невядомы кампанент дзеяння па вядомых кампаненце і выніку;
знаходзіць даўжыню ломанай, перыметр прамавугольніка;
вызначаць час па гадзінніку.

## III КЛАС

### (140 гадзін)

#### **Паўтарэнне за II клас** (12 гадзін)

Вусная і пісьмовая нумарацыя двухзначных лікаў.

Прыёмы вуснага і пісьмовага складання і аднімання двухзначных лікаў.

Знаходжанне невядомых кампанентаў пры складанні і адніманні.

Сэнс дзеянняў множання і дзялення.

Сувязь дзеянняў множання і дзялення.

#### **Множанне і дзяленне** (65 гадзін)

Табліцы множання і дзялення. Множанне і дзяленне на 1. Множанне нуля, множанне на нуль, дзяленне нуля на адрозны ад нуля лік. Немагчымасць дзялення на нуль. Множанне на 10.

Простыя задачы на павелічэнне або памяншэнне ліку ў некалькі разоў і на кратнае параўнанне лікаў.

Доля. Рашэнне задач на знаходжанне долі ліку.

Выразы з пераменнай. Вылічэнне значэнняў выразу з пераменнай пры зададзеных значэннях пераменнай.

Рашэнне ўраўненняў віду: $x + a = b$; $a + x = b$; $x - a = b$; $a - x = b$; $x \cdot a = b$; $a \cdot x = b$; $x : a = b$; $a : x = b$ на аснове залежнасці паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў.

Рашэнне падборам няроўнасцей віду: $a \cdot x > b$; $x \cdot a > b$; $x : a > b$; $a : x > b$; $a \cdot x < b$; $x \cdot a < b$; $x : a < b$; $a : x < b$.

Скорасць. Простыя задачы на рух.

Прыёмы вуснага пазатаблічнага множання і дзялення. Множанне і дзяленне сумы на лік. Множанне двухзначнага ліку на адназначны. Дзяленне двухзначнага ліку на адназначны. Дзяленне ліку на здабытак. Дзяленне двухзначнага ліку на двухзначны.

Праверка множання і дзялення.

Дзяленне з астачай.

Парадак выканання дзеянняў у выразах без дужак і з дужкамі.

Рашэнне задач у 2—3 дзеянні на складанне, адніманне, множанне і дзяленне.

Прамень. Абазначэнне праменя, адрэзка, трохвугольніка.

Трохвугольнік. Роўнастаронні трохвугольнік. Прамавугольны трохвугольнік. Тупавугольны трохвугольнік. Вастравугольны трохвугольнік.

Плошча. Адзінка вымярэння плошчы: *квадратны сантыметр.* Знаходжанне плошчы фігуры з дапамогай палеткі.

Уласцівасці старон прамавугольніка і квадрата.

Перыметр прамавугольніка і квадрата.

Адзінкі вымярэння часу: *суткі, гадзіна, мінута, секунда;* суадносіны паміж імі.

### **Трохзначныя і чатырохзначныя лікі** (56 гадзін)

Вусная і пісьмовая нумарацыя лікаў у межах 1000. Разрадны састаў трохзначнага ліку. Прадстаўленне ліку ў выглядзе сумы разрадных складаемых. Параўнанне лікаў у межах 1000.

Вуснае складанне і адніманне, множанне і дзяленне ў выпадках, якія зводзяцца да дзеянняў у межах 100.

Пісьмовае складанне і адніманне трохзначных лікаў.

Множанне трохзначнага ліку на адназначны. Дзяленне трохзначнага ліку на адназначны.

Рашэнне састаўных задач у 2—3 дзеянні на складанне, адніманне, множанне і дзяленне.

Чатырохзначныя лікі.

Адзінкі вымярэння даўжыні: *метр, кіламетр*; суадносіны паміж імі.

Адзінкі вымярэння масы: *грам, кілаграм, тона*.

### **Паўтарэнне за III клас** (7 гадзін)

Табліцы множання і дзялення.

Пазатаблічнае множанне і дзяленне.

Дзяленне з астачай.

Знаходжанне значэнняў лікавых выразаў. Парадак дзеянняў. Рашэнне ўраўненняў.

Знаходжанне долі ліку.

Вусная і пісьмовая нумарацыя трохзначных і чатырохзначных лікаў.

Прыёмы вуснага выканання арыфметычных дзеянняў над трохзначнымі лікамі.

Алгарытмы складання і аднімання трохзначных лікаў. Множанне і дзяленне трохзначнага ліку на адназначны.

Рашэнне простых і састаўных задач.

Адзінкі вымярэння даўжыні, масы, часу; суадносіны паміж аднароднымі адзінкамі.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

табліцы множання і дзялення;

прыёмы вуснага множання і дзялення;

нумарацыю і разрадны састаў трохзначных лікаў;

прыёмы вуснага і пісьмовага складання і аднімання лікаў у межах 1000;

парадак выканання арыфметычных дзеянняў;

адзінкі вымярэння даўжыні, масы, часу;

уласцівасці старон прамавугольніка і квадрата.

Вучні павінны ў м е ц ь:

чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 1000;

выконваць вусна дзеянні ў межах 100, пісьмова — у межах 1000;

выконваць праверку вылічэнняў;

множыць і дзяліць трохзначны лік на адназначны;

выконваць дзяленне з астачай;

вылічваць значэнні выразаў у 2—3 дзеянні без дужак і з дужкамі;

рашаць задачы ў 2—3 дзеянні на складанне, адніманне, множанне і дзяленне;

рашаць простыя задачы на знаходжанне долі ліку (велічыні);

вылічваць значэнні выразаў з адной пераменнай пры зададзеным значэнні пераменнай;

рашаць самыя простыя ўраўненні з выкарыстаннем залежнасці паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў;

рашаць падборам найпрацейшыя няроўнасці;

вызначаць перыметр прамавугольніка і квадрата;

распазнаваць вострыя, прамыя, тупыя вуглы;

распазнаваць вастравугольныя, прамавугольныя, тупавугольныя трохвугольнікі.

## IV КЛАС

### (140 гадзін)

### **Паўтарэнне за III клас** (13 гадзін)

Вусная і пісьмовая нумарацыя трохзначных лікаў.

Прыёмы вуснага і пісьмовага выканання арыфметычных дзеянняў над трохзначнымі лікамі. Доля. Знаходжанне долі ад ліку. Уяўленне аб плошчы фігуры і яе вымярэнні. Адзінка вымярэння плошчы: *квадратны сантыметр*.

Лікавыя выразы і выразы з пераменнай.

### **Нумарацыя мнагазначных лікаў** (31 гадзіна)

Лікі ад 0 да 1 000 000. Клас адзінак і клас тысяч. Разрады класа адзінак і класа тысяч. Прадстаўленне ліку ў выглядзе сумы разрадных складаемых. Чытанне і запіс мнагазначных лікаў. Параўнанне мнагазначных лікаў.

Адзінкі вымярэння даўжыні: *міліметр, сантыметр, дэцыметр, метр, кіламетр*; суадносіны паміж імі.

Выкарыстанне дыяграм пры рашэнні задач і параўнанні велічыняў.

Адзінкі вымярэння масы: *тона, цэнтнер, кілаграм, грам*; суадносіны паміж імі.

Адзінкі вымярэння часу: *стагоддзе, год, месяц, тыдзень, суткі, гадзіна, мінута, секунда*; суадносіны паміж імі.

Плошча. Адзінка вымярэння плошчы: *квадратны дэцыметр.* Плошча прамавугольніка і квадрата.

### **Складанне і адніманне** (27 гадзін)

Вуснае складанне і адніманне лікаў у межах 1 000 000 у выпадках, якія зводзяцца да вылічэнняў у межах 100. Пісьмовае складанне і адніманне лікаў у межах 1 000 000.

Рашэнне найпрасцейшых ураўненняў на аснове залежнасці паміж вынікамі і кампанентамі дзеянняў складання і аднімання.

Рашэнне састаўных задач з выкарыстаннем троек велічынь: хуткасць, час руху і пройдзены шлях (адлегласць); цана, колькасць тавару і яго кошт.

Адзінкі вымярэння плошчы: *квадратны метр, гектар*.

### **Множанне і дзяленне** (61 гадзіна)

Вуснае множанне і дзяленне на адназначны лік у выпадках, якія зводзяцца да вылічэнняў у межах 100. Множанне і дзяленне на 10, 100, 1000.

Пісьмовае множанне на адназначны, двухзначны і трохзначны лікі. Пісьмовае дзяленне на адназначны і двухзначны лікі.

Акружнасць і круг. Пабудова з дапамогай цыркуля акружнасці з зададзенымі цэнтрам і радыусам.

Лікавыя выразы ў 2—3 дзеянні (з дужкамі і без дужак).

Рашэнне найпрасцейшых ураўненняў на аснове залежнасці паміж кампанентамі і вынікамі дзеянняў множання і дзялення.

Рашэнне састаўных задач.

Уяўленне пра целы: куб, прызму, піраміду, конус, цыліндр, шар.

### **Паўтарэнне, сістэматызацыя і абагульненне ведаў за I—IV класы** (8 гадзін)

Вусная і пісьмовая нумарацыя мнагазначных лікаў.

Прыёмы вуснага выканання арыфметычных дзеянняў над мнагазначнымі лікамі.

Алгарытмы пісьмовага складання, аднімання, множання і дзялення мнагазначных лікаў.

Адзінкі вымярэння даўжыні, масы, часу; суадносіны паміж імі.

Адзінкі вымярэння плошчы.

Рашэнне простых і састаўных задач.

Знаходжанне плошчы прамавугольніка і квадрата.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

нумарацыю і разрадны састаў лікаў у межах 1 000 000;

прыёмы вуснага складання, аднімання, множання і дзялення мнагазначных лікаў у выпадках, якія зводзяцца да вылічэнняў у межах 100;

алгарытмы пісьмовага складання, аднімання, множання і дзялення мнагазначных лікаў;

адзінкі вымярэння даўжыні: *кіламетр, метр, дэцыметр, сантыметр, міліметр*; суадносіны паміж імі;

адзінкі вымярэння масы: *тона, цэнтнер, кілаграм, грам*; суадносіны паміж імі;

адзінкі вымярэння часу: *стагоддзе, год, месяц, тыдзень, суткі, гадзіна, мінута, секунда;* суадносіны паміж імі.

адзінкі вымярэння плошчы: *квадратны сантыметр, квадратны дэцыметр, квадратны метр.*

Вучні павінны ў м е ц ь:

чытаць, запісваць і параўноўваць мнагазначныя лікі;

выконваць вусна вылічэнні ў межах 100 і ў выпадках, якія зводзяцца да вылічэнняў у межах 100;

выконваць пісьмовае складанне і адніманне лікаў у межах 1 000 000;

выконваць пісьмовае множанне на адназначны, двухзначны і трохзначны лікі ў межах 1 000 000;

выконваць пісьмовае дзяленне на адназначны і двухзначны лікі ў межах 1 000 000;

вылічваць значэнні выразаў у 2 дзеянні з адной пераменнай пры зададзеных значэннях пераменнай;

знаходзіць значэнні лікавых выразаў у 2—3 дзеянні без дужак і з дужкамі;

рашаць найпрасцейшыя ўраўненні на аснове залежнасці паміж вынікамі і кампанентамі дзеянняў;

рашаць задачы ў 2—3 дзеянні;

знаходзіць перыметр і плошчу прамавугольніка і квадрата;

чарціць акружнасць з радыусам, які зададзены.

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

## І—ІV класы

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Чалавек і свет» складаецца з трох змястоўных кампанентаў: «Прырода і чалавек», «Чалавек і яго здароўе», «Чалавек і грамадства». Састаўной часткай змястоўнага кампанента «Чалавек і грамадства» з'яўляецца блок «Мая Радзіма — Беларусь», які вывучаецца ў IV класе.

**Мэта** вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» — фарміраванне першапачатковых ведаў аб прыродзе, грамадстве і чалавеку, асноў экалагічнай культуры і здаровага ладу жыцця, грамадзянскае выхаванне вучняў.

Дасягненне ўказанай мэты прадугледжвае рашэнне наступных **задач:**

- фарміраванне элементарных уяўленняў і паняццяў пра аб'екты і з'явы прыроды і грамадскага жыцця, падвядзенне вучняў да элементарнага разумення сувязей у сістэме «прырода—чалавек—грамадства» і ўсведамлення свайго месца ў навакольным свеце;
- фарміраванне першапачатковых уяўленняў і элементарных паняццяў аб гістарычным шляху беларускага народа на аснове знаёмства вучняў з асобамі і важнейшымі падзеямі айчыннай гісторыі;
- выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, гуманных адносін да ўсяго жывога, развіццё патрэбнасці ў пазнанні прыроды і ашчадных адносін да яе;
- фарміраванне маральных якасцей асобы на аснове засваення ведаў аб нормах і правілах чалавечага суіснавання;
- фарміраванне ўяўленняў аб тым, што чалавек — частка прыроды і яго здароўе і жыццё ў значнай ступені залежаць ад стану навакольнага асяроддзя; стварэнне ўмоў для выпрацоўкі неабходных уменняў і навыкаў здаровага ладу жыцця;

- фарміраванне вопыту інтэлектуальнай і творчай дзейнасці, развіццё пазнавальнага інтарэсу да вучэбнага прадмета і вучэбнай дзейнасці;
- фарміраванне агульнавучэбных і прадметных уменняў, неабходных для далейшага авалодання сістэматычнымі ведамі па біялогіі, геаграфіі, грамадазнаўстве і гісторыі.

У аснову змястоўнага кампанента «Прырода і чалавек» пакладзена канцэпцыя экалагічнай адукацыі асобы. Таму адна з найважнейшых задач — фарміраванне ў вучняў асноў экалагічнай культуры, што прадугледжвае засваенне імі пэўных экалагічных ведаў і ўменняў, правільнае і ўсвядомленае выкарыстанне іх у канкрэтных жыццёвых сітуацыях, адказныя адносіны да прыроды і свайго арганізма. Вядучымі ў сістэме экалагічных ведаў з'яўляюцца веды аб сувязях і ўзаемасувязях у прыродзе, значэнні прыроды ў цэлым і яе кампанентаў і элементаў. Гэтыя веды складаюць аснову экалагічнай свядомасці асобы, здольнай будаваць свае паводзіны ў прыродзе на аснове самастойных разважанняў і вывадаў. Але каб зразумець, што ў прыродзе ўсё ўзаемазвязана, што прырода — найвялікшая каштоўнасць на Зямлі, вучні ўжо ў першыя гады навучання павінны атрымаць навукова дакладныя фактычныя веды аб навакольных аб'ектах і з'явах нежывой і жывой прыроды.

У **I класе** ў працэсе назіранняў за сезоннымі з'явамі вучні атрымліваюць канкрэтныя веды пра расліны і жывёл бліжэйшага асяроддзя. Пасля адказу на пытанні «Чаму птушкі адлятаюць у цёплыя краіны?», «Чаму адны звяры на зіму ўпадаюць у спячку, а другія вядуць актыўны лад жыцця?» вучні ўпэўніваюцца ў тым, што ў прыродзе ўсё ўзаемазвязана і што змены ў жыцці раслін і жывёл з'яўляюцца прыстасаваннем да ўмоў існавання (да змен у нежывой прыродзе). Такім чынам, ужо з I класа ў вучняў фарміруюцца элементы экалагічных ведаў.

На першым годзе навучання вучні замацоўваюць навыкі асабістай і грамадскай гігіены, якія яны набылі ва ўстановах дашкольнай адукацыі. У працэсе атрымання звестак аб тым, чаму і як уплывае прырода на настрой і самаадчуванне чалавека, пашыраюцца і паглыбляюцца веды пра здаровы лад жыцця.

Акцэнтуецца ўвага на развіцці ў вучняў уяўленняў аб тым, што чалавек — неад'емная частка прыроды і грамадства. Ужо з I класа фарміруецца ўяўленне пра краіну, у якой яны жывуць, яе назву, прыгажосць і непаўторнасць прыроды сваёй Радзімы, роднага кутка, які ўвасабляе жывы вобраз Айчыны. Вучні знаёмяцца з асноўнымі правамі дзіцяці.

Улічваючы, што фарміраванне асобы дзіцяці пачынаецца ў сям'і, у працэсе вывучэння тэмы «Я і мая сям'я» вялікая ўвага надаецца выхаванню любові да сваіх блізкіх, якая праяўляецца ў клопаце пра родных, у адказнасці разам з іншымі членамі сям'і за парадак і ўтульнасць ва ўласнай кватэры, у доме.

У **II класе** элементарныя веды пра кампаненты нежывой прыроды — паветра, ваду, глебу, іх значэнне і ўласцівасці служаць асновай для фарміравання такіх паняццяў, як «расліны і жывёлы — жывыя арганізмы», «сувязь жывой і нежывой прыроды», «умовы, неабходныя для жыцця раслін і жывёл» і інш.

Мэта раздзела ***«Расліны і чалавек»*** — паказаць разнастайнасць расліннага свету бліжэйшага асяроддзя, яго ролю ў прыродзе і жыцці чалавека. Пры знаёмстве з разнастайнасцю расліннага свету праводзіцца работа па класіфікацыі раслін на групы па розных істотных адзнаках: знешняй будове, выкарыстанні чалавекам і інш.

Пры вывучэнні раздзела ***«Жывёлы і чалавек»*** у вучняў фарміруюцца элементарныя паняцці: «звяры», «птушкі», «насякомыя» і да т. п. Вучні атрымліваюць веды пра асаблівасці знешняга выгляду і паводзін асобных жывёл як прыстасаванні да ўмоў жыцця.

Веды пра лад жыцця, харчаванне жывёл дапамогуць другакласнікам зразумець, што паміж рознымі жывёламі існуюць цесныя сувязі, што ў прыродзе няма «шкодных» жывёл, што ўсе жывёлы ў прыродзе неабходныя.

Матэрыял аб тым, як жывёлы клапоцяцца пра сваіх дзіцянят, будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў добрых, гуманных адносін да ўсяго жывога, а ў выніку, і станаўленню такіх якасцей асобы, як спагадлівасць, дабрыня, што потым праявіцца і ў адносінах да людзей.

Звесткі пра ваду, паветра, навакольны раслінны свет выкарыстоўваюцца для далейшага развіцця ведаў пра здаровы лад

жыцця (значэнне чыстага паветра, вады, прагулак і адпачынку ў лесе і да т. п. для здароўя чалавека).

**У III класе** веды пра кампаненты нежывой прыроды пашыраюцца ў працэсе знаёмства з формамі паверхні, вадаёмамі, карыснымі выкапнямі. Як і раней, асноўнымі элементамі ведаў тут з'яўляюцца веды пра значэнне тых ці іншых кампанентаў прыроды, меры па яе ахове.

Пры вывучэнні раздзела ***«Мая краіна»*** вялікая ўвага надаецца фарміраванню ў вучняў вядучых экалагічных паняццяў: «сувязь раслін і жывёл з навакольным асяроддзем», «прыроднае згуртаванне» і да т. п.

Фарміраванне вызначаных экалагічных паняццяў дапаможа вучням усвядоміць, што ўсе жыхары лесу, балота, вадаёма звязаны адзін з адным прамымі і ўскоснымі сувязямі, разбурэнне якіх непазбежна прыводзіць да парушэння прыроднай раўнавагі. Вучні пераконваюцца ў тым, як важна ведаць гэтыя ўзаемасувязі, каб не наносіць шкоду прыродзе.

Атрыманне элементарных картаграфічных ведаў і ўменняў падрыхтуе трэцякласнікаў да фарміравання ўяўленняў пра разнастайнасць прыроды Зямлі.

Фарміраванне ўяўленняў пра будову чалавечага арганізма служыць асновай для выпрацоўкі санітарна-гігіенічных навыкаў і іншых кампанентаў здаровага ладу жыцця.

**У IV класе** вучні прыступаюць да вывучэння змястоўнага блока **«Мая Радзіма — Беларусь»**, які мае прапедэўтычны характар і забяспечвае стварэнне ўмоў для пераходу да сістэматычнага вывучэння гісторыі на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Засваенне зместу гэтага блока звязана з развіццём якасцей асобы і здольнасцей вучняў, неабходных для іх паступовай падрыхтоўкі да выканання агульных для ўсіх грамадзян нашай рэспублікі сацыяльных функцый, якія абумоўлены сістэмай каштоўнасцей, што прыняты ў нашым грамадстве. Вывучэнне блока «Мая Радзіма — Беларусь» сарыентавана на ўсведамленне вучнямі сваёй прыналежнасці да беларускага народа праз азнаямленне з самымі важнымі культурна-гістарычнымі каштоўнасцямі Беларусі і прыкладамі духоўна-маральнай дзейнасці гістарычных асоб.

Вывучэнне азначанага блока будзе садзейнічаць развіццю пазнавальнага інтарэсу вучняў да айчыннай гісторыі праз уз-

дзеянне на іх эмацыянальную сферу, развіццё ўнутранага свету асобы, якая адчувае прыгажосць роднага краю, з павагай адносіцца да гістарычнага мінулага і сучаснасці сваёй краіны.

Падчас авалодання змястоўным блокам «Мая Радзіма — Беларусь» прадугледжваецца інтэграванне прыродазнаўчых, геаграфічных ведаў з літаратуразнаўчымі, грамадазнаўчымі, гістарычнымі.

Вучэбны матэрыял спрыяе асэнсаванню дзецьмі сябе як членаў грамадства, грамадзян Рэспублікі Беларусь і як часткі прыроды. Адабраны матэрыял дапаможа вучням на аснове атрыманых ведаў зрабіць вывады аб тым, што прырода і людзі — адно цэлае, прырода — наш дом, яна чакае дапамогі чалавека, клопат аб навакольным асяроддзі — абавязак кожнага грамадзяніна сваёй краіны.

Пры вывучэнні прадмета «Чалавек і свет» рэкамендуецца выкарыстоўваць разнастайныя формы арганізацыі навучання: экскурсіі ў прыроду, па сваім населеным пункце, у краязнаўчы музей, мэтавыя прагулкі, урокі-гульні, урокі-падарожжы, урокі — вусныя часопісы, урокі-мікрадаследаванні, урокі-святы і да т. п. Разам з франтальнымі і індывідуальнымі формамі работы неабходна ўключаць вучняў у калектыўную дзейнасць (парная, групавая работа з выкарыстаннем самых новых методык: «Навучанне равеснікаў», «Мазаіка» і інш.).

Разнастайнасцю павінны адрозніваецца метады, прыёмы і сродкі навучання. Першараднае значэнне надаецца назіранням у прыродзе, практычным работам, дэманстрацыйным і лабараторным вопытам, экалагічнаму мадэліраванню і прагназаванню, рашэнню сітуатыўных задач, а таксама практычнай дзейнасці па ахове прыроды.

Важнае месца ў вучэбным працэсе адводзіцца гульнёвай дзейнасці, накіраванай не толькі на засваенне прадметных ведаў і ўменняў, але і на развіццё пазнавальных працэсаў (спосабаў лагічнага мыслення, успрымання, памяці, уяўлення), ахову і падтрыманне працаздольнасці вучняў, забеспячэння іх патрэбнасці ў зносінах і фізічнай актыўнасці, зняцця фізічнага і псіхічнага напружання.

Для паспяховага засваення праграмы павінны выкарыстоўвацца таксама метады і прыёмы, якія садзейнічаюць узмацнен-

ню эмацыянальнага ўспрыняцця вучнямі вучэбнага матэрыялу, інтэграцыі інтэлектуальнага і эмацыянальнага кампанентаў у навучанні. Выкананню гэтых задач дапамогуць назіранні за непаўторнай прыгажосцю прыроды, аналіз паўсядзённага жыцця, выкарыстанне яркага і вобразнага слова літаратурнага твора, фонахрэстаматый, сродкаў музычнага і выяўленчага мастацтва.

Вучэбны прадмет «Чалавек і свет» узаемадзейнічае з такімі адукацыйнымі прадметамі I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, як «Литературное чтение», «Выяўленчае мастацтва», «Працоўнае навучанне». Прыродазнаўчы і грамадазнаўчы матэрыял раскрываецца ў адпаведнасці са спецыфікай названых прадметаў з новага боку. Так, веды, якія вучні атрымалі на ўроках літаратурнага чытання пра такія якасці асобы, як дружба, добразычлівасць, узаемадапамога, выкарыстоўваюцца пры вывучэнні змястоўнага кампанента «Чалавек і грамадства». Веды аб правілах догляду хатніх раслін, атрыманыя на ўроках працоўнага навучання, актуалізуюцца пры вывучэнні тэмы «Умовы, неабходныя для жыцця раслін» і г. д.

# I КЛАС

## (30 гадзін)

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

Наша Радзіма — Беларусь. Мы жывём у Рэспубліцы Беларусь. Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Мінск — сталіца нашай Радзімы. Наша Радзіма — краіна блакітных рэк, азёр і лясоў. Дзе знаходзіцца наша школа (горад, вёска).

### **ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК** (25 гадзін)

### **Асеннія змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека** (10 гадзін)

Што такое прырода. Навакольны свет раслін і жывёл. Агульнае ўяўленне пра жывую і нежывую прыроду. Сонца —

крыніца святла і цяпла, якія неабходны для жыцця жывой прыроды.

Летнія і асеннія месяцы. Змены ў нежывой прыродзе восенню ў параўнанні з летам: зніжэнне вышыні Сонца, паніжэнне тэмпературы паветра і вады; змены відаў ападкаў, першыя замаразкі[1].

Расліны — частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць раслін: дрэвы, кусты і травы. Расліны на двары навучальнай установы. Маё любімае дрэва, куст. Расліны летам і восенню. Выспяванне пладоў і насення.

Залатая восень. Разнастайнасць асенняй афарбоўкі лістоў дрэў і кустоў. Позняя восень. Лістапад. Завяданне травяністых раслін. Прычыны асенніх змен у жыцці раслін.

Дзікія і свойскія жывёлы Беларусі. Змены ў іх жыцці восенню: змены ў жыцці птушак, насякомых, звяроў і іншых жывёл.

Уплыў змен у нежывой прыродзе, у жыцці раслін на жыццё і працу чалавека восенню. Як правільна апранацца восенню, загартоўваць арганізм. Чым карысныя асеннія прагулкі ў лесе, парку, іх уплыў на здароўе і настрой чалавека.

Асеннія плады і насенне — крыніца здароўя. Шыпшына — скарбонка вітамінаў.

Садавіна і агародніна — крыніца вітамінаў. Правілы ўжывання садавіны і агародніны.

Правілы асабістай гігіены. Догляд зубоў, пазногцяў і валасоў. Як даглядаць адзенне і абутак.

Рэжым дня. Чаму трэба прытрымлівацца рэжыму дня.

**Абагульняючы ўрок** «Асеннія з'явы ў прыродзе».

***Экскурсіі ці мэтавыя прагулкі*** (2—3) у лес, парк на тэмы: «Залатая восень у прыродзе», «Позняя восень» і інш.

### **Зімовыя змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека** (5 гадзін)

Першы снег — прымета набліжэння зімы. Змены ў нежывой прыродзе зімой: нізкае месцазнаходжанне Сонца, паніжэн-

---

[1] Пералічаныя з'явы вывучаюцца па меры іх надыходу ў прыродзе.

не тэмпературы паветра ў параўнанні з восенню, замярзанне вадаёмаў і глебы. Снег і лёд, снегапады, завеі і да т. п. Правілы паводзін на вуліцы ў час снегападу, галалёду.

Як зімуюць расліны. Хвойныя і ліставыя дрэвы і кусты зімой. Каго корміць дрэва ў зімовы час. Хто зімуе на дрэве і пад ім. Клопат чалавека пра захаванне дрэў.

Змены ў жыцці дзікіх жывёл зімой. Іх прычыны: чаму зімой нельга пабачыць жаб, рапух (палявых жаб), насякомых. Жыццё птушак зімой. Чаму адны жывёлы (напрыклад, мядзведзь) на зіму засынаюць, а другія (вавёрка, ліса) і зімой вядуць актыўны лад жыцця.

Дапамога чалавека дзікім жывёлам. Удзел вучняў у падкормцы жывёл зімой. Змены ў працы людзей зімой: праца на палях, жывёлагадоўчых фермах, у рамонтных майстэрнях і г. д.

Клопат чалавека пра сваё здароўе зімой. Папярэджанне пераахаладжэння арганізма. Як правільна апранацца, загартоўваць арганізм зімой. Правілы паводзін на лёдзе пры катанні на каньках, санках. Значэнне для здароўя зімовых прагулак у парку, лесе. Папярэджанне прастудных захворванняў.

**Абагульняючы ўрок** «Зімовыя змены ў прыродзе».

***Экскурсіі ці мэтавыя прагулкі*** (2—3) у прыроду і па населеным пункце на тэмы: «Прыгажосць зімовага лесу (парку, сквера)», «Мой родны горад (вёска)» і інш.

### Вясеннія змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека (6 гадзін)

Ранняя вясна. Сакавік — першы месяц вясны. Змяненне месцазнаходжання Сонца на небе. Павышэнне тэмпературы паветра. Раставанне снегу. Асцярожна — крыгаход! Вясенні разліў рэк (паводка). Правілы паводзін каля вадаёмаў вясной.

Вясна — час абуджэння раслін. Набуханне пупышак на дрэвах і кустах. Раннеквітнеючыя расліны — корм для насякомых, якія абудзіліся пасля зімовай спячкі. Неабходнасць беражлівых адносін да вясенніх першацветаў.

Выкарыстанне жыватворнай сілы прыроды вясной. Прагулкі і гульні ў парку, скверы; бяспечныя месцы для гульняў. Як апранацца вясной.

Змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной (насякомых, птушак, звяроў). Залежнасць паміж тэрмінам прылёту птушак і наяўнасцю корму. Гнездаванне птушак. Адносіны да птушак у гэты адказны ў іх жыцці час.

Вясенняя праца на палях, у садах, парках, скверах і на вуліцах гарадоў і вёсак.

Уплыў людзей на жыццё раслін і жывёл (вырубка лясоў, збіранне букетаў з прыгожа квітнеючых раслін, лоўля матылёў, разбурэнне гнёздаў мурашнікаў, рыбная лоўля і да т. п.). Неабходнасць аховы раслін (у тым ліку раннеквітнеючых), жывёл роднага краю. Удзел дзяцей у гэтым.

**Абагульняючы ўрок** «Вясеннія з'явы ў прыродзе».

***Экскурсіі ці мэтавыя прагулкі*** (3—4) у прыроду на тэмы: «Ранняя вясна ў лесе», «Гукі і пахі вясенняга лесу», «Раннеквітнеючыя расліны — краса прыроды».

### Змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека летам (4 гадзіны)

Змены ў нежывой прыродзе летам. Летнія навальніцы. Правілы паводзін падчас навальніцы. Расліны летам: цвіценне траў, паспяванне ягад. Ядавітыя расліны (воўчае лыка, мудранка). Жыццё жывёл летам, іх клопат аб патомстве.

Ахова прыроды і здароўя чалавека: правілы паводзін на лузе, каля вадаёмаў і ў вадзе. Небяспечныя сітуацыі пры сустрэчы са змеямі, ядавітымі раслінамі і да т. п.

Летняе загартоўванне арганізма. Загар.

**Абагульняючы ўрок** «Змены ў прыродзе і працы людзей у розныя поры года».

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА (4 гадзіны)

Мой горад (вёска). Галоўная вуліца (плошча) нашага горада (вёскі). Правілы дарожнага руху. Культурна-асветніцкія ўстановы горада (вёскі): бібліятэка, клуб, кінатэатр, спартыўныя збудаванні.

Я і мая сям'я. Значэнне сям'і ў жыцці чалавека. Добразычлівыя адносіны ў сям'і. Правы і абавязкі дзіцяці і бацькоў. Адказнасць дзяцей за свае ўчынкі.

Небяспечныя сітуацыі ў доме. Нумары тэлефонаў, па якіх можна выклікаць пажарных, міліцыю, хуткую дапамогу, службу газу.

***Экскурсіі*** (1—2) па населеным пункце на тэму «Мой родны горад (вёска)» і інш.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ І КЛАСА

Вучні павінны мець першапачатковыя ў я ў л е н н і аб:

тым, што такое прырода;

прадметах жывой і нежывой прыроды;

ролі Сонца як крыніцы святла і цяпла, неабходных для жыцця жывой прыроды;

жывёлах свойскіх і дзікіх;

неабходнасці беражлівых адносін да ўсяго жывога;

сезонных зменах у нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл і чалавека;

неабходнасці падкормкі птушак і звяроў зімой і ранняй вясной;

значэнні для здароўя знаходжання на свежым паветры ў розныя поры года;

рэжыме дня, яго складальніках;

асноўных правілах асабістай і грамадскай гігіены;

карысці садавіны і гародніны;

месцы, дзе можна і дзе нельга гуляць;

правілах паводзін на вадзе.

Вучні павінны в е д а ц ь:

назву краіны, у якой яны жывуць, яе сталіцу;

сваё прозвішча, імя і імя па бацьку;

імёны і імёны па бацьку бацькоў;

свой дамашні адрас;

нумары тэлефонаў вызаву экстранных служб (хуткая дапамога, міліцыя і да т. п.).

Вучні павінны ў м е ц ь :

адрозніваць некалькі відаў дрэў (3—4), кустоў (1—2) бліжэйшага наваколля;

адрозніваць асноўныя віды садавіны і агародніны, выконваць правілы гігіены пры іх ужыванні;

адрозніваць некалькі відаў насякомых (1—2), птушак (2—3), звяроў (3—4);

пералічваць асноўныя змены, якія адбываюцца ў жыцці раслін і жывёл, у працы людзей у розныя поры года;

*тлумачыць:*

а) даступныя разуменню дзяцей прычыны сезонных змен у прыродзе;

б) неабходнасць выканання правілаў прыродаахоўных паводзін;

в) неабходнасць прытрымлівацца правілаў асабістай гігіены.

## II КЛАС

### (34 гадзін)

### **ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК** (28 гадзін)

#### **Уводзіны** (1 гадзіна)

Прырода вакол цябе. Прадметы прыроды і працы чалавека. Прырода жывая і нежывая. Сувязь жывой і нежывой прыроды, узаемасувязі раслін і жывёл.

#### **Нежывая прырода і чалавек** (7 гадзін)

**Паветра і жыццё** (4 гадзіны). Значэнне і ўласцівасці паветра. Крыніцы забруджвання паветра і меры па яго ахове.

Чыстае паветра — залог здароўя чалавека. Прагулкі на чыстым паветры, іх значэнне для ўмацавання арганізма дзіцяці. Азбука харчавання.

Аказанне першай дапамогі пры няшчасных выпадках, траўмах (ударах, вывіхах, пераломах, парэзах).

**Вада і жыццё** (2 гадзіны). Вада ў прыродзе, яе ўласцівасці і значэнне. Крыніцы забруджвання вады і меры па яе ахове. Вада і здароўе. Значэнне чыстай вады для арганізма чалавека. Якую ваду можна піць.

**Глеба, яе значэнне** (1 гадзіна). Значэнне глебы ў жыцці раслін, жывёл і чалавека. Ахова глебы. Прычыны пажараў, іх згубнае ўздзеянне на глебу. Чаму нельга спальваць сухую траву.

## Жывая прырода і чалавек
(20 гадзін)

**Расліны і чалавек** (9 гадзін). Расліны як частка жывой прыроды. Будова раслін. Умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін. Разнастайнасць раслін. Расліны дзікарослыя і культурныя. Найбольш распаўсюджаныя культурныя расліны агарода і саду. Праца людзей па вырошчванні культурных раслін (садавіны, агародніны).

Найбольш распаўсюджаныя дзікарослыя расліны роднага краю (дрэвы, кусты, травы). Лекавыя і ядавітыя расліны. Значэнне раслін у прыродзе і жыцці людзей. Дзікарослыя прыгожа квітнеючыя расліны ў небяспецы. Ахова раслін чалавекам. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Удзел вучняў у ахове раслін. Правілы прыродаахоўных паводзін (беражлівыя адносіны да раслін, насякомых, птушак і г. д.).

**Грыбы** (1 гадзіна). Грыбы — асобная група жывых арганізмаў. Ядомыя і ядавітыя грыбы. Правілы збірання грыбоў.

**Жывёлы і чалавек** (10 гадзін). Разнастайнасць жывёл: насякомыя, рыбы, земнаводныя, паўзуны, птушкі, звяры. Хто чым харчуецца. Сувязі, якія існуюць паміж раслінамі і жывёламі, паміж жывой і нежывой прыродай. Якіх правілаў трэба прытрымлівацца чалавеку, каб садзейнічаць захаванню прыродных сувязей.

Клопат жывёл (звяроў, птушак) пра сваіх дзіцянят. Меры, накіраваныя на ахову жывёл у адказны перыяд іх жыцця (гадаванне патомства).

***Практычныя работы.*** Часткі раслін (знаходжанне частак раслін на пакаёвых раслінах, гербарных узорах). Умовы, неабходныя для росту раслін (вопыты). Разглядванне і апісанне (вуснае) культурных і дзікарослых раслін.

***Экскурсіі*** (2—3) на агарод, у сад, лес або бліжэйшы парк, сквер, двор навучальнай установы.

## **ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА** (6 гадзін)

**Я і мая сям'я** (1 гадзіна). Сямейныя традыцыі і звычаі. Будні і святы. Сумесны адпачынак.

**Правы дзіцяці** (1 гадзіна). Што такое права. Усе людзі розныя, але правы ва ўсіх аднолькавыя. Права дзіцяці на абарону ад бязлітаснасці і насілля.

**Школьны калектыў** (1 гадзіна). Этыка адносін у калектыве. Наш клас у школьным калектыве. Правы і абавязкі вучня. Знешні выгляд вучня. Правілы паводзін ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

**Правілы паводзін у грамадскіх месцах (у музеі, бібліятэцы, маршрутных транспартных сродках, на вуліцы і да т. п.)** (2 гадзіны). Як правільна выбраць месца для гульняў і прагулак (чаму нельга гуляць уздоўж вуліцы, дзе рухаецца вялікая колькасць транспартных сродкаў).

**Правілы пажарнай бяспекі** (1 гадзіна).

***Экскурсія*** ў бібліятэку ці музей, на пошту ці ў магазін і да т. п.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

што такое прырода;

прыметы жывой прыроды;

уласцівасці паветра, вады, глебы ў прыродзе і іх значэнне для чалавека;

некалькі відаў найбольш распаўсюджаных дзікарослых і культурных дрэў, кустоў і траў;

некалькі відаў найбольш распаўсюджаных насякомых (2—3), птушак (3—4) і звяроў (4—5) роднага краю;

некалькі відаў раслін і жывёл (2—3), занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь;

правілы паводзін у прыродзе (чаму нельга збіраць букеты з прыгожа квітнеючых раслін на лузе, у лесе, лавіць матылёў, жаб і інш.) і ў грамадскіх месцах (у бібліятэцы, маршрутных транспартных сродках, на вуліцы і да т. п.);

правілы зносін з равеснікамі і дарослымі;

якое значэнне для здароўя мае знаходжанне на свежым паветры;

чаму неабходна праветрываць кватэру і класныя памяшканні;

якія прадукты найбольш карысныя для здароўя;

значэнне чыстай вады для здароўя чалавека;

прыёмы аказання першай дапамогі пры апёках, ударах, драпінах, парэзах.

Вучні павінны у м е ц ь:

раскрываць элементарныя ўзаемасувязі, існуючыя паміж нежывой і жывой прыродай, раслінамі і жывёламі, а таксама паміж прыродай і чалавекам;

выкарыстоўваць словы прывітання, звароту, падзякі;

*тлумачыць неабходнасць:*

а) выканання нормаў і правілаў прыродаахоўных паводзін;

б) выканання правілаў этыкету ў сумеснай калектыўнай працы і ў гульнях з аднагодкамі;

в) выканання правілаў паводзін на вуліцы, у маршрутных транспартных сродках, у грамадскіх месцах;

г) сачыць за сваім знешнім выглядам;

д) падтрымліваць чысціню і ўтульнасць у сваім доме, класным памяшканні;

*адрозніваць (па істотных і адметных прыметах):*

а) жывыя і нежывыя прадметы прыроды;

б) некалькі відаў найбольш распаўсюджаных дзікарослых і культурных дрэў (3—4), кустоў (2—3), травяністых раслін роднага краю (3—4 віды);

в) лекавыя і ядавітыя расліны (2—3);

г) некалькі відаў найбольш распаўсюджаных насякомых (2—3), птушак (3—4) і звяроў (4—5) роднага краю;

д) некалькі відаў раслін і жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь (2—3);

праводзіць назіранні за раслінамі, жывёламі (пад кіраўніцтвам настаўніка, выхавацеля);

удзельнічаць у даступнай прыродаахоўнай дзейнасці ў час правядзення экскурсій у прыроду.

# III КЛАС
## (35 гадзін)

### **ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК** (26 гадзін)[1]

### **Арыентаванне на мясцовасці** (3 гадзіны)

Гарызонт, бакі гарызонту. Арыентаванне па Сонцы, компасе і мясцовых прыродных прыметах.

***Практычныя работы.*** Засваенне спосабаў арыентавання на мясцовасці па Сонцы, компасе і мясцовых прыметах.

### **Зямля на глобусе і карце** (2 гадзіны)

Глобус — мадэль Зямлі. Фізічная карта паўшар'яў. Мацерыкі і акіяны.

***Практычныя работы.*** Чытанне карты: знаходжанне мацерыкоў, акіянаў на глобусе і карце паўшар'яў.

### **Прыродныя багацці роднага краю** (15 гадзін)

**Формы зямной паверхні** (3 гадзіны). Раўніны і горы як асноўныя формы паверхні Зямлі. Узгорак. Гара. Раўнінны характар паверхні Рэспублікі Беларусь, яго значэнне. Раўніны, нізіны, узвышшы на фізічнай карце Беларусі.

**Разнастайнасць вадаёмаў** (2 гадзіны). Рэкі і азёры. Водныя багацці Рэспублікі Беларусь. Іх выкарыстанне чалавекам і ахова. Найбуйнейшыя рэкі і азёры на фізічнай карце Беларусі.

**Найбольш распаўсюджаныя карысныя выкапні** (2 гадзіны). Пясок, гліна, нафта, калійная соль, торф, іх выкарыстанне. Багацці недраў роднай зямлі. Выкарыстанне карысных выкапняў чалавекам і іх ахова.

**Раслінны і жывёльны свет Беларусі** (7 гадзін). Што такое прыроднае згуртаванне. Асноўныя прыродныя згуртаванні роднага краю: лес, балота. Узаемасувязі паміж раслінамі і жывёламі леса. Значэнне лясоў і балот у прыродзе. Уплыў дзейнасці чалавека на прыродныя згуртаванні.

---

[1] У гэту колькасць уваходзяць гадзіны на правядзенне экскурсій.

Поле — згуртаванне, створанае чалавекам. Жывёлы, якія жывуць у полі. Узаемасувязі паміж раслінамі і жывёламі поля.

Ахоўныя тэрыторыі: Нацыянальны парк «Белавежская пушча».

**Абагульняючы ўрок «Прыродныя багацці роднага краю».**

***Практычныя работы.*** Знаходжанне асноўных формаў зямной паверхні, найбуйнейшых рэк і азёр на фізічнай карце Беларусі. Знаёмства з узорамі карысных выкапняў (з калекцый), вывучэнне іх асноўных уласцівасцей.

***Экскурсіі* ў прыроду** (2—3). Прыкладныя тэмы: «Формы зямной паверхні, вадаёмы, карысныя выкапні роднага краю» (комплексная); «Асноўныя прыродныя згуртаванні роднага краю» (лес, балота, з улікам магчымасцей рэгіёна); «Расліны і жывёлы поля». Экскурсіі праводзяцца ў пачатку навучальнага года.

### **Разнастайнасць прыроды на Зямлі** (4 гадзіны)

Расліны і жывёлы розных куткоў Зямлі. Залежнасць разнастайнасці расліннага і жывёльнага свету Зямлі ад наяўнасці цяпла і вільгаці.

## **ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ** (9 гадзін)

**Чалавек — частка прыроды** (1 гадзіна). Арганізм чалавека. Права дзіцяці на ахову ад прымусовага перамяшчэння і выкрадання. Правілы паводзін у надзвычайных сітуацыях.

**Як чалавек успрымае навакольны свет** (1 гадзіна). Вочы — орган зроку, вушы — орган слыху. Гігіена органаў пачуццяў.

Права на асабістую абарону дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Неабходнасць спагадлівых, добразычлівых адносін да дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

**Галаўны мозг** (1 гадзіна). Галаўны мозг — галоўны орган, які кіруе работай усіх іншых органаў.

**Скура** (1 гадзіна). Яе значэнне для арганізма чалавека. Гігіена скуры.

**Апора цела і рух** (1 гадзіна). Правілы выпрацоўкі і захавання правільнай паставы.

**Дыханне** (1 гадзіна). Органы дыхання. Гігіена дыхання. Значэнне чыстага паветра для здароўя чалавека. Аб шкодзе курэння.

**Сэрца** (1 гадзіна). Роля здаровага ладу жыцця ва ўмацаванні сэрца.

**Значэнне правільнага харчавання для арганізма, які сталее** (1 гадзіна). Догляд зубоў. Аб шкодзе алкаголю.

**Абагульняючы урок.**

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

што такое гарызонт;

асноўныя і прамежкавыя бакі гарызонту, розныя спосабы арыентавання на мясцовасці;

асноўныя формы паверхні Беларусі;

асноўныя прыродныя згуртаванні роднага краю (лес, балота);

4—5 віды найбольш распаўсюджаных раслін і жывёл лесу, балота, поля;

значэнне прыроды для чалавека, уплыў дзейнасці людзей на прыроду;

што сабой уяўляе здаровы лад жыцця;

што патрэбна рабіць, каб захаваць добрую паставу;

значэнне скуры для арганізма;

правілы догляду скуры;

правілы догляду зубоў;

асноўныя правілы аховы зроку і слыху;

пра шкодны ўплыў курэння і алкаголю на арганізм чалавека;

значэнне здаровага харчавання для арганізма вучня.

Вучні павінны ў м е ц ь:

арыентавацца па компасе і некаторых мясцовых прыметах;

паказваць на глобусе, фізічнай карце паўшар'яў мацерыкі і акіяны;

адрозніваць некалькі відаў найбольш распаўсюджаных раслін і жывёл лесу, балота, поля;

*тлумачыць:*

а) неабходнасць прытрымлівацца правілаў прыродаахоўных паводзін у лесе;

б) неабходнасць прытрымлівацца правілаў і нормаў здаровага ладу жыцця (выкананне правілаў гігіены, захаванне правільнай паставы, заняткі фізічнай культурай і спортам і да т. п.);

в) удзел у ажыццяўленні пасільнай прыродаахоўнай дзейнасці;

ацэньваць свае паводзіны і ўчынкі іншых людзей у адносінах да прыроды;

ажыццяўляць выбар варыянта паводзін у адпаведнасці з экалагічнымі і эстэтычнымі нормамі.

## IV КЛАС

### МАЯ РАДЗІМА — БЕЛАРУСЬ (35 гадзін)

### Уводзіны (1 гадзіна)

Як працаваць з вучэбным дапаможнікам. Паняцці «Радзіма» і «Бацькаўшчына».

### Геаграфічныя і гістарычныя звесткі аб нашай Радзіме (8 гадзін)

**Нашы продкі** (1 гадзіна). Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі. Легендарныя продкі беларусаў.

**Мы і нашы суседзі** (1 гадзіна). Размяшчэнне Беларусі на карце Еўропы. Краіны-суседкі Беларусі. Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Рэспублікі Беларусь. Насельніцтва Беларусі. Вызначэнне месцараспалажэння сталіцы і абласных цэнтраў на тэрытарыяльна-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь.

**Зямля блакітных рэк і азёр** (1 гадзіна). Рэкі і азёры як сведкі гістарычнага мінулага нашай краіны. Беларускія рэкі — шляхі зносін і абмену. Легенда пра возера Свіцязь. Матывы роднага краю ў творчасці польскага паэта, ураджэнца Беларусі Адама Міцкевіча.

**Наша Радзіма на гістарычнай карце** (1 гадзіна). Асаблівасці гістарычнай карты. Азнаямленне з умоўнымі абазначэннямі на гістарычнай карце.

**«Стужка часу»** (1 гадзіна). Гістарычныя падзеі і іх даты. Працягласць і паслядоўнасць гістарычных падзей. Вызначэнне перыядаў «да нашай эры» і «наша эра» на «стужцы часу».

**Маўклівыя сведкі мінуўшчыны** (1 гадзіна). Адкуль узяліся камяні на беларускай зямлі. Роля камянёў у жыцці і вераваннях старажытных жыхароў Беларусі. Курганы як помнікі гісторыі.

**Як да нас прыйшла кніга** (1 гадзіна). Пісьмовыя гістарычныя крыніцы пра нашу Бацькаўшчыну. Берасцяныя граматы. Летапісы. Рукапісныя кнігі. Запавет Кірылы Тураўскага.

**Першыя друкаваныя кнігі** (1 гадзіна). Кнігавыдавецкая дзейнасць усходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыны. Францыск Скарына як патрыёт Бацькаўшчыны. Выдавец першай друкаванай на тэрыторыі Беларусі кнігі Сымон Будны — прадаўжальнік справы Францыска Скарыны.

## Гісторыя Беларусі ў паданнях, падзеях і імёнах (18 гадзін)

**Князёўна з трыма імёнамі** (1 гадзіна). Легендарныя і летапісныя звесткі пра полацкую князёўну Рагнеду. Полацкі князь Ізяслаў — сын Рагнеды.

**Яраслаў Мудры — сын Рагнеды** (1 гадзіна). Старажытнаруская дзяржава ўсходніх славян — Кіеўская Русь. Асветніцкая дзейнасць Яраслава Мудрага і яго запавет сынам.

**Усяслаў Чарадзей** (1 гадзіна). Легенды і гістарычныя звесткі аб Полацкай зямлі. Полацкі князь Усяслаў Чарадзей. Полацкі Сафійскі сабор як сімвал магутнасці княства і гістарычны помнік.

**Ефрасіння Полацкая** (1 гадзіна). Жыццёвы шлях і асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай. Крыж Ефрасінні Полацкай як культурна-хрысціянская каштоўнасць беларускага народа. Спаса-Ефрасіннеўская царква.

**У абарону сваёй зямлі** (1 гадзіна). Аб'яднанне беларускіх і літоўскіх земель супраць крыжацкай пагрозы ў адну дзяржа-

ву — Вялікае Княства Літоўскае. Вялікі князь Вітаўт. Грунвальдская бітва.

**Па якіх законах жылі нашы продкі** (1 гадзіна). Законы штодзённага жыцця людзей. Агульнанародны збор у Полацкім княстве — веча. Статут Вялікага Княства Літоўскага. Леў Сапега.

**Адкуль пайшлі назвы нашых гарадоў** (3 гадзіны). Беларускія гарады ў гістарычным мінулым. Полацк і Тураў. Наша сталіца і абласныя гарады ў старажытнасці: гады ўзнікнення, паходжанне назваў, гербы. Развіццё гарадскіх рамёстваў. Азнаямленне з гісторыяй паходжання назвы свайго населенага пункта.

**Пад сценамі старажытных замкаў** (1 гадзіна). Замкі на карце Беларусі. Крэўскі, Гродзенскі, Нясвіжскі, Мірскі замкі як помнікі гісторыі і культуры. Сынковіцкая царква-крэпасць.

**У краіне майстроў** (1 гадзіна). Рамесныя вырабы беларускіх майстроў. Слуцкія паясы і іх выраб. Каляровая кафля.

**Ад батлейкі да тэатра** (1 гадзіна). Народны лялечны тэатр — батлейка. Асветніцкая дзейнасць Сімяона Полацкага. Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага. Паланез «Развітанне з Радзімай» Міхала Клеафаса Агінскага.

**У што верылі нашы продкі** (1 гадзіна). Вера ў існаванне духаў. Прыняцце хрысціянства, будаўніцтва цэркваў і манастыроў, заснаванне школ. Веравызнанні ў Беларусі. Верацярпімасць.

**Пясняр сялянскай долі** (1 гадзіна). Прыгонны стан сялян і яго адмена. Францішак Багушэвіч — абаронца працоўнага люду. Запавет Францішка Багушэвіча берагчы і шанаваць родную мову.

**Славутыя дзеячы навукі і культуры** (1 гадзіна). Даследаванні Яўхіма Карскага. Дзейнасць братоў Тышкевічаў. Адлюстраванне ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа тэмы роднага краю. Першы прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук гісторык Усевалад Ігнатоўскі.

**Будаўніцтва новага жыцця** (1 гадзіна). Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Беларусі. Утварэнне БССР і СССР. Развіццё народнай гаспадаркі: будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і стварэнне калгасаў у 1920—1930 гады. Развіццё культуры і адукацыі, вырашэнне моўнага пы-

тання ў 1920—1930 гады. Жыццё насельніцтва Заходняй Беларусі і ўз'яднанне яе з БССР.

**Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны** (2 гадзіны). Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Мужныя абаронцы Брэсцкай крэпасці. Патрыятызм беларускага народа. Славуты партызан дзед Талаш і юны партызан Марат Казей. Дзейнасць падпольшчыкаў на чале з Канстанцінам Заслонавым. Трагедыя вёскі Хатынь. Лагер Трасцянец. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Легендарны подзвіг Трыфана Лук'яновіча.

### **Мая рэспубліка** (7 гадзін)

**Багацце нашай краіны** (1 гадзіна). Пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі. Вырабы беларускай прамысловасці. Зямля — карміцелька жыхароў нашай краіны. Прадукцыя сельскай гаспадаркі. Транспарт і шляхі зносін.

**Тут мінуўшчына з сучаснасцю сышліся** (2 гадзіны). Новыя гарады на карце Беларусі. Салігорск: паданні і рэчаіснасць. Наваполацк: сучаснае нафтаперапрацоўчае прадпрыемства побач са старажытным Полацкам. Светлагорск — горад энергетыкаў і хімікаў. Жодзіна: подзвіг сыноў маці-патрыёткі А. Ф. Купрыянавай, сучасны прамысловы воблік горада. Новыя прафесіі жыхароў Беларусі.

**Мінск — сталіца нашай дзяржавы** (1 гадзіна). Мінск: старажытны і сучасны цэнтр нашай рэспублікі. Мінск — горад-герой. Адлюстраванне гістарычных падзей, імён дзеячаў гісторыі і культуры ў назвах гарадскіх праспектаў, вуліц і плошчаў.

**Мая рэспубліка** (1 гадзіна). Утварэнне Рэспублікі Беларусь. Органы дзяржаўнай улады ў нашай рэспубліцы. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь — кіраўнік нашай дзяржавы. Садружнасць Незалежных Дзяржаў. Саюз Беларусі і Расіі.

**Дзяржаўны герб нашай краіны** (1 гадзіна). Адлюстраванне ў Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь геаграфічнага становішча Беларусі, традыцый нашых продкаў, якасцей характару беларусаў. Адлюстраванне ў арнаменце Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь працалюбства беларускага народа.

**Сцяг беларускай дзяржавы** (1 гадзіна). Гісторыя сцяга БССР. Сімвалы колераў Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Чырвоны сцяг — сімвал мужнасці нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Абагульненне** (1 гадзіна)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:

назву дзяржавы, яе сталіцу і абласныя цэнтры;

дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь;

імёны 2—3 гістарычных асоб і дзеячаў культуры Беларусі;

1—2 памятныя мясціны свайго роднага краю.

Вучні павінны ў м е ц ь:

складаць невялікае паведамленне пра знакамітых гістарычных асоб і дзеячаў культуры з апорай на змест вучэбнага тэксту;

складаць вуснае апісанне па гістарычнай ілюстрацыі;

паказваць на карце і абазначаць на контурнай карце тэрыторыю і межы Рэспублікі Беларусь, сталіцу і абласныя цэнтры, месца свайго пражывання;

вызначаць паслядоўнасць гістарычных падзей на «стужцы часу».

# ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

## I—IV класы

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Працоўнае навучанне на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі — арганічная састаўная частка адзінай сістэмы навучання, выхавання і развіцця вучняў. **Мэтай** вывучэння прадмета «Працоўнае навучанне» з'яўляецца фарміраванне тэхналагічнай граматнасці вучняў як асновы тэхналагічнай культуры.

Асноўнымі **задачамі** з'яўляюцца:

- задавальненне патрэбнасцей вучняў у працоўнай дзейнасці, у рэалізацыі творчых задум падчас вучэбна-працоўнай, пераўтваральнай і стваральнай дзейнасці;
- фарміраванне элементарных тэхніка-тэхналагічных ведаў як кампанента светапогляду — тэхнічнай і тэхналагічнай карціны свету;
- фарміраванне вопыту працоўнай дзейнасці, які ўключае авалоданне спосабамі дзейнасці па выкананні асноўных тэхналагічных аперацый ручной працы як неабходнай умовы паспяховай сацыялізацыі;
- выхаванне культуры працы і паводзін у працэсе працоўнай дзейнасці і зносін, развіццё тэхнічных, інтэлектуальных здольнасцей, сенсорных, рухальных і маніпуляцыйных навыкаў;
- фарміраванне цікавасці да працоўнай дзейнасці, першапачатковае знаёмства з асноўнымі сферамі працоўнай дзейнасці чалавека.

Праграма прадугледжвае пераемнасць навучання ва ўстановах дашкольнай адукацыі, на I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. Апора на вопыт вучняў, улік іх здольнасцей і магчымасцей садзейнічаюць дасягненню асобаснай дастатковасці зместу навучання. Змест структураваны ў выглядзе набору адносна самастойных раздзелаў, якія маюць лагічную

завершанасць; іх змест і колькасць вызначаюцца мэтамі вывучэння прадмета.

Змест «Працоўнага навучання» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўключае вывучэнне наступных асноўных ***раздзелаў***:

- Агульная тэхналогія;
- Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў;
- Тэхналогія народных рамёстваў;
- Тэхналогія гаспадарання;
- Тэхналогія раслінаводства.

Раздзел ***«Агульная тэхналогія»*** дазваляе вучням актуалізаваць вопыт, набыты ва ўстановах дашкольнай адукацыі і на занятках папярэдніх гадоў, стварае аснову для паспяховага навучання ў бягучым годзе, знаёміць з правіламі арганізацыі працоўнай дзейнасці і правіламі бяспекі працы.

У межах раздзела ***«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»*** прадугледжана выкарыстанне вялікай разнастайнасці матэрыялаў як традыцыйных (папера, кардон, тканіна, ніткі, прыродныя матэрыялы), так і нетрадыцыйных (шпагат, тонкі шнур, тасьма, саломінкі для кактэйлю, карпусы ад фламастараў, стрыжняў, карданажныя вырабы, шкляначкі, слоічкі, флаконы, пластыкавыя футляры «кіндэр-сюрпрызаў», гафрыраваная папера, драўляныя палачкі для марожанага, прышчэпкі, дрот і інш.), што не толькі забяспечвае магчымасць азнаямлення з максімальным пералікам матэрыялаў, але і садзейнічае развіццю фантазіі, творчай самарэалізацыі вучняў.

Раздзел ***«Тэхналогія народных рамёстваў»*** знаёміць вучняў з найбольш распаўсюджанымі і даступнымі рамёствамі: выцінанка, фларыстыка, саломапляценне, вязанне кручком, вышыўка. Пры рэалізацыі гэтага раздзела неабходна ўлічваць нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці сацыякультурнай спадчыны (наяўнасць мастацкіх промыслаў: саломапляценне, інкрустацыя саломкай, ткацтва, вышыўка, размалёўка, фларыстыка, кераміка і інш.).

Раздзел ***«Тэхналогія гаспадарання»*** садзейнічае фарміраванню элементарных ведаў, уменняў па самаабслугоўванні, культуры паводзін у побыце, выхаванню самастойнасці.

Раздзел ***«Тэхналогія раслінаводства»*** пазнаёміць вучняў з элементарнымі прыёмамі вырошчвання і догляду пакаёвых і кветкава-дэкаратыўных раслін.

У працэсе вывучэння вышэйназваных раздзелаў вучні вырабляюць прадметы па ўзоры, эскізе, малюнку, схеме, найпрасцейшым чарцяжы, слоўным апісанні, асабістай задуме.

Пачынаючы з I класа ўводзяцца элементы графічнай пісьменнасці.

У канцы кожнага навучальнага года прадугледжаны выніковыя заняткі, якія дазваляюць падвесці вынікі працы, прааналізаваць дзейнасць. Вынік працы вучняў прадугледжваецца прадставіць не толькі ў выглядзе традыцыйнай выстаўкі. Прапануецца выкананне калектыўнага выніковага задання, у межах якога кожны вучань выконвае выраб на прапанаваную тэму. Матэрыялы для вырабу падбіраюцца па жаданні вучняў.

Асноўнымі **метадамі** працоўнага навучання з'яўляюцца дэманстрацыя, практыкаванні, доследы і назіранні, практычныя работы і метад праектаў, якія рэалізуюцца ў працэсе вырабу вучнямі канкрэтных прадметаў, якія адпавядаюць патрабаванням функцыянальнасці і эстэтычнай выразнасці (карысці і прыгажосці). Большая частка навучальнага часу (не менш як 80 %) адводзіцца практычнай дзейнасці вучняў. На выкананне вырабу можа адводзіцца 1 ці 2 урокі ў залежнасці ад складанасці канструкцыі і аб'ёму работы. Настаўнік можа выбраць любы з вырабаў, прапанаваных у вучэбнай праграме (рубрыка «Прыкладныя вучэбныя заданні»), ці падабраць іншыя, канструкцыя і тэхналогія вырабу якіх адпавядае зместу раздзела, які вывучаецца. Пры немагчымасці правядзення практычных заняткаў па тэхналогіі раслінаводства (адсутнасць участка пры навучальнай установе, клумбаў) настаўнік можа выкарыстоўваць гэты час для вывучэння іншых раздзелаў. Настаўніку даецца магчымасць выкарыстоўваць каля 30 % навучальнага часу па ўласным меркаванні пры ўмове дасягнення патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, якія прыведзены ў адукацыйным стандарце па працоўным навучанні і ў вучэбнай праграме.

Прафарыентацыйная накіраванасць працоўнага навучання рэалізуецца праз гутаркі на ўроках, сустрэчы з людзьмі працы, мэтавыя прагулкі, экскурсіі.

У дапамогу настаўніку ў вучэбнай праграме выдзелены міжпрадметныя сувязі, якія дапамагаюць рэалізаваць інтэграцыйны характар прадмета «Працоўнае навучанне».

*Курсівам з зорачкай* (*) пазначаны тэмы, якія з’яўляюцца неабавязковымі для вывучэння і могуць вывучацца паводле меркавання настаўніка.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы | Колькасць вучэбных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IV |
| **Агульная тэхналогія** | **2** | **1** | **1** | **1** |
| **Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў** | **18** | **19** | **19** | **19** |
| Вырабы з паперы і кардону | 9 | 9 | 9 | 9 |
| Вырабы з тэкстыльных матэрыялаў | 4 | 6 | 6 | 6 |
| Вырабы з прыродных матэрыялаў | 3 | 2 | 2 | 2 |
| Вырабы з нетрадыцыйных матэрыялаў | 2 | 2 | 2 | 2 |
| **Тэхналогія народных рамёстваў** | **5** | **9** | **11** | **11** |
| Выцінанка | 2 | 3 | 3 | 2 |
| Фларыстыка | 3 | 3 | 2 | 2 |
| Саломапляценне | — | 3 | 2 | 2 |
| Вязанне кручком | — | — | 4 | 2 |
| Вышыўка | — | — | — | 3 |
| **Тэхналогія гаспадарання** | **3** | **3** | **2** | **2** |
| Забеспячэнне побыту сям’і | 1 | — | — | — |
| Знешні выгляд вучня | — | 1 | 1 | — |
| Кнігі ў нашым доме | — | — | — | 1 |
| Падрыхтоўка да свята | 2 | 2 | 1 | 1 |
| **Тэхналогія раслінаводства** | **1** | **1** | **1** | **1** |
| Догляд пакаёвых раслін | 1 | 1 | — | — |
| Догляд кветкава-дэкаратыўных раслін | — | — | 1 | 1 |
| **Выніковыя заняткі** | **1** | **1** | **1** | **1** |
| **Усяго** | **30** | **34** | **35** | **35** |

# I КЛАС

## (30 гадзін)

### АГУЛЬНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ (2 гадзіны)

### Уводзіны ў прадмет «Працоўнае навучанне»

**Тэарэтычныя звесткі.** Чалавек, прырода і свет тэхналогій. Ручная праца. Прыгажосць і карысць рэчаў, якія вырабляюцца. Людзі розных прафесій.

Разнастайнасць канструкцыйных і прыродных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў. Арганізацыя працоўнага месца. Правілы бяспекі працы. Рабочае адзенне.

**Тэмы для гутарак.** Праца ў нашым жыцці. Прафесіі бацькоў. Беражлівыя адносіны да прыроды і навакольных прадметаў. Што мы ўмеем рабіць сваімі рукамі.

**Практычная дзейнасць.** Вызначэнне канструкцыйных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў на падставе дэманстрацыі вырабаў настаўнікам.

### ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ (18 гадзін)

### Вырабы з паперы (9 гадзін)

**Тэарэтычныя звесткі.** Віды паперы: паліграфічная, чарцёжная, абгортачная, газетная. Сыравіна для вытворчасці паперы — драўніна і макулатура. Прымяненне паперы.

Асноўныя геаметрычныя фігуры: квадрат, прамавугольнік, трохвугольнік, многавугольнік, круг. Арнамент з геаметрычных фігур у паласе. Рытм у арнаменце. Правілы пабудовы кампазіцыі.

Элементы графічнай граматы: лінія разрэзу, лінія згібу, месцы нанясення клею.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка з дапамогай шаблону, трафарэта, згінаннем; абрыванне, згінанне, рэзанне, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: разнастайныя віды паперы.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, аловак, лінейка, гладзілка, памазок для клею і інш.

**Тэмы для гутарак.** Папера вакол нас. Як зрабілі сшытак. Прыгажосць і карысць рэчаў.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Узаемнае размяшчэнне прадметаў. Прамая і крывая лініі. Адрэзак. Даўжыня адрэзка. Вымярэнне даўжыні адрэзка. Сантыметр.

**Выяўленчае мастацтва.** Кампазіцыя — гарманічнае запаўненне аркуша выявай. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру выявы памерам аркуша паперы. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Фарміраванне ўяўленняў аб асноўных напрамках. Развіццё навыкаў самастойнага пошуку кампазіцыі. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні. Фарміраванне паняцця пра форму, яе прапорцыі. Элементарнае ўяўленне пра выразнасць колеру: колер святочны і сумны. Арнамент.

**Чалавек і свет.** Уплыў людзей на жыццё раслін.

**Практычная дзейнасць.** Вывучэнне ўласцівасцей паперы: трываласць, шурпатасць, здольнасць да згінання, скручвання, разрыву, разразання, склейвання; колер. Параўнанне ўласцівасцей розных відаў паперы. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў ці іх выяў. Выкананне вырабаў па ўзоры, з элементамі творчасці: выбар матэрыялу, разметка дэталей квадратнай формы згінаннем, разметка дэталей па шаблоне, трафарэце, згінанне, абрыванне, выразанне па знешніх контурах, кампаноўка дэталей на аснове, наклейванне, склейванне, ацэнка гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Прыстасаванні для працы:* падстаўка для пэндзлікаў, каробачка для абрэзкаў паперы, закладка для кніг.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Квітнеючы луг», «Рыбкі ў акварыуме», «На паляне», «Падарожжа на машыне» — сюжэтная аплікацыя. «Матылькі», «Замак» — аплікацыя з геаметрычных фігур. «Караблік у моры», «Пунсовы ветразь» — абрыўная аплікацыя. Упрыгожанні да свята.

*Цацкі:* фігуркі жывёл, рыб, птушак і інш. — арыгамі, канструяванне з палосак паперы.

*Дыдактычны матэрыял:* геаметрычны лічыльны матэрыял (прадметная аплікацыя), танграм.

### **Вырабы з тэкстыльных матэрыялаў** (4 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Баваўняная тканіна (паркаль, фланель). Ніткі. Уласцівасці матэрыялаў (трываласць, колер, форма, мяккасць). Выкарыстанне тэкстыльных матэрыялаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка па лякале, раскрой, склейванне, выцягванне нітак тканіны, разразанне, завязванне вузлоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: фланель, аднатонны паркаль, ніткі.

Інструменты і прыстасаванні: лякалы, кравецкая крэйда, нажніцы, памазок для клею.

**Тэмы для гутарак.** Тканіна ў нашым жыцці. Прафесіі ткача, швачкі. Як кашуля ў полі вырасла.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Паняцце пра форму, яе прапорцыі. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Выразнасць колеру.

**Матэматыка.** Вымярэнне даўжыні прадметаў.

**Практычная дзейнасць.** Распазнаванне паркалю і фланелі па знешнім выглядзе, навобмацак. Выкананне вырабаў па ўзоры з унясеннем творчых дапаўненняў: выбар матэрыялу, разметка дэталей па лякале, выкройванне дэталей, апрацоўка краю вырабу махрамі, выраб кутасіка, завязванне вузельчыка, падразанне канцоў; ацэнка гатовага вырабу і працэсу яго стварэння.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Прыстасаванні для працы:* ігольнік-кніжка.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр’ера:* сурвэтка з махрамі, «Чарадзейны ўзор», «Дзіва-кветка» — аплікацыя з нітак.

*Дэкаратыўныя элементы адзення:* кутасікі.

### **Вырабы з прыродных матэрыялаў** (3 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Разнастайнасць прыродных матэрыялаў. Уласцівасці матэрыялаў (форма, колер, памеры). Варыятыўнасць выкарыстання. Узаемасувязь, прапарцыянальнасць і суразмернасць частак вырабу.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай пластыліну, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, плады рабіны, глогу, барбарысу, засушанае лісце і інш.

Інструменты і прыстасаванні: стэкі, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: пластылін, клей, папера, ніткі.

**Тэмы для гутарак.** Прырода — галоўны архітэктар. Беражлівыя адносіны да прыроды.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Паняцце пра разнастайнасць формаў і колеру ў прыродзе. Паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

**Чалавек і свет.** Асеннія з'явы ў прыродзе. Выспяванне пладоў і насення раслін. Разнастайнасць і прыгажосць раслін. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

**Практычная дзейнасць.** Дызайн-аналіз гатовых вырабаў. Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўяўленні. Ажыццяўленне працэсу вырабу: падбор матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў, злучэнне дэталей, афармленне вырабу; аналіз-разважанне пра прыгажосць гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* фігуркі жывёл «Госці лесу».

*Цацкі:* «Пінгвіняняты», «Кракадзіл Гена», «Залатая рыбка», «Матылёк», «Лесавічок» і інш.

### **Вырабы з нетрадыцыйных матэрыялаў** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Нетрадыцыйнае выкарыстанне матэрыялаў. Уласцівасці матэрыялаў, якія выкарыстоўваюць пры стварэнні вырабаў. Асноўная форма, галоўныя і другарадныя дэталі, іх прапарцыянальныя суадносіны.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, разразанне, нанізванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: шпагат, тонкі шнур, тасьма, вяроўка, саломінкі для кактэйлю, трубачкі ад фламастэраў, стрыжняў.

Інструменты і прыстасаванні: памазок для клею, нажніцы, аловак, тоўстая іголка.

Дапаможныя матэрыялы: клей, папера, тонкі кардон, ніткі.

**Тэмы для гутарак.** «Другое жыццё» рэчаў.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

**Літаратурнае чытанне і беларуская мова.** Узбагачэнне слоўнікавага запасу: шпагат, лінейныя матэрыялы.

**Практычная дзейнасць.** Вывучэнне ўласцівасцей матэрыялаў. Выкананне вырабаў па ўзоры, па асабістай задуме: падбор матэрыялу, злучэнне шчыльнай паперы і лінейных матэрыялаў з дапамогай клею, уцягванне ніткі ў іголку, разразанне і нанізванне трубачак, аналіз вырабу і працэсу яго стварэння.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Сяміколерная красачка», «Вясёлыя звераняты» — пано са шпагату, «Церамок» — падвескі з трубачак.

*Цацкі:* «Парсючок», «Кіска» — са шпагату.

*Дыдактычны матэрыял:* канструктар «Дзівосныя трубачкі».

## **ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ** (5 гадзін)

### **Выцінанка** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** «Беларуская выцінанка». Папера для выцінанак. Залежнасць формы вырабу ад спосабу перагінання і формы элементаў, якія выразаюцца. Сіметрычныя, рапортныя, разеткавыя ўзоры.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: складанне, выразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: тонкая белая і каляровая папера.

Інструменты: нажніцы, аловак.

**Тэмы для гутарак.** Выцінанка — беларускае рамяство.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Паняцце пра лінію і яе разнавіднасці. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні.

**Літаратурнае чытанне.** Узбагачэнне слоўніка: выцінанка, сіметрыя і інш.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па гатовай разметцы, па ўяўленні: выбар, перагінанне паперы, выразанне элементаў; аналіз выніку і працэсу выканання работы.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Цуда-сняжынкі», гірлянды.

*Запрашэнні, віншавальныя паштоўкі:* «З Новым годам», «Усе да нас у госці».

### **Фларыстыка** (3 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Правілы збору і засушвання лістоў. Узор у паласе, квадраце. Рытмічная арганізацыя ўзора.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: лісце дрэў і кустоў, засушаныя ў плоскасці.

Інструменты і дапаможныя матэрыялы: памазок для клею, клей.

**Тэмы для гутарак.** Залатая восень. Лістапад.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Колеры восеньскай прыроды. Паняцце пра разнастайнасць формаў і колеру ў прыродзе. Гарманічнае запаўненне аркуша паперы. Выбар аркуша паперы ў залежнасці ад формы прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру відарысу памерам аркуша паперы. Кампаноўка буйнога відарысу на аркушы паперы. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

**Чалавек і свет.** Залатая восень. Разнастайнасць восеньскай афарбоўкі лісця дрэў і кустоў. Лістапад. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

**Практычная дзейнасць.** Аналіз гатовых вырабаў. Мадэліраванне на паперы. Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўяўленні: выбар асновы, падбор лістоў, складанне кампазіцыі, *разметка*

*размяшчэння лістоў на аснове**, наклейванне засушаных лістоў на аснову, аналіз выкананых вырабаў.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Дыван з восеньскіх лістоў», «Узоры восені», «Восеньская казка», узор з лістоў у паласе, квадраце.

## **ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ** (3 гадзіны)

### **Забеспячэнне побыту сям'і** (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Віды дзейнасці па самаабслугоўванні. Словы «хачу» і «трэба» ў нашых сем'ях. Электрычныя памочнікі. Эканомія электраэнергіі і вады.

**Тэмы для гутарак.** «Добра там жывецца, дзе гуртам сеецца і жнецца».

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Чалавек і свет.** Я і мая сям'я. Абавязкі дзіцяці ў сям'і. Небяспечныя сітуацыі дома. Правілы асабістай гігіены. Як даглядаць адзенне, абутак.

**Літаратурнае чытанне.** Успрыняцце і аналіз твораў (загадак, прыказак, казак і г. д.).

**Практычная дзейнасць.** Арганізацыйна-дзейнасная гульня «Маміны (татавы) памочнікі».

### **Падрыхтоўка да свята** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Афармленне інтэр'ера класнага кабінета да свята. Афармленне падарункаў.

Сервіроўка стала да чаю. Неабходны посуд. Згінанне папяровых сурвэтак. Культура паводзін за сталом.

**Тэмы для гутарак.** Як паводзіць сябе ў гасцях.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Чалавек і свет.** Я і мая сям'я. Абавязкі дзіцяці ў сям'і.

**Беларуская мова і літаратурнае чытанне.** Успрыняцце і аналіз твораў (загадак, прыказак, казак і г. д.). Літаратурная творчасць і імправізацыя (складанне апавяданняў, казак). Культура маўлення.

**Практычная дзейнасць.** Афармленне класнага кабінета, афармленне падарункаў. Сервіроўка стала да чаю.

## ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА (1 гадзіна)

### Догляд пакаёвых раслін (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Правілы догляду пакаёвых раслін.

**Тэмы для гутарак.** Прыгажосць і карысць пакаёвых раслін.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Чалавек і свет.** Расліны — частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць раслін.

**Практычная дзейнасць.** Паліў і апырскванне, рыхленне глебы, выціранне пылу з лістоў, мыццё паддонаў.

## ВЫНІКОВЫЯ ЗАНЯТКІ (1 гадзіна)

Падвядзенне вынікаў года. Выстаўка вырабаў, падрыхтаваных у бягучым годзе. Прэзентацыя і аналіз найлепшых вырабаў.

Рэкамендацыі па нарыхтоўцы ўлетку прыроднага матэрыялу, неабходнага для працы ў II класе: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, шкарлупіны лясных і грэцкіх арэхаў, карані дрэў, пер’е і інш.; кветкі, лісце, галінкі раслін, засушаныя ў плоскасці; саломка.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем неабходных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

***Прыкладнае выніковае заданне***

Калектыўная работа «Танец матылькоў».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ I КЛАСА

Вучні павінны:

*кіравацца правіламі:* бяспекі працы, рацыянальнай арганізацыі працоўнага месца і асабістай гігіены; беражлівых адносін да прыроды, інструментаў, прадметаў побыту; эканомнага расходавання матэрыялаў; працоўнай дысцыпліны;

*мець уяўленне аб:* відах народных рамёстваў (выцінанка, фларыстыка); прафесіях людзей з бліжэйшага акружэння;

*распазнаваць:* віды паперы, прыродныя матэрыялы, баваўняныя тканіны (паркаль, фланель), вывучаныя нетрадыцыйныя матэрыялы; лініі згібу і разрэзу; злучэнне дэталей склейваннем, з дапамогай пластыліну, звязваннем;

*характарызаваць:* асноўныя інструменты пры рабоце з паперай, тэкстыльнымі і прыроднымі матэрыяламі, іх прызначэнне і правілы работы з імі;

*чытаць і разумець:* найпрасцейшыя схемы згінання арыгамі;

*ажыццяўляць (выконваць):* арганізацыю свайго працоўнага месца; разметку паперы па шаблоне, трафарэце, згінаннем, тканіны па лекале; абрыванне паперы, разразанне паперы, тканіны, нітак, шпагату і інш.; злучэнне дэталей з паперы, тэкстыльных, прыродных і нетрадыцыйных матэрыялаў (склейванне, злучэнне з дапамогай пластыліну, звязванне, нанізванне і інш.); выраб прадметаў пад кіраўніцтвам настаўніка па ўзоры, эскізе, малюнку; аздабленне і ўпрыгожванне гатовых вырабаў; найпрасцейшыя работы па доглядзе пакаёвых раслін; сервіроўку стала да чаю.

## II КЛАС

### (34 гадзіны)

### АГУЛЬНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Асноўныя этапы тэхналогіі: падрыхтоўчы, асноўны, заключны. Азнаямленне са зместам навучання ў бягучым годзе.

Знешні выгляд вучня і працоўнае месца. Правілы бяспекі працы. Неабходныя матэрыялы, інструменты, прыстасаванні. Вядомыя прыёмы і правілы работы з паперай, тканінай, прыроднымі і нетрадыцыйнымі матэрыяламі.

**Тэмы для гутарак.** Што рабілі ўлетку ўласнымі рукамі. «Справа майстра паважае».

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Чалавек і свет.** Прадметы прыроды і працы чалавека.

**Практычная дзейнасць.** Вызначэнне відаў канструкцыйных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым класе.

## ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ (19 гадзін)

### Вырабы з паперы і кардону (9 гадзін)

**Тэарэтычныя звесткі.** Тонкі аднаслойны кардон, яго ўласцівасці і выкарыстанне. Сувязь формы і аздаблення прадмета з яго прызначэннем.

Элементы графічнай граматы: пабудова прамога вугла.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка з дапамогай шаблону, *трафарэта**, лінейкі, трохвугольніка; згінанне, разразанне, скручванне, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: разнастайныя віды паперы, тонкі аднаслойны кардон.

Інструменты, прыстасаванні і дапаможныя матэрыялы: нажніцы, аловак, лінейка, трохвугольнік, гладзілка, памазок для клею, клей і інш.

**Тэмы для гутарак.** Што робяць з кардону. Як да нас прыйшла кніга. Беражлівыя адносіны да кніг, часопісаў і інш.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Даўжыня. Адзінка даўжыні — метр. Прамы вугал. Прамавугольнік. Квадрат. Ломаная. Звёны ломанай. Даўжыня ломанай. Перыметр трохвугольніка і чатырохвугольніка.

**Выяўленчае мастацтва.** Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Рытмічная арганізацыя ўзору спосабамі паўтору, чаргавання. Дэкаратыўнае абагульненне раслінных і жывёльных формаў. Светлыя і цёмныя адценні колеру. Выбар колеру ў залежнасці ад эмацыянальнага зместу вобраза. Састаўленне невялікіх скульптурных груп з работ, якія выканалі вучні класа.

**Практычная дзейнасць.** Знаёмства з уласцівасцямі шчыльнай паперы і тонкага кардону: трываласць, таўшчыня. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў ці іх адлюстраванні. Выкананне вырабаў па ўзоры, графічным адлюстраванні, асабістай задуме; вызначэнне формы дэталей па ўзоры, разметка, згінанне, рэзанне, падразанне, выразанне, скручванне, склейванне паперы і тонкага кардону, злучэнне простых аб'ёмных формаў у больш складаныя, упрыгожванне вырабаў; ацэнка вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Космас» — канструяванне з палосак. «Марскія глыбіні», «Замак Снежнай каралевы», «У лесе» — аплікацыя, мазаіка.

*Дэкаратыўныя элементы адзення:* эмблема класа.

*Цацкі:* фігуркі жывёл, падарункавыя каробачкі — арыгамі; ёлачныя аздабленні — плоскія фігуркі з кардону, канструяванне з палосак; домік — аб'ёмнае канструяванне.

*Дыдактычны матэрыял:* святлафор, настольны тэатр; канструктар «Чароўныя палоскі».

*Запрашэнні і віншавальныя паштоўкі:* «З Днём настаўніка», «З Днём маці» — плоскасная і аб'ёмная аплікацыя.

### **Вырабы з тэкстыльных матэрыялаў** (6 гадзін)

**Тэарэтычныя звесткі.** Баваўняныя і льняныя тканіны. Лён і бавоўна — сыравіна для вытворчасці тканін. Ніткі для шыцця, вышывання, пляцення. Колеравыя спалучэнні тканіны і нітак, нітак паміж сабой. Дэкаратыўнае афармленне вырабаў. Размяшчэнне ўзору па ўсёй паверхні, па перыметры, уздоўж аднаго, двух бакоў, у ражку. Сувязь дэкаратыўнага афармлення вырабу з яго прызначэннем.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка па лякале, раскрой, вышыўка швамі «ўперад іголку», «уперад іголку з перавівам», пляценне, завязванне вузлоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: аднатонная баваўняная і льняная тканіна, ніткі для шыцця, вышывання, пляцення.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, іголка, ніткаўцягвальнік, напарстак, кравецкая крэйда, аловак, лінейка, лякалы. Прызначэнне напарстка і ніткаўцягвальніка.

**Тэмы для гутарак.** Расліны — сыравіна для вытворчасці тканін. Прафесія швачкі. Якія ніткі мы ведаем. Эканомнае расходаванне матэрыялаў.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Прамы вугал. Прамавугольнік. Квадрат. Перыметр чатырохвугольніка. Даўжыня. Развіццё вылічальных і вымяральных навыкаў.

**Выяўленчае мастацтва.** Сувязь формы і аздаблення прадмета з яго прызначэннем. Светлыя і цёмныя адценні колеру. Колеравыя спалучэнні. Выбар колеру ў залежнасці ад эмацыянальнага зместу.

**Чалавек і свет.** Значэнне раслін у жыцці людзей. Ахова раслін чалавекам.

**Літаратурнае чытанне.** Узбагачэнне слоўніка новымі словамі.

**Практычная дзейнасць.** Знаёмства з уласцівасцямі тканіны: таўшчыня, шчыльнасць, трываласць, фактура. Параўнанне ўласцівасцей паперы і тканіны. Аналіз формы і канструкцыі вырабу. Выраб прадметаў па ўзоры, графічным адлюстраванні, асабістай задуме; выбар матэрыялу, разметка дэталей па лякале, выкройванне дэталей, апрацоўка краю вырабу махрамі, падбор нітак, адмерванне ніткі, уцягванне ніткі ў іголку, завязванне вузельчыка, выкананне швоў «уперад іголку», «уперад іголку з перавівам», замацаванне канца ніткі на тканіне, звязванне канцоў нітак, пляценне па тры пасмы, падразанне канцоў нітак, аналіз гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Прыстасаванні для працы:* закладкі, петлі і рамкі для аздаблення гатовага вырабу.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* сурвэтка.

*Дэкаратыўныя элементы адзення:* насоўка, шнуры, падвескі, раменьчык, «фенечкі».

*Цацкі:* сувеніры з вышыўкай, якая выканана вывучанымі швамі, нітачная лялька.

### **Вырабы з прыродных матэрыялаў** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Разнастайнасць прыродных матэрыялаў. Уласцівасці матэрыялаў (форма, колер, памеры). Варыятыўнасць выкарыстання. Узаемасувязь, прапарцыянальнасць і суразмернасць фігур у кампазіцыі. Стылізацыя.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай пластыліну, клею. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, шкарлупіны лясных і грэцкіх арэхаў, карані дрэў, пер'е і інш.

Інструменты і прыстасаванні: стэкі, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: пластылін, клей, папера.

**Тэмы для гутарак.** Майстэрня прыроды. Беражлівыя адносіны да прыроды.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Дэкаратыўнае абагульненне раслінных і жывёльных формаў. Суадносіны двух прадметаў па масе і памеры. Састаўленне невялікіх скульптурных груп з работ, якія выкананы вучнямі класа.

**Чалавек і свет.** Разнастайнасць раслін. Часткі раслін. Значэнне раслін у прыродзе і жыцці людзей. Ахова раслін чалавекам. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Правілы прыродаахоўных паводзін.

**Беларуская мова і літаратурнае чытанне.** Узбагачэнне слоўнікавага запасу новымі словамі.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па малюнку, па ўяўленні, па асабістай задуме: падбор прыроднага матэрыялу, мадэліраванне, злучэнне дэталей, афармленне вырабу, аналіз гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* кампазіцыі на тэмы казак «Ліса і дзяцел», «Рэпка», «Тры парасяці», «Калабок».

*Цацкі:* караблікі, фігуркі жывёл, людзей.

### **Вырабы з нетрадыцыйных матэрыялаў** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Першапачатковыя звесткі пра кардонажныя вырабы, пластмасу. Уласцівасці матэрыялаў, якія выкарыстоўваюць пры стварэнні вырабаў. Уяўленне пра форму ў галіне канструявання. Дапаўненне асноўнай канструкцыі характэрнымі дэталямі. Узаемасувязь дэталей вырабу. Сувязь формы і аздаблення вырабу з яго прызначэннем.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, абклейванне, разразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: кардонныя каробкі, упакоўкі і інш.; пластмасавыя шкляначкі, слоічкі, флаконы і інш.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, пэндзаль для клею.

Дапаможныя матэрыялы: папера, ніткі, папяровы шпагат, шнур, клей, лейкапластыр, двухбаковы скотч.

**Тэмы для гутарак.** «Другое жыццё» рэчаў.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Сувязь формы і аздаблення прадмета з яго прызначэннем. Суадносіны двух прадметаў па масе і памеры.

**Беларуская мова і літаратурнае чытанне.** Узбагачэнне слоўнікавага запасу новымі словамі.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па ўзоры, па малюнку, па асабістай задуме: мадэліраванне з гатовых формаў, падбор нетрадыцыйных і дапаможных матэрыялаў, выраб дэталей, злучэнне, афармленне вырабу; аналіз гатовага вырабу і працэсу яго выканання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Прыстасаванні для працы:* падстаўка для алоўкаў, для канцылярскіх прылад.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* вазачкі, шкатулкі, рамкі для пано і фатаграфій.

*Цацкі:* казачныя персанажы, стылізаваныя фігуркі жывёл.

## ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ (9 гадзін)

### Выцінанка (3 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Гістарычныя звесткі пра выцінанку. Спосабы атрымання ўзору. Залежнасць формы вырабу ад спосабу згінання паперы і элементаў, якія выразаюцца. Разеткавыя, сіметрычныя і рапортныя выцінанкі.

Форма, узор, арнамент. Паслядоўнасць аналізу: знешняя форма, элементы арнаменту (геаметрычныя фігуры), кампазіцыя (сіметрыя, рытм). Патрабаванні да ўзораў для выцінанкі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: складанне, выразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: белая і каляровая папера.

Інструменты: аловак, нажніцы.

**Тэмы для гутарак.** Мінулае і сучаснасць выцінанкі. Узоры выцінанкі.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, яго сувязь с прыродай. Дэкаратыўнае абагульненне раслінных і жывёльных формаў. Раслінныя матывы ў арнаменце.

**Літаратурнае чытанне.** Развіццё мовы.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па гатовай разметцы, па ўяўленні: распрацоўка ўзору, выбар і згінанне паперы, выразанне элементаў узору з папярэдняй прарысоўкай контуру; аналіз атрыманай выцінанкі, прыёмаў выразання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «цуда-сняжынкі», пано, сурвэтка, гірлянда.

*Дэкаратыўныя элементы для афармлення вырабаў* з паперы, кардону, нетрадыцыйных матэрыялаў.

*Цацкі:* ёлачныя аздабленні.

*Запрашэнні, віншавальныя паштоўкі:* «З Новым годам», «Запрашаем у госці».

### **Фларыстыка: аплікацыя з засушаных раслін** (3 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Разнастайнасць раслін для аплікацыі. Уласцівасці засушаных раслін. Варыятыўнасць выкарыстання.

Стылізаванае адлюстраванне жывёл, насякомых, птушак, рыб з матэрыялаў флоры. Цэласнасць кампазіцыі. Перадача прасторы ў дэкаратыўнай кампазіцыі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка, разразанне, наклейванне, сушка гатовага вырабу. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: расліны, засушаныя ў плоскасці.

Інструменты і прыстасаванні: алоўак, нажніцы, пэндзлік для клею.

Дапаможныя матэрыялы: папера, клей.

**Тэма для гутаркі.** Ахова раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца; запаўненне плоскасці аркуша паперы буйным відарысам. Светлыя і цёмныя адценні колеру. Выбар колеру ў залежнасці ад эмацыянальнага зместу. Дэкаратыўнае абагульненне формаў прадметаў.

**Чалавек і свет.** Разнастайнасць раслін. Часткі раслін. Значэнне раслін у прыродзе і жыцці людзей. Ахова раслін чалавекам. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Правілы прыродаахоўных паводзін.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўяўленні: выбар матэрыялу, складанне кампазіцыі, разметка размяшчэння раслін на аснове, наклейванне засушаных раслін на аснову; аналіз гатовых работ.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* тэматычныя кампазіцыі «Матылёк-прыгажун», «Страказа», «Жар-птушка», «Залатая рыбка», «Восеньскі пейзаж», «Восеньская казка», «Цуда-кветка».

*Запрашэнні, паштоўкі:* «Любай мамачцы», «Да пабачэння, восень».

### **Саломапляценне: дэкаратыўныя элементы** (3 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Беларускае саломапляценне. Падрыхтоўка саломы да работы. Трубчастая саломка. Уласцівасці: трываласць, колер.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: ачыстка, разразанне на часткі, наклейванне на папяровую аснову, нанізванне на нітку, звязванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: саломка.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, тоўстая іголка, пэндзаль для клею.

Дапаможныя матэрыялы: ніткі, папера, клей.

**Тэма для гутаркі.** Народнае рамяство саломапляцення.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, яго сувязь з прыродай.

**Чалавек і свет.** Найбольш распаўсюджаныя культурныя расліны.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў з саламяных трубачак па ўзоры, па ўяўленні: падрыхтоўка матэрыялу, наразанне, мадэліраванне з трубчастай саломкі, наклейванне на аснову, нанізванне, параўнанне з узорам, аналіз выкананага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* гірлянды, ланцужкі, ліхтарыкі, сонейкі, пано (аплікацыя) і інш.

*Цацкі:* ёлачныя аздабленні.

## ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ (3 гадзіны)

### Знешні выгляд вучня (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Патрабаванні да знешняга выгляду. Догляд сябе, адзення, абутку. Беражлівыя адносіны да адзення і абутку.

**Тэма для гутаркі.** Як ствараецца адзенне (гутарка — вандроўка на швейную фабрыку).

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Беларуская мова.** Этыка маўлення, пабудова дыялога.

**Чалавек і свет.** Знешні выгляд вучня.

**Практычная дзейнасць.** Аналіз уласнага знешняга выгляду, адзення, абутку. Выкананне самых простых аперацый па доглядзе адзення, абутку. Экскурсія ў школьную майстэрню.

### Падрыхтоўка да свята (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Афармленне інтэр'ера да свята. Распрацоўка дэкаратыўных элементаў інтэр'ера.

Правілы этыкету. Выбар і ўпакоўка падарункаў. Уручэнне кветак і падарункаў. Як прымаць падарункі.

**Тэмы для гутарак.** Як уручаць і прымаць падарункі.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Беларуская мова.** Этыка маўлення, пабудова дыялога.

**Літаратурнае чытанне**. Прагаворванне і завучванне скорагаворак, лічылак.

**Чалавек і свет.** Сямейныя традыцыі і звычаі. Будні і святы.

**Практычная дзейнасць.** Афармленне класнага кабінета да свята. Выраб аздабленняў для навагодняй ёлкі. Упакоўка падарункаў. Ролевая гульня «Ідзём у госці».

## ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА (1 гадзіна)

### Догляд пакаёвых раслін (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Размяшчэнне раслін у інтэр'еры. Патрабаванні да догляду розных відаў раслін.

**Тэмы для гутарак.** Значэнне пакаёвых раслін.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Чалавек і свет.** Значэнне раслін у жыцці людзей. Разнастайнасць раслін. Умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін. Праца людзей па вырошчванні культурных раслін.

**Практычная дзейнасць.** Догляд пакаёвых раслін.

## ВЫНІКОВЫЯ ЗАНЯТКІ (1 гадзіна)

Падвядзенне вынікаў года. Прэзентацыя вырабаў, падрыхтаваных у бягучым годзе. Гульня «Майстэрня падарункаў».

Рэкамендацыі па нарыхтоўцы ўлетку прыроднага матэрыялу, неабходнага для працы ў III класе: ракавінкі, каменьчыкі, яйкавыя шкарлупіны і інш.; расліны, засушаныя з захаваннем аб'ёмнай формы; саломка.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем неабходных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

***Прыкладнае выніковае заданне***

Калектыўная работа «Квітнеючы луг».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

Вучні п а в і н н ы:

*кіравацца правіламі:* бяспекі працы, рацыянальнай арганізацыі працоўнага месца і асабістай гігіены, эканомнага расходавання матэрыялаў, працоўнай дысцыпліны;

*мець уяўленне аб:* баваўняных і льняных тканінах, уласцівасці паперы, кардону, тканіны; варыятыўнасці догляду пакаёвых раслін; народным рамястве саломапляцення; этапах тэхналогіі;

*распазнаваць:* паперу, кардон, тканіны, віды прыродных матэрыялаў, нетрадыцыйныя матэрыялы, форму дэталі па ўзоры;

*характарызаваць:* злучэнне дэталей склейваннем, сшываннем, звязваннем; змацаванне пластылінам;

*чытаць і разумець:* самыя простыя графічныя адлюстраванні (эскізы, тэхнічныя малюнкі);

*распрацоўваць:* дэкаратыўныя элементы інтэр'ера з улікам набытага ў II класе вопыту;

*ажыццяўляць (выконваць):* арганізацыю свайго працоўнага месца; выбар інструментаў для апрацоўкі паперы, тканіны і іншых матэрыялаў; вядомыя спосабы апрацоўкі вывучаных матэрыялаў; выраб прадметаў пад кіраўніцтвам настаўніка па ўзоры, эскізе, малюнку, асабістай задуме; аздабленне гатовых вырабаў; догляд адзення, абутку.

## III КЛАС

### (35 гадзін)

### **АГУЛЬНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ** (1 гадзіна)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Стадыі тэхналогіі. Ажыццяўленне тэхналогіі ад ідэі да новай ідэі на падставе аналізу вырабаў, створаных у мінулым навучальным годзе. Азнаямленне са зместам навучання ў бягучым годзе.

Арганізацыя працоўнага месца. Правілы бяспекі працы. Неабходныя матэрыялы, інструменты, прыстасаванні. Вядомыя прыёмы і правілы работы з паперай, кардонам, тканінай, прыроднымі і нетрадыцыйнымі матэрыяламі.

**Тэма для гутаркі.** Што рабілі ўлетку ўласнымі рукамі.

**Практычная дзейнасць.** Вызначэнне відаў канструкцыйных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым класе.

### **ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ** (19 гадзін)

#### **Вырабы з паперы і кардону** (9 гадзін)

**Тэарэтычныя звесткі.** Віды паперы: калька, капіравальная, гафрыраваная папера. Віды кардону: паліграфічны, упаковачны. Іх уласцівасці.

Групы злучэння дэталей у вырабе: раздымнае і нераздымнае. Віды злучэнняў: клеявое, шчыліннае, злучэнне пляценнем.

Злучэнне простых аб'ёмных формаў у больш складаныя. Цэласнасць і ўраўнаважанасць вырабу. Сіметрычная і асімет-

рычная форма. Стылізаваная форма. Колеравае рашэнне вырабаў.

Асновы графічнай граматы: лінія нябачнага контуру, размерная лінія. Графічнае адлюстраванне (эскіз, чарцёж).

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка чарцёжнымі інструментамі, выразанне па знешніх і ўнутраных контурах, згінанне, злучэнне дэталей рознымі спосабамі. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: разнастайныя віды паперы, паліграфічны і ўпаковачны (гафрыраваны) кардон.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, аловак, лінейка, трохвугольнік, скобасшывальнік (стэплер), дзіркакол, памазок для клею.

**Тэмы для гутарак.** Што робяць з кардону. Прафесія паліграфіста.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Плошча. Абазначэнне адрэзка, трохвугольніка. Уласцівасці прамавугольніка і квадрата.

**Выяўленчае мастацтва.** Форма, яе часткі, узаемнае размяшчэнне частак. Рытмічнае чаргаванне формаў, сіметрыя. Адзінства формы прадмета і аздаблення. Сувязь формы з прызначэннем. Паняцце пра яркія, кантрастныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру. Выбар аркуша паперы ў залежнасці ад зместу малюнка.

**Практычная дзейнасць.** Вывучэнне ўласцівасцей розных відаў кардону. Вывучэнне ўласцівасцей калькі і капіравальнай паперы. Выраб прадметаў па тэхнічным малюнку, эскізе, схеме: аналіз формы і канструкцыі вырабаў, чытанне самых простых графічных адлюстраванняў, вымярэнне адрэзкаў у сантыметрах, выбар матэрыялу, разметка дэталей, рэзанне, згінанне, злучэнне дэталей рознымі спосабамі, афармленне вырабаў; аналіз гатовага вырабу, тэхналогіі вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Прыстасаванні для працы:* закладка для кнігі, наглядныя дапаможнікі.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр’ера:* рамкі для фатаграфій, шары (арыгамі), сувенірныя кошыкі, пано «Святочныя зоры»; «Кошык з кветкамі», «Сланечнікі» — аплікацыя.

*Дэкаратыўныя элементы касцюма:* сумачкі.

*Цацкі:* фігуркі жывёл.

*Дыдактычны матэрыял:* наглядныя дапаможнікі да ўрокаў (на выбар настаўніка).

### **Вырабы з тэкстыльных матэрыялаў** (6 гадзін)

**Тэарэтычныя звесткі.** Баваўняныя, ільняныя, шарсцяныя, шаўковыя тканіны. Выкарыстанне тканін. Воўна і шоўк — сыравіна для вытворчасці шарсцяных і шаўковых тканін. Перапляценне нітак у тканіне. Разнастайнасць тканін па малюнку. Добры (правы) і адваротны (левы) бакі тканіны. Прынцыпы атрымання ўзору ў тэхніцы «выяўленчая нітка». Сувязь формы і колеравага рашэння вырабу з яго прызначэннем. Адзінства формы вырабу і аздаблення. Стылізацыя формы.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка, раскрой па прамалінейных і крывалінейных контурах, злучэнне дэталей сцяблістым швом, *швом «назад іголку»**, аздабленне сцяблістым і тамбурным швамі, *швом «прымацаваная пятля»**, абвіванне колцаў, сцягванне нітак, разразанне нітак, надразанне асновы для выяўленчай ніткі, перапляценне асновы ніткамі. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: баваўняныя тканіны (аднатонныя і з набіўным малюнкам), *ільняныя і шарсцяныя тканіны**, ніткі для шыцця, вышывання, пляцення.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, іголка, ніткаўцягвальнік, кравецкія шпількі, напарстак, кравецкая крэйда, аловак, лякалы, лінейка, трохвугольнік.

Дапаможныя матэрыялы: папера, кардон, клей, пацеркі.

**Тэмы для гутарак.** Прафесія мастака-мадэльера. Прызначэнне шаўковых і шарсцяных тканін. Мастацтва выяўленчай ніткі.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Уласцівасці прамавугольніка і квадрата.

**Выяўленчае мастацтва.** Форма, яе часткі, узаемнае размяшчэнне частак. Адзінства формы прадмета і аздаблення. Сувязь формы з прызначэннем. Паняцце пра яркія, кантрасныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру.

**Практычная дзейнасць.** Пераўнанне ўласцівасцей тканін: таўшчыня, шчыльнасць, трываласць, гладкасць. Вызначэнне тканін па знешнім выглядзе, навобмацак. Выраб прадметаў па ўзоры, схеме, графічным адлюстраванні, асабістай задуме: аналіз формы і канструкцыі вырабу, тэхналогіі вырабу, распрацоўка кампазіцыі вырабу, падрыхтоўка лякалаў дэталей, выбар матэрыялу, разметка дэталей па лякалах, раскрой, апрацоўка краю швом упадгінку, злучэнне дэталей, выраб колцаў з кардону, выраб і злучэнне пампонаў, падрыхтоўка асновы для выяўленчай ніткі, перапляценне ніткамі вугла, аздабленне вырабу; аналіз якасці гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Прыстасаванні для працы:* мяшэчак для рукадзелля, прыхватка.

*Дэкаратыўныя элементы касцюма:* насоўка з манаграмай.

*Дэкаратыўныя элементы:* афармленне вокладкі кнігі, альбома, рамка для віншавання, для гатовых работ — выяўленчая нітка.

*Запрашэнні, віншавальныя паштоўкі:* «Загадкавыя ўзоры» — выяўленчая нітка.

*Цацкі:* пальчыкавая лялька для дамашняга тэатра, плоскія мяккія цацкі, цацкі з пампонаў (пчолка, кацяня, зайчаня, парсючок, птушачка).

### Вырабы з прыродных матэрыялаў (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Разнастайнасць прыродных матэрыялаў. Уласцівасці матэрыялаў (форма, колер, памеры). Варыятыўнасць выкарыстання.

Дынамічныя і статычныя постаці. Спосабы перадачы статычнасці. Цэласнасць кампазіцыі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай пластыліну, клею. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: ракавінкі, каменьчыкі, яйкавыя шкарлупіны і інш.

Інструменты і прыстасаванні: стэкі, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: папера, клей, пластылін.

**Тэмы для гутарак.** Разнастайнасць прыродных матэрыялаў. Беражлівыя адносіны да прыроды.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Узаемадзеянне фігур у скульптурнай кампазіцыі. Перадача характэрных рыс асноўнай формы і дэталей прадмета з выкарыстаннем фактуры і формы прыродных матэтыялаў. Асноўныя асаблівасці будовы цела чалавека і жывёліны, размяшчэнне частак цела ў руху. Перадача характэрных поз і рухаў жывёл. Перадача настрою ў вобразе.

**Практычная дзейнасць.** Выраб прадметаў па ўяўленні, па асабістай задуме: аналіз формы і канструкцыі вырабаў, тэхналогіі вырабу, падбор прыроднага матэрыялу, злучэнне дэталей, мастацкае рашэнне вырабу, аналіз гатовага вырабу; тэхналогіі вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Сябры», «Паўлін», «Лебедзі», «Царэўна-жаба», «Казачны домік», «Залатая рыбка», «Шчаня» — міні-скульптуры; пано з яйкавага шкарлупіння.

*Цацкі:* «Сувенірная крама».

### **Вырабы з нетрадыцыйных матэрыялаў** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Агульнае ўяўленне пра пластмасы. Уласцівасці: лёгкасць, гнуткасць, эластычнасць, трываласць, колер, светапранікальнасць. Выкарыстанне пластмасы.

Агульнае ўяўленне пра драўніну. Уласцівасці: трываласць, колер, тэкстура, вільгацеўстойлівасць і інш. Выкарыстанне драўніны.

Варыятыўнасць выкарыстання нетрадыцыйных матэрыялаў у канструяванні. Форма ў канструяванні. Прапарцыянальнасць і ўраўнаважанасць формы. Цэласнасць кампазіцыі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка, рэзанне, наклейванне, склейванне, *злучэнне сшываннем**, *афарбоўка**. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: розныя пластыкавыя флаконы, драўляныя вырабы (палачкі для марожанага, прышчэпкі, дэталі драўлянага канструктара) і інш.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, памазок для клею, пэндзлік, аловак, лінейка, *тоўстая іголка**.

Дапаможныя матэрыялы: папера, тканіна, ніткі, прыродныя матэрыялы, клей, *акварэльныя або акрылавыя фарбы**.

**Тэмы для гутарак.** Што вырабляюць з пластмасы. Што вырабляюць з драўніны.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Перадача характару галоўнай формы, яе частак, іх узаемнага размяшчэння. Асноўныя асаблівасці будовы цела чалавека і жывёліны, размяшчэнне частак цела ў руху. Перадача характэрных поз і рухаў жывёл. Перадача настрою ў вобразе.

**Практычная дзейнасць.** Выраб прадметаў па ўзоры, малюнку, асабістай задуме: аналіз формы і канструкцыі вырабаў. Мадэліраванне вырабаў, падбор асноўных і дапаможных матэрыялаў, выраб дэталей, іх злучэнне, афармленне вырабу; аналіз гатовага вырабу і тэхналогіі яго выканання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* ваза для кветак, ваза для фруктаў, аздабленні для стала.

*Цацкі:* фігуркі казачных персанажаў, мадэлі транспартных сродкаў.

## **ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ** (11 гадзін)

### **Выцінанка** (3 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Разнастайнасць узораў для выцінанкі: геаметрычныя, раслінныя, зааморфныя. Правілы складання ўзору. Спосабы атрымання ўзору. Залежнасць формы вырабу ад спосабу згінання паперы і элементаў, якія выразаюцца. Шасціпрамянёвая разеткавая выцінанка.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: згінанне, выразанне, наклейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: белая і каляровая папера.

Інструменты: нажніцы, аловак.

Дапаможныя матэрыялы: клеючы карандаш.

**Тэма для гутаркі.** Матывы народных выцінанак.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Рытмічнае чаргаванне формаў, сіметрыя.

**Літаратурнае чытанне.** Узбагачэнне слоўнікавага запасу.

**Практычная дзейнасць.** Выраб выцінанак на аснове аналагаў, па асабістай задуме. Састаўленне ўзору, падбор і згінанне паперы, прарысоўка контуру і выразанне дэкаратыўных формаў са згорнутай паперы, наклейванне на аснову; аналіз атрыманай выцінанкі, тэхналогіі выразання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Узоры прыроды» — праект ажурнай рашоткі брамы, балконаў ці налічніка, бардзюра.

*Дэкаратыўныя элементы для афармлення інтэр'ера:* пано, навагоднія аздабленні.

### **Вязанне кручком** (4 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Матэрыялы для вязання кручком. Віды нітак, іх выкарыстанне і ўласцівасці. Адпаведнасць нумара кручка таўшчыні нітак. Колеравае рашэнне вырабаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: вязанне паветранай пятлі, паўслупка. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: ніткі для вязання.

Інструменты: кручок, нажніцы.

**Тэмы для гутарак.** Мастацтва вязання кручком. Прафесія вязальшчыцы.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Паняцце пра яркія, кантрастныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру. Адзінства формы прадмета і аздаблення. Сувязь формы прадмета з прызначэннем.

**Літаратурнае чытанне.** Узбагачэнне слоўнікавага запасу.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па ўзоры, малюнку. Аналіз канструкцыі вырабу. Падбор нітак і кручка, выкананне паветранай пятлі, вязанне ланцужка з паветраных петляў, паўслупка, наклейванне ланцужкоў, афармленне вырабу; аналіз гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Мелодыі ветру», «Вясёлка» — контурныя аплікацыі.

*Дэкаратыўныя элементы касцюма:* аздабленні з ланцужкоў.

*Цацкі:* «Кураня», «Парсючок», «Вожык» з ланцужкоў паветраных петляў.

## **Фларыстыка** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Разнастайнасць раслін для стварэння аб'ёмных кампазіцый. Правілы збору і засушвання раслін. Уласцівасці раслін, засушаных з захаваннем аб'ёму.

Правілы аранжыроўкі раслін: прапорцыі, сіметрыя, асіметрыя, ураўнаважанасць.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, абрэзка, звязванне пучкоў, устанаўленне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: расліны, засушаныя з захаваннем аб'ёмнай формы.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, аснова для замацавання раслін (грыб-трутавік, скрынкі, пластыкавыя ўпакоўкі).

Дапаможныя матэрыялы: папера, пластылін, ніткі.

**Тэмы для гутарак.** Ахова прыроды пры нарыхтоўцы прыроднага матэрыялу. Прафесія фларыста.

> МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ
>
> **Выяўленчае мастацтва.** Паняцце пра яркія, кантрастныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру. Перадача характэрных рыс асноўнай формы і дэталей прадмета з выкарыстаннем фактуры і формы прыродных матэрыялаў. Адзінства формы прадмета і аздаблення.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па ўзоры, уяўленні, малюнку. Выбар матэрыялу, складанне кампазіцыі, наклейванне раслін. Кампаноўка невялікага букета і звязванне пучка раслін, замацаванне раслін на аснове, афармленне гатовага вырабу, аналіз гатовых работ.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* восеньскі букет, насценныя аздабленні, «Фларыстычны калаж».

### **Саломапляценне: дэкаратыўныя «павукі»** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Падрыхтоўка трубчастай саломкі да работы. Змяненне ўласцівасцей саломкі пры ўвільгатненні. Спосабы злучэння дэталей. Віды аздаблення гатовых вырабаў (каляровымі ніткамі, тасьмой).

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разразанне, нанізванне, перавязванне пучка, перапляценне саломін ніткамі. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: саломка.

Інструменты: нажніцы, тоўстая іголка.

Дапаможныя матэрыялы: ніткі.

**Тэма для гутаркі.** Традыцыі сялянскага саломапляцення.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Форма, яе часткі, узаемнае размяшчэнне частак. Адзінства формы прадмета і аздаблення.

**Чалавек і свет.** Расліны поля.

**Практычная дзейнасць.** Параўнанне ўласцівасцей сухой і вільготнай саломкі. Выкананне вырабаў па ўзоры, малюнку, па асабістай задуме: распрацоўка кампазіцыі вырабу, падрыхтоўка саломкі, выраб частак «павука», выраб дэкаратыўных элементаў для ўпрыгожвання «павука», зборка «павука»; аналіз выкананага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* кутасікі, сонейка, «павук» (калектыўная работа).

*Цацкі:* ёлачныя аздабленні.

## **ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ** (2 гадзіны)

### **Знешні выгляд вучня** (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Догляд адзення. Захаванне і падаўжэнне тэрміну нашэння адзення. Дробны рамонт адзення.

**Тэмы для гутарак.** Гісторыя гузіка.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Беларуская мова.** Этыка маўлення, пабудова дыялогу.

**Практычная дзейнасць.** Прышыванне гузікаў з дзвюма адтулінамі, *петлі**.

### **Падрыхтоўка да свята** (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Карнавальны касцюм. Распрацоўка праектаў карнавальных касцюмаў і масак. Канструкцыйныя асаблівасці масак.

**Тэма для гутаркі.** Карнавал.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Літаратурнае чытанне.** Развіццё мовы.

**Практычная дзейнасць.** Распрацоўка, выраб масак.

## **ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА** (1 гадзіна)

### **Догляд кветкава-дэкаратыўных раслін** (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Кветкава-дэкаратыўныя расліны: настуркі, календула, касмея і інш. Правілы падрыхтоўкі насення аднагадовых раслін да сяўбы. Догляд раслін.

**Тэма для гутаркі.** Кветкі вакол нашага дома.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Чалавек і свет.** Раслінны свет.

**Практычная дзейнасць.** Падрыхтоўка насення да сяўбы. Падрыхтоўка глебы. Афармленне клумбы. Сяўба насення. Догляд пасеваў. Назіранне за ростам раслін.

## **ВЫНІКОВЫЯ ЗАНЯТКІ** (1 гадзіна)

Падвядзенне вынікаў года. Аналіз лепшых вырабаў. Гульня «Загадка Самадзелкіна».

Рэкамендацыі па нарыхтоўцы ўлетку прыроднага матэрыялу, неабходнага для работы ў IV класе: жалуды, каштаны, шышкі, галінкі дрэў і інш.; расліны, засушаныя з захаваннем аб'ёмнай формы; саломка.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем вывучаных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

***Прыкладнае выніковае заданне***

Калектыўная работа «Падводнае царства».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Вучні п а в і н н ы:

*кіравацца правіламі:* бяспекі працы, рацыянальнай арганізацыі працоўнага месца і асабістай гігіены; беражлівых адносін да матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў, да асабістай і грамадскай уласнасці;

*мець уяўленне аб:* стадыях тэхналогіі; відах рамёстваў (саломапляценне, фларыстыка, вязанне кручком, выцінанка); шарсцяных і шаўковых тканінах, структуры тканіны; прафесіі людзей працы; вырошчванні аднагадовых кветкава-дэкаратыўных раслін;

*распазнаваць (вызначаць):* віды паперы (калька, капіравальная, гафрыраваная), кардону (упаковачны, паліграфічны), тэкстыльных, прыродных, нетрадыцыйных (пластмаса, драўніна) матэрыялаў і ведаць іх уласцівасці; добры і адваротны бакі тканіны з набіўным малюнкам;

*характарызаваць:* раздымныя і нераздымныя злучэнні; віды злучэнняў: клеявое, шчыліннае, ніткавае; віды нітак для шытва, вязання;

*чытаць і разумець:* самыя простыя графічныя адлюстраванні (схемы, эскізы, чарцяжы, тэхналагічныя карты);

*распрацоўваць:* нескладаныя эскізы і варыянты кампазіцыі вырабаў з дапамогай вывучаных законаў і правілаў кампазіцыі;

*ажыццяўляць (выконваць):* арганізацыю свайго рабочага месца; выбар і карыстанне інструментамі (лінейка, трохвугольнік, нажніцы, іголка); выраб прадметаў з паперы, кардону, тэкстыльных, прыродных, нетрадыцыйных матэрыялаў па ўзоры, эскізе, тэхналагічнай карце, асабістай задуме.

# IV КЛАС

## (35 гадзін)

### **АГУЛЬНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ** (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Стадыі і этапы тэхналогіі на падставе аналізу вырабаў, выкананых у мінулым навучальным годзе. Азнаямленне са зместам навучання ў бягучым годзе.

Арганізацыя працоўнага месца. Правілы бяспекі працы. Неабходныя матэрыялы, інструменты, прыстасаванні. Вядомыя прыёмы і правілы работы з паперай, кардонам, тканінай, прыроднымі і нетрадыцыйнымі матэрыяламі.

**Тэмы для гутарак.** Што рабілі ўлетку ўласнымі рукамі. Тэхналогія, праца, прафесія.

**Практычная дзейнасць.** Вызначэнне відаў канструкцыйных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым класе.

### **ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ** (19 гадзін)

#### **Вырабы з паперы і кардону** (9 гадзін)

**Тэарэтычныя звесткі.** Уласцівасці паперы і кардону: таўшчыня, трываласць, пругкасць, водапранікальнасць, колер.

Асновы графічнай граматы: месца пракол, восевая лінія. Пабудова акружнасці. Пабудова трохвугольніка пры дапамозе цыркуля. Разгортка аб'ёмнага вырабу. Клапаны на разгортках.

*Паняцці: дэталь, зборачная адзінка, камплект**. Індывідуальнае, групавое і калектыўнае канструяванне асобных элементаў і кампаноўка іх у адзіны камплект. Колеравае і дэкаратыўнае рашэнне вырабаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка чарцёжнымі інструментамі, згінанне кардону, праколванне адтулін, выкананне дротавага злучэння. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: разнастайныя віды паперы і кардону.

Інструменты: аловак, лінейка, трохвугольнік, цыркуль, шыла, кусачкі і інш.

**Тэмы для гутарак.** Прафесія канструктара. Гісторыя цыркуля.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Адзінкі вымярэння даўжыні: міліметр, сантыметр і суадносіны паміж імі. Плошча прамавугольніка і квадрата. Акружнасць і круг. Пабудова акружнасці з зададзеным цэнтрам і радыусам пры дапамозе цыркуля. Уяўленне пра целы: куб, прызму, піраміду, конус, цыліндр, шар. Разгортка куба.

**Выяўленчае мастацтва.** Колер як сродак перадачы настрою. Абагульненасць формы, рытмічнае чаргаванне ўзораў, яркасць колеру, сувязь формы з аздабленнем і прызначэннем прадмета. Стварэнне аб'ёмнага вобраза шляхам камбінавання прадметаў рознай формы. Прасторавая канструкцыя з прамавугольных і цыліндрычных формаў рознай велічыні і аб'ёму.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па тэхнічным малюнку, эскізе, тэхналагічнай карце, асабістай задуме. Аналіз формы, канструкцыі і тэхналогіі вырабу прадмета. Чытанне графічных адлюстраванняў, пабудова разгортак, выбар матэрыялу, разметка дэталей, рэзанне, згінанне, злучэнне дэталей рознымі спосабамі, афармленне вырабаў; аналіз гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* каробачкі, шкатулкі, падарункавыя ўпакоўкі рознай формы, упрыгажэнні да народных свят: Каляды, Гуканне вясны, Купалле, аб'ёмныя аплікацыі з палосак паперы.

*Дэкаратыўныя элементы касцюма:* каралі, падвескі, галаўныя ўборы, маскі.

*Цацкі:* цацкі і падвескі да Новага года, фігуркі птушак, жывёл, дынамічныя цацкі, кампазіцыя «Казачны горад».

### **Вырабы з тэкстыльных матэрыялаў** (6 гадзін)

**Тэарэтычныя звесткі.** Тканіны з хімічных і змешаных валокнаў. Прызначэнне тканін, іх тэхналагічныя ўласцівасці (адносіны да ўвільгатнення, уздзеяння высокай тэмпературы, змінальнасць). Адрозненне тэкстыльных матэрыялаў па структуры. Адметныя асаблівасці тканіны і іншых тэкстыльных ма-

тэрыялаў (трыкатаж, футра, сінтэпон). Выбар тэкстыльных матэрыялаў для розных вырабаў.

Абрэзкавае шыццё. Віды ўзораў абрэзкавага шыцця. Колеравае рашэнне вырабу.

Выяўленчая нітка. Матэрыялы для работы (кардон, каляровыя ніткі). Прынцыпы пабудовы відарыса на паперы. Прыёмы перапляцення нітак. Колеравае рашэнне.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: апрацоўка краю швом «цераз край», злучэнне дэталей сцяблiністым швом, нанясенне малюнка на аснову для выяўленчай ніткі, праколванне асновы іголкай, перапляценне ніткамі. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: баваўняныя тканіны, *ільняныя, шарсцяныя тканіны**, штучнае футра, *трыкатажныя палотны**, ніткі для шыцця, вышывання, пляцення.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, кравецкая крэйда, іголка, кравецкія шпількі, напарстак, аловак, шыла і інш.

**Тэмы для гутарак.** Гісторыя і традыцыі абрэзкавага шыцця. Прафесія мадэльера. Іголачка-чараўніца.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Адзінкі вымярэння даўжыні: міліметр, сантыметр і суадносіны паміж імі. Акружнасць і круг. Пабудова акружнасці з зададзеным цэнтрам і радыусам пры дапамозе цыркуля.

**Выяўленчае мастацтва.** Абагульненасць формы, рытмічнае чаргаванне ўзораў, яркасць колеру, сувязь формы з аздабленнем і прызначэннем прадмета. Дэкаратыўнае абагульненне прыродных формаў. Асаблівасці колеру ў дэкаратыўным адлюстраванні. Халодная і цёплая колеравыя гамы.

**Практычная дзейнасць.** Параўнанне льняной тканіны і радна, тканіны і трыкатажнага палатна, тканіны і футра, тканіны і сінтэпону па знешнім выглядзе. Аналіз формы, канструкцыі і тэхналогіі вырабу прадмета. Выкананне вырабаў па схеме, графічным адлюстраванні, тэхналагічнай карце, асабістай задуме. Выбар матэрыялу, выраб лякалаў, разметка дэталей па лякалах, выкройванне дэталей, апрацоўка краю вырабу швом «цераз край», *пяцельным швом**, злучэнне дзвюх дэталей сцяблiністым швом, *швом «назад іголку»**, апрацоўка вырабу

вядомымі швамі, выкананне аплікацыі; аналіз гатовага вырабу, тэхналогіі яго выканання. Распрацоўка кампазіцыі ўзору для выяўленчай ніткі, выбар матэрыялу, нанясенне малюнка на аснову, праколванне адтулін, выкананне перапляцення нітак па малюнку, аздабленне вырабу; аналіз выніку працы, тэхналогіі выканання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Прыстасаванні для працы:* прыстасаванні для захоўвання іголак, нажніц, грабеньчыкаў, акуляраў; мяшэчак, прыхватка, грэлка на чайнік.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Сонейка», «Мара» — дэкаратыўнае пано, дыванок-казка «Вясёлыя абрэзкі», дэкаратыўная падушка, дэкаратыўныя кветкі.

*Цацкі:* цацкі-падушкі, «Абрэзкавая змейка».

*Паштоўкі, віншаванні:* «Веснавыя таямніцы».

### **Вырабы з прыродных матэрыялаў** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Уласцівасці матэрыялаў (форма, колер, памеры). Варыятыўнасць выкарыстання.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай клею, штыркоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі дрэў, насенне ліпы, ясеня, шкарлупіны арэхаў, шышкі лопуху і інш.

Інструменты і прыстасаванні: нож, шыла, памазок для клею. Правілы бяспечнай работы шылам.

**Тэмы для гутарак.** Прыгажосць прыроды. Гармонія ў кампазіцыі.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Абагульненасць формы ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Цэльнасць скульптурнай формы. Характэрныя рысы выразнасці фігуры чалавека і жывёлы ў руху і спакоі. Характэрныя асаблівасці прапорцый чалавека і жывёлы. Стварэнне аб'ёмнага вобраза шляхам камбінавання прадметаў рознай формы. Дэкаратыўнае абагульненне прыродных формаў.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па асабістай задуме. Аналіз тэхналогіі вырабу прадмета. Падбор прыроднага

матэрыялу, злучэнне дэталей рознымі спосабамі, афармленне вырабу; аналіз канструкцыі гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Улюбёны герой казкі», «Спартсмен» — міні-скульптура, кампазіцыі: «Варона і ліса», «Танец матылькоў», «У гасцях у казкі», «Рэпка», фігуркі звяроў і птушак.

### **Вырабы з нетрадыцыйных матэрыялаў** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Агульнае ўяўленне пра металы. Дрот, яго прызначэнне. Уласцівасці: гнуткасць, пластычнасць, трываласць, электраправоднасць, колер.

Разнастайнасць нетрадыцыйных матэрыялаў з пластмасы. Варыятыўнасць выкарыстання нетрадыцыйных матэрыялаў. Форма ў канструяванні. Стылізацыя формы. Дынамічныя і статычныя постаці. Спосабы перадачы дынамічнасці.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка, гібка, праўка, рэзанне, скручванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: дрот; флаконы, вечкі, упакоўкі для цукерак, пластыкавыя футляры «кіндэр-сюрпрызаў», карпусы ад фламастараў і інш.

Інструменты і прыстасаванні: кусачкі, нажніцы, шыла, тоўстая іголка. Правілы бяспечнай працы інструментамі.

**Тэмы для гутарак.** «Другое жыццё» рэчаў. Што робяць з дроту.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Матэматыка.** Акружнасць і круг. Пабудова акружнасці з зададзеным цэнтрам і радыусам пры дапамозе цыркуля.

**Выяўленчае мастацтва.** Дэкаратыўнае абагульненне прыродных формаў. Рытм, сіметрыя, асіметрыя ў дэкаратыўных формах.

**Практычная дзейнасць.** Аналіз уласцівасцей наяўных рэчаў і матэрыялаў. Выкананне вырабаў па ўзоры, эскізе, асабістай задуме. Аналіз тэхналогіі вырабу. Распрацоўка кампазіцыі вырабу, выбар асноўных і дапаможных матэрыялаў, неабходных інструментаў і прыстасаванняў, разметка, выраб дэталей, злучэнне, аздабленне вырабу; аналіз вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* кветкі з дроту і нітак.

*Цацкі:* «Вясёлыя чалавечкі», «Сяброўкі» — фігуркі людзей, «Дружок», «Конік», «Жырафікі» — фігуркі жывёл, лялькі-марыянеткі, дротавыя геаметрычныя фігуры і галаваломкі.

## ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ
(11 гадзін)

### **Выцінанка** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Матэрыялы і інструменты. Асноўныя этапы тэхналогіі, тэхналагічныя аперацыі, патрабаванні да якасці выканання. Злучэнне ў вырабе розных відаў выцінанак. Форма ўзору, памеры, суадносіны частак і іх размяшчэнне. Цэласнасць вырабу.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: згінанне, выразанне, наклейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: папера.

Інструменты: нажніцы, аловак.

Дапаможныя матэрыялы: клеючы карандаш.

**Тэмы для гутарак.** Народнае мастацтва ў побыце. «Майстрам нельга нарадзіцца, майстэрству трэба вучыцца».

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Выразныя сродкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: абагульненасць формы, рытмічнае чаргаванне ўзораў.

**Чалавек і свет.** Быт беларусаў.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў на падставе аналагаў, па асабістай задуме. Распрацоўка кампазіцыі ўзору, выбар паперы, выразанне ўзораў, наклейванне на аснову; аналіз атрыманай выцінанкі, тэхналогіі выразання.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* сурвэткі, вугалкі, падзоры для паліц, ручнікі. «Поры года», «Жар-птушка», «Казачная кветка», «Дрэва жыцця» — пано.

## **Вышыўка** (3 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Беларуская вышыўка крыжыкам. Матэрыялы для вышыўкі, іх уласцівасці. Схематычны запіс узору для вышыўкі. Афармленне гатовай вышыўкі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: запяльванне тканіны, замацаванне ніткі на тканіне, вышыванне крыжыка. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: тканіна для вышыўкі крыжыкам, або канва, ніткі мулінэ.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, іголкі, пяльцы, ніткаўцягвальнік.

**Тэмы для гутарак.** Беларуская вышыўка крыжыкам і яе асаблівасці. Прафесія вышывальшчыцы.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Выразныя сродкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: абагульненасць формы, рытмічнае чаргаванне ўзораў, яркасць колеру, сувязь формы з аздабленнем і прызначэннем прадмета. Вобразнае значэнне колеру. Асаблівасці колеру ў дэкаратыўным відарысе. Дэкаратыўнае абагульненне прыродных формаў.

**Чалавек і свет.** Вырабы беларускіх майстроў-рамеснікаў.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па ўзоры, схеме. Выбар узору вышыўкі, падбор тканіны і нітак, вышыванне ўзору крыжыкам, афармленне вырабу; аналіз гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* мініяцюрнае пано.

*Запрашэнні, паштоўкі,* прысвечаныя святу развітання з IV класам.

## **Вязанне кручком** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Схематычны відарыс узору. Умоўныя абазначэнні (паветраная пятля, паўслупок, слупок без накіду, слупок з накідам). Колеравае рашэнне вырабаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: вязанне слупка без накіду і слупка з накідам. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: ніткі для вязання.

Інструменты: кручок для вязання.

**Тэмы для гутарак.** Прыгажосць вязаных рэчаў.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Выразныя сродкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: абагульненасць формы, рытмічнае чаргаванне ўзораў, яркасць колеру, сувязь формы з аздабленнем і прызначэннем прадмета. Вобразнае значэнне колеру. Асаблівасці колеру ў дэкаратыўным відарысе. Дэкаратыўнае абагульненне прыродных формаў.

**Чалавек і свет.** Вырабы беларускіх майстроў-рамеснікаў.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па ўзоры, схеме. Падбор нітак і кручка, вязанне вырабаў па схеме і слоўным апісанні, афармленне вырабу; аналіз гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Палявыя кветкі», «Вінаград» — пано.

*Дэкаратыўныя элементы касцюма:* шарыкі, званочкі, завушніцы, паўаб'ёмныя дэкаратыўныя банцікі.

*Цацкі:* «Марыянетка», «Клоўн».

### **Фларыстыка** (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Паняцце пра аранжыроўку раслін. Асаблівасці стварэння кветкавых кампазіцый. Прынцыпы аранжыроўкі раслін: прапорцыі, сіметрыя, асіметрыя, ураўнаважанасць, дынамічнасць, суадносіны з фонам.

Паняцце «ікебана». Сімволіка раслін у ікебане.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: абрэзка, звязванне пучкоў, усталяванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: расліны, засушаныя з захаваннем аб'ёму.

Прыстасаванні: аснова для замацавання раслін (пластыкавыя ўпакоўкі).

Дапаможныя матэрыялы: пластылін, дрот, ніткі.

**Тэмы для гутарак.** Мастацтва складання букета. Мастацтва ікебаны.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Выразныя сродкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: абагульненасць формы, рытмічнае чаргаванне ўзораў, яркасць колеру, сувязь формы з аздабленнем і

прызначэннем прадмета. Вобразнае значэнне колеру. Асаблівасці колеру ў дэкаратыўным відарысе. Дэкаратыўнае абагульненне прыродных формаў. Халодная і цёплая колеравыя гамы.

**Практычная дзейнасць.** Стварэнне кампазіцыі па ўзоры, малюнку, па ўяўленні. Выбар матэрыялу, падрыхтоўка асновы, складанне кампазіцыі, замацаванне раслін на аснове, афармленне гатовага вырабу; аналіз гатовых работ.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* букеты ў лінейным стылі, зімовы букет, кветкавыя кампазіцыі, букет-шар.

### Саломапляценне: саламяная скульптура (2 гадзіны)

**Тэарэтычныя звесткі.** Падрыхтоўка саломкі да работы. Спосабы вырабу і аздаблення саламяных скульптур, злучэння дэталей. Кампазіцыйныя патрабаванні да саламянай скульптуры (прапорцыі, дынамічнасць, статычнасць, колеравае рашэнне).

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: замочванне саломкі, перавязванне пучкоў, падразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Матэрыялы: саломка.

Інструменты: нажніцы.

Дапаможныя матэрыялы: ніткі, тасьма.

**Тэмы для гутарак.** Традыцыі народнага саломапляцення.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Выяўленчае мастацтва.** Цэльнасць скульптурнай формы. Характэрныя асаблівасці прапорцый чалавека і жывёлы. Характэрныя рысы выразнасці фігуры чалавека і жывёлы ў руху і спакоі.

**Чалавек і свет.** Вырабы беларускіх майстроў-рамеснікаў.

**Практычная дзейнасць.** Выкананне вырабаў па малюнку, уяўленні, асабістай задуме. Распрацоўка кампазіцыі вырабу, падрыхтоўка саломкі, перавязванне пучка саломкі, *аздабленне вырабу ніткамі, тасьмой**; аналіз выкананага вырабу, тэхналогіі вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні***

*Цацкі:* Конік, Козлік, Баранчык, Лялька.

## ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ (2 гадзіны)

### Кнігі ў нашым доме (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Бібліятэка. Кніга, яе часткі. Догляд і рамонт кніг. Неабходныя інструменты і прыстасаванні.

**Тэмы для гутарак.** Беражлівыя адносіны да кніг. Парады ўмелых ручак. Працоўная дзейнасць работнікаў друкарні (брашуроўшчык, пераплётчык).

**Практычная дзейнасць.** Выкананне дробнага рамонту кніг.

### Падрыхтоўка да свята (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Варыянты дэкаратыўных элементаў афармлення інтэр'ера.

*Распрацоўка праектаў і выраб сувеніраў да свята развітання з IV класам для вучняў, педагогаў, бацькоў, пераможцаў конкурсаў*.*

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Беларуская мова.** Этыка маўлення. Асноўныя этычныя правілы зносін. Складанне віншаванняў.

**Літаратурнае чытанне.** Складанне загадак, прыказак, казак.

**Практычная дзейнасць.** Распрацоўка і выраб дэкаратыўных элементаў інтэр'ера (рамачак), сувеніраў.

## ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА (1 гадзіна)

### Догляд кветкава-дэкаратыўных раслін (1 гадзіна)

**Тэарэтычныя звесткі.** Цыбульныя расліны (нарцысы, цюльпаны, гіяцынты і інш.). Правілы падрыхтоўкі цыбулін раслін да пасадкі. Правілы пасадкі цыбульных дэкаратыўных раслін.

**Тэмы для гутарак.** Расліны вакол нас.

МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ

**Літаратурнае чытанне.** Развіццё мовы.

**Практычная дзейнасць.** Падрыхтоўка цыбулін да пасадкі, восеньская пасадка, догляд раслін і назіранне за імі.

## **ВЫНІКОВЫЯ ЗАНЯТКІ** (1 гадзіна)

Падвядзенне вынікаў навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Выстаўка-ярмарка вырабаў, выкананых на ўроках і дома.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Вучні павінны:

*кіравацца правіламі:* бяспекі працы, рацыянальнай арганізацыі рабочага месца і асабістай гігіены; беражлівых адносін да інструментаў і прыстасаванняў, прадметаў побыту; эканомнага расходавання матэрыялаў; працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны, індывідуальнай і калектыўнай працы;

*мець уяўленне аб:* стадыях і этапах тэхналогіі; асноўных патрабаваннях да вырабаў; мадэліраванні і канструяванні; сучасным дызайне, эскізе і кампазіцыі вырабу; відах рамёстваў (саломапляценне, фларыстыка, вязанне кручком, вышыўка, выцінанка, абрэзкавае шытво), вырошчванні цыбульных дэкаратыўных раслін; прафесіі людзей бліжэйшага акружэння;

*распазнаваць (вызначаць):* асноўныя віды і ўласцівасці паперы, кардону, тканін, тэкстыльных, прыродных, нетрадыцыйных матэрыялаў; віды швоў па апрацоўцы і аздабленні вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў: «уперад іголку» і яго разнавіднасці, «цераз край», сцяблірісты, тамбурны;

*характарызаваць (апісваць):* віды злучэнняў: клеявое, шчыліннае, дротавае, змацаванне пластылінам, сшыванне; спосабы разметкі тканіны, паперы; асноўныя інструменты і прыстасаванні для працы з паперай, кардонам, дротам, тэкстыльнымі, прыроднымі матэрыяламі, іх прызначэнне і правілы працы;

*чытаць і разумець:* простыя графічныя адлюстраванні (эскізы, схемы, чарцяжы, тэхналагічныя карты), матывы і схемы ўзораў;

*распрацоўваць:* у агульным выглядзе паслядоўнасць выканання дэталей і зборкі вырабу; эскізы і варыянты кампазіцыі вырабаў;

*ажыццяўляць (выконваць):* планаванне працы і арганізацыю ўласнага рабочага месца; выбар інструментаў і прыстасаванняў; разметку тканіны, паперы, кардону; спосабы і прыёмы апрацоўкі матэрыялаў, прадугледжаных вучэбнай праграмай; злучэнне дэталей з паперы, кардону, тэкстыльных, прыродных, нетрадыцыйных матэрыялаў; аздабленне гатовых вырабаў; выкананне вырабаў па ўзоры, эскізе, рысунку, схеме, тэхналагічнай карце, асабістай задуме; мадэліраванне і канструяванне з гатовых формаў прыродных і нетрадыцыйных матэрыялаў; кантроль якасці выканання работы; дробны рамонт кніг.

# ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ

## I—IV класы

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Фізічная культура і здароўе» мае агульнаінтэлектуальнае, культуралагічнае, выхаваўчае і аздараўленчае значэнне, вырашае задачы агульнай фізкультурнай адукацыі, living рознабаковага фізічнага, інтэлектуальнага, духоўна-маральнага развіцця і аздараўлення вучняў.

**Мэтай** вывучэння вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» ў I—IV класах з’яўляецца фарміраванне фізічнай культуры асобы і аздараўленне вучняў з улікам іх узроставых асаблівасцей.

Мэта прадмета дасягаецца ў выніку рашэння адукацыйных, выхаваўчых і аздараўленчых задач.

**Адукацыйныя задачы:**

- авалоданне фізкультурнымі ведамі, даступнымі на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
- навучанне рухальным уменням і навыкам, спосабам фізкультурнай дзейнасці;
- навучанне прымяненню засвоеных фізкультурных ведаў, рухальных уменняў і навыкаў у пазаўрочны час.

**Выхаваўчыя задачы:**

- садзейнічанне станаўленню і развіццю патрэбнасці ў фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-аздараўленчай актыўнасці;
- фарміраванне адносін да ўласнага здароўя і здароўя іншых як да каштоўнасці;
- садзейнічанне гарманічнаму фізічнаму, духоўна-маральнаму, інтэлектуальнаму і эмацыянальнаму развіццю;
- выхаванне дысцыплінаванасці, стараннасці, добразычлівасці, калектывізму, чэснасці, спагадлівасці, смеласці;
- фарміраванне ўменняў і навыкаў супрацоўніцтва з аднагодкамі ў працэсе фізкультурнай і спартыўнай дзейнасці.

**Аздараўленчыя задачы:**

- аваладанне навыкамі, неабходнымі для фарміравання здаровага ладу жыцця сродкамі фізічнай культуры;
- умацаванне фізічнага здароўя вучняў;
- развіццё каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцей;
- садзейнічанне рознабаковаму фізічнаму развіццю;
- прафілактыка захворванняў, стрэсавых станаў;
- фарміраванне і захаванне правільнай паставы;
- прафілактыка міяпіі, плоскаступнёвасці і іншых захворванняў;
- фарміраванне ўяўленняў, ведаў, уменняў і навыкаў бяспекі жыццядзейнасці падчас арганізаваных і самастойных гульняў і фізкультурных заняткаў у экалагічна неспрыяльных умовах (для тых, хто пражывае ва ўмовах уздзеяння вынікаў аварыі на ЧАЭС).

Матэрыял вучэбнай праграмы размеркаваны па наступных раздзелах:

- уводзіны ў школьнае жыццё (толькі ў I класе);
- веды;
- уменні, навыкі, спосабы дзейнасці;
- развіццё рухальных здольнасцей.

Змест урокаў раздзела **«Уводзіны ў школьнае жыццё»** запаўняецца пераважна гульнёвай дзейнасцю, якая прадугледжана вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі для выхаванцаў старэйшай групы (Мінск, НІА, 2012)

Тэмы раздзела **«Веды»** плануюцца да засваення на ўроках фізічнай культуры і здароўя на працягу навучальнага года ў форме непрацяглых (3—5 хвілін) гутарак.

Раздзел **«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»** ўключае фізічныя практыкаванні, якія складаюць змест «школы рухаў»: хадзьбу, бег, скачкі, кіданне, лажанне, практыкаванні ў раўнавазе, акрабатычныя практыкаванні, элементы спартыўных і рухавых гульняў; перамяшчэнне на лыжах, плаванне.

Змест раздзела **«Развіццё рухальных здольнасцей»** уключае ў сябе рухавыя гульні і гульнёвыя заданні, тэставыя практыкаванні і крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў, прыкладны пералік дамашніх заданняў і парады па рухальным рэжыме вучняў на тыдзень.

На кожным уроку фізічнай культуры і здароўя рэкамендуецца планаваць гульнёвую дзейнасць вучняў. Пры выкарыстанні на ўроках рухавых гульняў і гульнёвых заданняў вырашаюцца наступныя **задачы**:

- замацаванне і ўдасканаленне рухальных уменняў, навыкаў і засвоеных спосабаў дзейнасці;
- развіццё каардынацыйных (дакладнае ўзнаўленне прасторавых, часавых і сілавых характарыстык рухаў, захоўванне раўнавагі, хуткае і своечасовае рэагаванне на зменлівыя сітуацыі, узгодненасць адначасовых і паслядоўных рухаў рознымі часткамі цела, узнаўленне тэмпу і рытму рухаў) і кандыцыйных (хуткасных, сілавых, хуткасна-сілавых, агульнай вынослівасці і гнуткасці) здольнасцей.

Тэставыя практыкаванні выкарыстоўваюцца выключна для матывацыі вучэбнай дзейнасці, індывідуалізацыі і карэкцыі зместу адукацыйнага працэсу. Вучні I класа выконваюць тэставыя практыкаванні толькі адзін раз за навучальны год — у маі. Вучні II—IV класаў тэсціруюцца два разы на працягу навучальнага года — у верасні і маі.

Змест вучэбнай праграмы разлічаны на яго засваенне вучнямі, якія па стане здароўя аднесены да асноўнай і падрыхтоўчай медыцынскіх груп. Вучні, якія па стане здароўя аднесены да спецыяльнай медыцынскай групы і групы лячэбнай фізічнай культуры, займаюцца асобна ад урокаў фізічнай культуры па спецыяльных праграмах, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Перавод з адной медыцынскай групы ў другую ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Вучні, якія вызвалены па медыцынскіх паказчыках ад рухальнай актыўнасці на ўроках фізічнай культуры і здароўя, прысутнічаюць на іх і выконваюць непроціпаказаныя індывідуальныя заданні пад кантролем настаўніка.

У мэтах эфектыўнага рашэння задач фізічнага выхавання вучняў I—IV класаў змест урокаў фізічнай культуры і здароўя павінен быць цесна ўзаемазвязаны з рухальнай актыўнасцю вучняў у рэжыме вучэбнага і падоўжанага дня, з іх удзелам у фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах.

Для павышэння аздараўленчага эфекту вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» рэкамендуецца як можна часцей праводзіць заняткі з дзецьмі на адкрытых пляцоўках пры навучальнай установе.

# I КЛАС

*Табліца 1*

Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Уводзіны ў школьнае жыццё** | **4** |
| **Веды** | **4** |
| Асновы бяспекі заняткаў | 1 |
| Гігіенічныя веды | 1 |
| Здаровы лад жыцця | 1 |
| Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі | 0,5 |
| Алімпізм і алімпійскі рух | 0,5 |
| **Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці** | **60** |
| Страявыя практыкаванні | 3 |
| Агульнаразвіццёвыя практыкаванні | 8 |
| Хадзьба | 2 |
| Бег | 4 |
| Скачкі | 5 |
| Кіданне | 4 |
| Лажанне | 5 |
| Акрабатычныя практыкаванні | 8 |
| Практыкаванні ў раўнавазе | 4 |
| Элементы спартыўных і рухавых гульняў | 4 |
| Перамяшчэнне на лыжах[1] | 10 |
| Плаванне[2] | да 16 |

[1] У бясснежную зіму замяняецца вучэбным матэрыялам іншых тэм.

[2] Пры наяўнасці ўмоў для навучання плаванню ў аб'ёме да 16 гадзін за кошт раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

*Заканчэнне табл. 1*

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Развіццё рухальных здольнасцей**[1] | |
| Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні | + |
| Тэсціраванне[2] | 3 |
| Прыкладныя дамашнія заданні | + |
| Прыкладныя парады па рухальным рэжыме на тыдзень | + |
| **У с я г о:** | **68** |

## Уводзіны ў школьнае жыццё

*Гульні з бегам:* «Вартаўнік», «Паляўнічыя і малпы», «Дагані сваю пару», «Карасі і шчупак», «Хітрая ліса», «Два маразы», «Пастух і воўк», «Пустое месца», «Шэры кот», «Мы — вясёлыя дзеці» і інш.

*Гульні з поўзаннем і лажаннем:* «Хто хутчэй», «Мядзведзі і пчолы», «Пажарныя на вучэннях».

*Гульні з кіданнем:* «Паляўнічыя і зайцы», «Хто самы меткі», «Хто далей кіне», «Збі мяч», «Мяч у карзіну», «Школа мяча» і інш.

## Веды

**Асновы бяспекі заняткаў.** Правілы бяспечных паводзін у месцах заняткаў фізічнай культурай (у спартыўнай зале, на спартыўнай пляцоўцы, на лыжні, у басейне). Правілы бяспечнага перамяшчэння да месцаў заняткаў. Правілы паводзін у дварах, на гульнёвых і спартыўных пляцоўках у пазаўрочны час. Меры папярэджання небяспекі на вадзе, у парку, у двары дома.

**Гігіенічныя веды.** Патрабаванні да адзення на занятках у розных умовах. Правільная пастава і яе значэнне для здароўя і добрай вучобы.

---

[1] Час, які адводзіцца на кожным уроку на развіццё рухальных здольнасцей вучняў, уваходзіць у разлік гадзін адпаведнай тэмы раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[2] Плануецца на апошнія два тыдні навучальнага года.

**Здаровы лад жыцця.** Уяўленне пра здароўе і здаровы лад жыцця. Рэжым дня вучня I класа. Значэнне заняткаў фізічнымі практыкаваннямі ў рэжыме дня для здароўя, добрага настрою, вучобы, адпачынку.

**Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі.** Правілы выканання комплексу практыкаванняў ранішняй гігіенічнай гімнастыкі. Правілы выканання практыкаванняў для фарміравання правільнай паставы.

**Алімпізм і алімпійскі рух.** Уяўленне пра Алімпійскія гульні старажытнасці, легенды і міфы алімпіяд; праграма і ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў, апошнія Алімпійскія гульні старажытнасці.

### Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці

**Страявыя практыкаванні:** асноўная стойка; пастраенне ў калону па адным, у шарэнгу, у круг; разыходжанне па загадзя ўстаноўленых месцах; размыканне на шырыню паднятых у бакі рук; павароты пераступаннем, скачком. Выкананне каманд: «Станавіся!», «Раўняйся!», «Смірна!», «Вольна!», «Направа!», «Налева!», «Клас, шагам марш!», «Клас, стой!».

**Агульнаразвіццёвыя практыкаванні:** практыкаванні без прадметаў, з гімнастычнай палкай, мячом, скакалкай; практыкаванні для фарміравання правільнай паставы ў асноўнай стойцы, седзячы на падлозе; комплекс практыкаванняў ранішняй гімнастыкі; падцягванне ў вісе стоячы, згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы, віс на сагнутых руках.

**Хадзьба:** звычайным і шырокім крокам, на насках, з утрыманнем у розных становішчах гімнастычнай палкі, мяча, па разметках, па лініі, пераступаючы праз перашкоды, пад музычнае суправаджэнне.

**Бег:** у павольным, сярэднім, хуткім тэмпе, на насках, з падніманнем бядра, са змяненнем напрамку па сігнале, з паскарэннем, у чаргаванні з хадзьбой; чаўночны бег 4×9 м; бег 30 м з высокага старту; 6-мінутны бег або бег 500 м (дзяўчынкі), 800 м (хлопчыкі).

**Скачкі:** імітацыя скачкоў птушак, звяроў; скачкі па «купінах», праз «вудачку», праз кароткую і доўгую скакалку; скачкі ўверх з дасталяннем рукой падвешанага прадмета;

скачкі на дзвюх нагах з прасоўваннем наперад; скачок у даўжыню з месца адштурхоўваннем дзвюма нагамі; праз вертыкальную перашкоду (рызінка, планка на вышыні 20—25 см); у даўжыню з малога (5—6 крокаў) разбегу.

**Кіданне:** падкідванне малога мяча ўверх і лоўля яго дзвюма рукамі, перакідванне з рукі на руку; удары аб падлогу і лоўля пасля адскоку дзвюма рукамі; кіданне малога мяча з месца ў шчыт з адлегласці 2—3 м са становішча стоячы тварам у бок кідання; кіданне набіўнога мяча (0,5 кг) дзвюма рукамі з-за галавы з зыходнага становішча седзячы ногі паасобку, дзвюма рукамі знізу з зыходнага становішча стоячы ногі паасобку.

**Лажанне:** лажанне па гарызантальнай гімнастычнай лаўцы ва ўпоры стоячы на каленях, ва ўпоры прысеўшы; падцягванне на гарызантальнай лаўцы лежачы на жываце; лажанне па гімнастычнай сценцы рознаіменным і аднайменным спосабамі.

**Акрабатычныя практыкаванні:** групоўка ва ўпоры прысеўшы, са становішча седзячы на падлозе, са становішча лежачы на спіне; перакат з групоўкі ў прыседзе назад з вяртаннем у прысед; кулёк уперад у групоўцы.

**Практыкаванні ў раўнавазе:** стойка на адной назе, другая нага сагнутая; хадзьба па прамой лініі на падлозе, па гімнастычнай лаўцы, па рэйцы гімнастычнай лаўкі.

**Элементы спартыўных і рухавых гульняў:** перакідванне з рукі на руку тэніснага мяча; падкідванне ўверх тэніснага мяча з наступнай лоўляй дзвюма рукамі.

Падкідванне валейбольнага мяча[1] і лоўля яго дзвюма рукамі з адным ці двума воплескамі, з адскокам ад падлогі; перакідванне мяча праз сетку дзвюма рукамі ад грудзей, ад галавы, адной рукой ад пляча; перакідванне мяча ў парах адзін аднаму з лоўляй дзвюма рукамі; удары мячом аб падлогу з наступнай лоўляй дзвюма рукамі; кідкі мяча адной і дзвюма рукамі ў вертыкальную цэль (гімнастычны абруч, ніжні край якога знаходзіцца на вышыні 1,5—2 метра ад падлогі).

Вядзенне мяча адной нагой, пераменна правай і левай нагамі па прамой, змейкай, чаўнаком. Спыненне мяча, які ко-

---

[1] Дазваляецца выкарыстоўваць гумавы мяч дыяметрам 25—30 см.

ціцца, правай і левай нагамі. Перадачы мяча ў парах адзін аднаму правай і левай нагамі. Удары па нерухомым мячы з пападаннем у вароты.

**Перамяшчэнне на лыжах:** адзяванне, зніманне лыж; стойкі на лыжах: асноўная, высокая, нізкая; ступаючы і слізготны крокі без палак, з палкамі; павароты пераступаннем на месцы; пад'ём угору «лесвічкай»; спускі з гор у высокай стойцы.

**Плаванне:** прысяданні з пагружэннем у ваду з галавой; выдых у ваду; даставанне прадметаў з дна, расплюшчваючы вочы ў вадзе; слізганне лежачы на грудзях з апорай рукамі аб плавальную дошку і без апоры; слізганне лежачы на спіне; рухі ног спосабам «кроль» з апорай рукамі аб дно, борцік басейна, з падтрымкай партнёра, які стаіць на месцы. Слізганне пасля адштурхоўвання з рухамі ног спосабам «кроль» на спіне, на грудзях.

*Гульнёвыя заданні:* « Схавайся ў ваду», «Жабяняты», «Паплавок».

*Гульні:* «Медуза», «Зорачка», «Карагод», «Фантан», «Бура на моры», «Паляўнічыя і качкі», «Арэлі».

## Развіццё рухальных здольнасцей вучняў

### Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні[1]

Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні выкарыстоўваюцца на ўроках фізічнай культуры і здароўя для замацавання і ўдасканалення вывучаных рухальных уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці, развіцця каардынацыйных і кандыцыйных рухальных здольнасцей.

*Гульні з выкананнем страявых каманд:* «Хто хутчэй стане ў строй», «Пабудуй круг», «Пабудуй калону», «Падарожжа на караблі», «Рака і роў», «У дзяцей парадак строгі», «Елачкі—бярозкі», «Рыбкі—крабікі».

*Гульні на развіццё ўвагі:* «Фігуры», «Лес, балота, возера», «Нос, нос, нос, лоб», «Клас, смірна!», «Дзень і ноч», «Таварыш

[1] У раздзел уключаны гульні і гульнёвыя заданні, кола якіх можа быць пашырана настаўнікам.

капітан», «Рабі, як я», «Забаронены рух», «Забаўнікі», «Зрабі фігуру», «Люстэрка».

*Гульні для ўдасканалення каардынацыйных здольнасцей:* «Барада», «Грушка», «Малако», «Пасадка бульбы», «Змяя», «Калім-бам-ба», «Метка», «Вяроўка-змейка», «Не сыдзі з месца», «Збор ураджаю», «Дванаццаць палачак», «Квач у парах», «Паспей узяць», «Спрытныя матальшчыкі», «Канатаходзец», «З купіны на купіну», «Совачка», «Пераправа».

*Гульні і гульнёвыя заданні з бегам:* «Ключы», «Хто хутчэй», «Аддай стужку», «Хутка вазьмі і пакладзі», «Замяні прадмет», «Дагані сваю пару», «Два маразы», «Соўка», «Хто хутчэй дакоціць абруч», «Не замачы ног», «Паспей дагнаць», «Шпакоўня», «Знайдзі пару», «Поезд», «Бяздомны заяц», «Маяк», «Конікі-спартсмены», «Гусі-лебедзі», «Пустое месца» і інш.

*Гульні і гульнёвыя заданні са скачкамі:* «Пінгвіны з мячом», «Саскоч і павярніся», «Не наступі», «Воўк у рове», «Зайцы ў агародзе», «Жаба і чапля», «Вераб'і і кошкі», «Вудачка», «Злаві камара», «Не пападзіся», «Квач», «З купіны на купіну».

*Гульні і гульнёвыя заданні з кіданнем:* «Перадаў — сядай», «Мяч у карзіну», «Паспей злавіць», «Каго назвалі — той ловіць», «Хто далей», «Паляўнічыя і зайцы», «Рухавая цэль», «Перадай мяч», «Хто самы меткі», «Мяч вядучаму», «Дагані мяч», «Мішэнь-качалка».

*Гульні і гульнёвыя заданні з лажаннем і пералажаннем:* «З мячом пад дугой», «Перапаўзі — не кінь», «Хто хутчэй да флажка», «Пералёт птушак», «Лоўля малпаў», «Пажарныя», «Мядзведзі і пчолы».

*Гульні з перамяшчэннем на лыжах:* «Шырэй крок», «Хто самы хуткі», «Да сваіх флажкоў», «Сустрэчная эстафета».

*Гульні з выкананнем тэставых практыкаванняў:* «Выконвай без памылак».

**Тэсціраванне**

Тэставыя практыкаванні выконваюцца вучнямі ў канцы навучальнага года. На працягу аднаго ўрока рэкамендуецца планаваць і выкарыстоўваць не больш за два тэставыя практыкаванні. Крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў прадстаўлены ў табліцах № 2, 3.

*Табліца 2*

## Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей дзяўчынак I класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 94 і менш | 95 | 100 | 105 | 110 | 112 | 115 | 119 | 122 | 130 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 14,7 і больш | 14,6 | 14,0 | 13,7 | 13,4 | 13,2 | 12,9 | 12,5 | 12,2 | 12,0 і менш |
| 3 | Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (за 30 с), разоў | 7 і менш | 8 | 10 | 11 | 12 | 14 | 15 | 17 | 18 | 20 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | −5 і менш | −4 | −2 | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 7,8 і больш | 7,7 | 7,4 | 7,2 | 6,9 | 6,8 | 6,6 | 6,5 | 6,4 | 6,2 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м *або* Бег 500 м, мін, с | 650 і менш 4,16 і больш | 660 4,15 | 760 3,58 | 800 3,54 | 850 3,35 | 890 3,23 | 920 3,10 | 970 3,05 | 1000 2,50 | 1110 і больш 2,40 і менш |

*Табліца 3*

## Шкала ацэнкі развіцця рухальных здольнасцей хлопчыкаў I класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 103 і менш | 104 | 110 | 115 | 119 | 122 | 126 | 130 | 134 | 140 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 14,0 і больш | 13,9 | 13,4 | 13,1 | 12,8 | 12,5 | 12,3 | 12,1 | 11,8 | 11,5 і менш |
| 3 | Віс на сагнутых руках, с | 2 і менш | 3 | 4 | 5 | 7 | 10 | 12 | 14 | 17 | 23 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | –9 і менш | –8 | –6 | –4 | –2 | 1 | 3 | 5 | 7 | 10 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 7,7 і больш | 7,6 | 7,5 | 7,3 | 7,0 | 6,9 | 6,7 | 6,5 | 6,4 | 6,2 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м *або* Бег 800 м, мін, с | 700<br>6,56 і больш | 710<br>6,55 | 800<br>6,29 | 860<br>6,00 | 900<br>5,35 | 950<br>5,13 | 1000<br>5,08 | 1020<br>4,54 | 1080<br>4,40 | 1140<br>4,25 і менш |

## Прыкладныя дамашнія заданні

Штодзённа выконваць комплекс ранішняй гімнастыкі, развучаны на ўроках фізічнай культуры і здароўя.

У летні перыяд штодзённа гуляць на спартыўнай пляцоўцы з аднагодкамі ў рухавыя гульні, развучаныя на ўроках фізічнай культуры і здароўя, ездзіць на веласіпедзе, кідаць мяч у цэль (напрыклад, у баскетбольнае кольца), падцягвацца ў вісе на высокай перакладзіне (хлопчыкі), выконваць нахілы ўперад з прамымі нагамі, скакаць праз кароткую і доўгую скакалку. У выхадныя дні сумесна з бацькамі ажыццяўляць прагулкі пешшу, гуляць у рухавыя гульні.

Зімой катацца на каньках, хадзіць на лыжах. У выхадныя дні з бацькамі хадзіць на лыжныя прагулкі, катацца на лыжах і санках (табл. 4).

*Табліца 4*

Прыкладныя парады па рухальным рэжыме на тыдзень вучняў I класа[1]

| № п/п | Віды рухальнай дзейнасці[2] | Аб'ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | хлопчыкі | дзяўчынкі |
| 1 | Бег у гульнях на двары з таварышамі, км | 6—8 | 5—7 |
| | *або* | | |
| 2 | Хадзьба на лыжах, км | 7—9 | 6—8 |
| 3 | Скачкі праз кароткую скакалку, разоў | 500—600 | 500—600 |
| 4 | Падцягванне на высокай перакладзіне, разоў | 30—45 | — |
| 5 | Падцягванне на нізкай перакладзіне, разоў | — | 60—80 |

---

[1] Для вучняў, якія не займаюцца дадаткова да ўрокаў у спартыўных або фізкультурных групах.

[2] Практыкаванні выконваюцца ў дні, вольныя ад урокаў фізічнай культуры і здароўя.

| № п/п | Віды рухальнай дзейнасці | Аб’ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | хлопчыкі | дзяўчынкі |
| 6 | Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы, разоў | 30—50 | 30—50 на павышанай апоры |
| 7<br><br><br><br><br>8 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе ногі разам («складка з затрымкай 5—8 с»), разоў<br>*або*<br>Нахіл уперад «колькі мажліва» з зыходнага становішча седзячы на падлозе ногі паасобку, разоў | 20—30<br><br><br><br><br>50—60 | 20—30<br><br><br><br><br>50—60 |
| 9<br><br><br><br>10 | Падыманне і апусканне тулава са становішча лежачы на спіне рукі за галавой, разоў<br>*або*<br>Падыманне прамых ног са становішча лежачы на спіне, разоў | 20—30<br><br><br><br>30—40 | 20—30<br><br><br><br>30—40 |

## ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧНЯЎ, ЯКІЯ ЗАКАНЧВАЮЦЬ I КЛАС

Вучні павінны м е ц ь  у я ў л е н н е:

аб здароўі, аб здаровым ладзе жыцця і месцы ў ім фізічных практыкаванняў;

аб Алімпійскіх гульнях старажытнасці.

Вучні павінны в е д а ц ь  і  в ы к о н в а ц ь:

правілы бяспекі паводзін на ўроках фізічнай культуры і здароўя;

рэжым вучэбнага і выхаднога дня;

гігіенічныя патрабаванні да спартыўнага адзення і абутку;

самыя простыя правілы самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

вывучаныя практыкаванні і спосабы дзейнасці.

Вучні павінны ў м е ц ь:
гуляць у развучаныя рухавыя гульні;
тэхнічна правільна выконваць тэставыя практыкаванні;
выконваць патрабаванні здаровага ладу жыцця.

# II КЛАС

*Табліца 5*

Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Веды** | **4** |
| Асновы бяспекі заняткаў | 1 |
| Гігіенічныя веды | 1 |
| Здаровы лад жыцця | 1 |
| Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі | 0,5 |
| Алімпізм і алімпійскі рух | 0,5 |
| **Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці** | **64** |
| Страявыя практыкаванні | 3 |
| Агульнаразвіццёвыя практыкаванні | 8 |
| Хадзьба | 2 |
| Бег | 5 |
| Скачкі | 5 |
| Кіданні | 4 |
| Лажанне | 5 |
| Акрабатычныя практыкаванні | 8 |
| Практыкаванні ў раўнавазе | 4 |
| Элементы спартыўных і рухавых гульняў | 4 |
| Перамяшчэнне на лыжах[1] | 10 |
| Плаванне[2] | да 16 |

[1] У бясснежную зіму замяняецца вучэбным матэрыялам іншых тэм.

[2] Пры наяўнасці ўмоў для навучання плаванню ў аб'ёме да 16 гадзін за кошт раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Развіццё рухальных здольнасцей**[1] | |
| Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні | + |
| Тэсціраванне[2] | 6 |
| Прыкладныя дамашнія заданні | + |
| Прыкладныя парады па рухальным рэжыме на тыдзень | + |
| **У с я г о:** | **68** |

## Веды

**Асновы бяспекі заняткаў.** Правілы бяспекі паводзін у месцах заняткаў фізічнай культурай. Правілы паводзін пры траўмах і няшчасных выпадках. Правілы паводзін на вадзе.

**Гігіенічныя веды.** Правілы дыхання пры выкананні агульнаразвіццёвых практыкаванняў. Правілы правядзення водных працэдур, прыёму паветраных і сонечных ваннаў.

**Здаровы лад жыцця.** Паняцце пра здаровы лад жыцця і яго ўплыў на стан здароўя, настрой, поспехі ў вучобе другакласніка.

**Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі.** Правілы выканання тэставых практыкаванняў: чаўночны бег, падцягванне ў вісе, нахіл уперад са становішча седзячы, падніманне і апусканне тулава са становішча лежачы на спіне, бег на 30 м, 6-мінутны бег. Патрабаванні да выканання комплексу практыкаванняў ранішняй гімнастыкі і фізкультурных хвілінак.

**Алімпізм і алімпійскі рух.** Уяўленне аб сучасных Алімпійскіх гульнях. Алімпійская сімволіка і атрыбутыка (эмблема Алімпійскіх гульняў, агонь, флаг, гімн, дэвіз, талісманы, алімпійскія ўзнагароды). Цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпійскіх гульняў.

---

[1] Час, які адводзіцца на кожным уроку на развіццё рухальных здольнасцей вучняў, уваходзіць у разлік гадзін адпаведнай тэмы раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[2] Плануецца па 3 гадзіны ў I і IV чвэрцях.

## Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці

**Страявыя практыкаванні:** разлік на «першы-другі», размыканне і змыканне прыстаўнымі крокамі, перастраенні з аднаой шарэнгі ў дзве, з дзвюх у адну; перамяшчэнне ў калоне па адным з выкананнем каманд «У абход — шагам марш!», «Проціходам налева (направа) — марш!», «Па дыяганалі — марш!».

**Агульнаразвіццёвыя практыкаванні:** выпады ўперад, у бакі, назад з адначасовым падніманнем рук у бакі, уверх, адвядзеннем назад; кругавыя рухі рукамі ў выпадах; нахілы ўперад седзячы, стоячы ногі разам, ногі паасобку; комплекс практыкаванняў ранішняй гімнастыкі.

**Хадзьба:** на насках рукі на поясе, за галаву, уверх, у бакі; у паўпрыседзе; на знешнім баку ступні; з высокім падыманнем бядра.

**Бег:** на месцы, па разметках, «змейкай», «васьмёркай», з высокага старту 30 метраў, чаўночны бег 4×9 м, бег на зададзеную адлегласць і час.

**Скачкі:** у даўжыню з месца і з разбегу, на дзвюх нагах па разметках, на адной назе «па класах» (квадратах), у глыбіню з мяккім прызямленнем, праз кароткую і доўгую скакалку.

**Кіданне:** кідкі набіўнога мяча (0,5 кг) дзвюма рукамі ад грудзей і знізу ўперад-уверх з зыходнага становішча стоячы ногі на шырыні плячэй тварам у бок кідання; кіданне малога мяча з месца на далёкасць з зыходнага становішча стоячы тварам у напрамку кідання, на зададзеную адлегласць, у гарызантальную і вертыкальную цэль ( гімнастычны абруч) з адлегласці 3—4 м.

**Лажанне:** па нахіленай гімнастычнай лаўцы ва ўпоры стоячы на каленях, ва ўпоры прысеўшы; па гімнастычнай сценцы ў гарызантальным напрамку прыстаўнымі крокамі з папераменным перахватам рукамі, у вертыкальным напрамку рознаіменным і аднайменным спосабамі. Падцягванне на руках, лежачы на жываце і бёдрах на гарызантальнай гімнастычнай лаўцы; на перакладзіне у вісе (хлопчыкі), у вісе стоячы (дзяўчынкі).

**Акрабатычныя практыкаванні:** хуткая групоўка з асноўнай стойкі рукі ўверх далонямі ўперад, з упору прысеўшы, са становішча лежачы на спіне рукі ўверх далонямі ўперад; кулёк уперад у групоўцы; стойка на лапатках сагнуўшы ногі; перакат уперад ва ўпор прысеўшы са стойкі на лапатках сагнуўшы ногі; перакат убок прагнуўшыся са становішча лежачы на грудзях рукі ўверх; перакат убок у групоўцы са стойкі на каленях.

**Практыкаванні ў раўнавазе:** стойка на адной назе з заплюшчанымі вачамі; тое ж з паднятымі ўбок рукамі стоячы на падлозе, на лаўцы; хадзьба па рэйцы перавернутай гімнастычнай лаўкі; бег па гімнастычнай лаўцы; павароты кругом стоячы на гімнастычнай лаўцы, павароты кругом пры хадзьбе на насках па рэйцы гімнастычнай лаўкі.

**Элементы спартыўных і рухавых гульняў:** перакідванне з рукі на руку тэніснага мяча; падкідванне ўверх тэніснага мяча з наступнай лоўляй дзвюма рукамі. Кідкі валейбольнага мяча[1] адной і дзвюма рукамі адзін аднаму з лоўляй дзвюма рукамі; падкідванне валейбольнага мяча і лоўля яго дзвюма рукамі з 2—3 воплескамі, з адскокам ад падлогі, з адным-двума крокамі ў правы і левы бакі, з паваротам на 180°; перакідванне мяча праз сетку дзвюма рукамі ад грудзей, ад галавы, адной рукой ад пляча; удары мячом аб падлогу адной рукой з яго высокім, сярэднім і нізкім адскокам; кіданне мяча адной і дзвюма рукамі ў вертыкальную цэль (гімнастычны абруч, ніжні край якога знаходзіцца на вышыні 1,5—2 метраў ад падлогі).

Вядзенне мяча адной нагой, папераменна правай і левай нагамі па прамой, змейкай; чаўночны бег з вядзеннем мяча; вядзенне нагамі адначасова двух мячоў; спыненне мяча, які коціцца, правай і левай нагамі; удары па нерухомым мячы ўнутраным бокам ступні з пападаннем у вароты.

**Перамяшчэнне на лыжах:** пастраенне з лыжамі ў руках у шарэнгу, у калону па адным; адзяванне лыж на снезе; павароты пераступаннем на месцы; перамяшчэнне на лыжах

---

[1] Дазваляецца выкарыстоўваць гумавы мяч дыяметрам 25—30 см.

ступаючым і слізготным крокам; спускі на лыжах з горак з невялікім схілам; пад'ём угару ступаючым крокам.

**Плаванне:** прыседы ў ваду з галавой; выдых у ваду; даставанне прадметаў з дна, з расплюшчваннем вачэй у вадзе; слізганне лежачы на грудзях, на спіне; рух ног спосабам «кроль» з апорай рукамі аб дно, борцік басейна або з падтрымкай партнёра; слізганне пасля адштурхоўвання з рухамі ног спосабам «кроль» на спіне, на грудзях; выдыхі ў ваду з паваротам галавы; рухі рук, узгодненыя з дыханнем (стоячы на дне, у спалучэнні з хадзьбой); плаванне з апорай на дошку адной і дзвюма рукамі; плаванне з дапамогай ног і грабкоў адной рукой з розным становішчам другой рукі; саскок у ваду з борціка ўніз нагамі з розным становішчам рук; спад у ваду са становішча седзячы на борціку, рукі ўверсе.

## Развіццё рухальных здольнасцей вучняў

### Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні[1]

Развіццё каардынацыйных і кандыцыйных рухальных здольнасцей на ўроках фізічнай культуры і здароўя дасягаецца ў працэсе навучання фізічным практыкаванням, спосабам дзейнасці і рухавым гульням, удзелу ў рухавых гульнях і выканання спаборніцкіх заданняў.

*Гульні і гульнёвыя заданні для ўдасканалення каардынацыйных здольнасцей:* «Паспрабуй злаві», «Прыдумай сам», «Мяч збоку», «Забаронены рух», «Мы вясёлыя дзеці», «Карусель», «Забаўнікі», «Фігуры», «Па сцяжынцы», «Хто як ходзіць», «Карлікі і веліканы», «Хто лішні».

*Гульні і гульнёвыя заданні з бегам:* «Хутка вазьмі — хутка пакладзі», «Займай свае месцы», «Замяні прадмет», «Бег за флажкамі», «Каршун і квактуха», «Пасадка бульбы», «Мы вясёлыя дзеці», «Коннікі-спартсмены».

*Гульні і гульнёвыя заданні са скачкамі:* «Скакуны», «Чаўнок», «Пераскоч праз ручаёк», «Конікі», «Парашутысты», «Па-

---

[1] У раздзел уключаны гульні і гульнёвыя заданні, кола якіх можа быць пашырана настаўнікам.

скакунчыкі-верабейчыкі», «Скачкі па палосках», «Воўк у рове», «Вудачка скачковая», «Зайцы ў агародзе».

*Гульні і гульнёвыя заданні з кіданнем:* «Лаві мяч», «Цэлься без промаху», «Перадай—сядай», «Пагрузка гарбузоў», «Гонка мячоў», «Трапны снайпер», «Па мішэнях».

*Гульні і гульнёвыя заданні з лажаннем:* «З мячом пад дугой», «Перапаўзі — не кінь», «Хто хутчэй да флажка», «Кацяняткі і шчаняты», «Пералёт птушак», «Пажарныя», «Мядзведзі і пчолы».

*Гульні і гульнёвыя заданні з перамяшчэннем на лыжах:* «Лыжныя рэйкі», «Лыжны поезд», «Запрэжка аленяў», «Хто самы хуткі», «Смялей з горкі».

*Гульні і гульнёвыя заданні з плаваннем:* «Квач на вадзе», «Бусел», «Жабкі», «Жучок-павучок», «Насос», «Невад», «Карасікі і шчупак», «Поезд у тунэлі», «Карусель», «Хвалі і мора», «На буксіры», «Медуза», «Паплавок», «Цюлені».

*Гульні з выкананнем тэставых практыкаванняў:* «Выконвай без памылак».

### Тэсціраванне

Тэставыя практыкаванні выконваюцца вучнямі ў пачатку і канцы навучальнага года. На працягу аднаго ўрока рэкамендуецца планаваць і выкарыстоўваць не больш за два тэставыя практыкаванні. Крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў прадстаўлены ў табліцах 6, 7.

### Прыкладныя дамашнія заданні

Штодзённа выконваць комплексы гімнастычных практыкаванняў (з прадметамі, без прадметаў), развучаных на ўроках фізічнай культуры і здароўя; катацца на лыжах; ездзіць на веласіпедзе; падцягвацца ў вісе лежачы, у вісе паднімаць сагнутыя ў каленях ногі; скакаць праз кароткую і доўгую скакалку; згінаць і разгінаць рукі ва ўпоры лежачы на лаўцы; гуляць у рухомыя гульні. Па выхадных днях выязджаць з бацькамі ў лес, на раку, возера. На канікулах хадзіць у паходы (пешшу, на веласіпедах) (табл. 8).

*Табліца 6*

Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей дзяўчынак II класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 104 і менш | 105 | 114 | 119 | 123 | 125 | 130 | 132 | 137 | 142 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 13,9 і больш | 13,6 | 13,1 | 12,9 | 12,6 | 12,4 | 12,2 | 12,0 | 11,8 | 11,4 і менш |
| 3 | Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (за 30 с), разоў | 10 і менш | 13 | 14 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 24 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | −5 і менш | −3 | 0 | 2 | 4 | 5 | 7 | 9 | 11 | 12 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 7,6 і больш | 7,4 | 7,1 | 6,9 | 6,7 | 6,6 | 6,4 | 6,3 | 6,1 | 6,0 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м<br>*або*<br>Бег 800 м, мін, с | 700 і менш<br>6,41 і больш | 710<br>6,40 | 800<br>6,09 | 870<br>5,55 | 920<br>5,40 | 960<br>5,28 | 1000<br>5,15 | 1030<br>5,01 | 1080<br>4,48 | 1150 і больш<br>4,34 і менш |

*Табліца 7*

### Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей хлопчыкаў II класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 104 і менш | 109 | 114 | 118 | 123 | 128 | 132 | 137 | 142 | 146 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 13,4 і больш | 13,1 | 12,8 | 12,6 | 12,3 | 12,0 | 11,8 | 11,6 | 11,4 | 11,0 і менш |
| 3 | Віс на сагнутых руках, с | 1 і менш | 3 | 6 | 8 | 11 | 13 | 16 | 18 | 21 | 23 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | –10 і менш | –8 | –5 | –3 | –1 | 1 | 3 | 6 | 8 | 10 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 7,2 і больш | 7,0 | 6,9 | 6,7 | 6,6 | 6,4 | 6,3 | 6,1 | 6,0 | 5,8 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м *або* Бег 1000 м, мін, с | 760 і менш<br>7,41 і больш | 770<br>7,40 | 890<br>6,59 | 950<br>6,42 | 1000<br>6,26 | 1030<br>5,10 | 1090<br>5,54 | 1130<br>5,38 | 1190<br>5,21 | 1220 і больш<br>5,05 і менш |

*Табліца 8*

### Прыкладныя парады па рухальным рэжыме вучняў II класа на тыдзень[1]

| № п/п | Віды рухальнай дзейнасці[2] | Аб'ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | хлопчыкі | дзяўчынкі |
| 1 | Бег у чаргаванні з хадзьбой, км | 6—8 | 5—7 |
| | *або* | | |
| 2 | Хадзьба на лыжах, км | 7—9 | 6—8 |
| 3 | Скачкі праз кароткую скакалку, разоў | 500—600 | 500—600 |
| 4 | Падцягванне на высокай перакладзіне, разоў | 30—45 | — |
| 5 | Падцягванне на нізкай перакладзіне, разоў | — | 60—80 |
| 6 | Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы, разоў | 30—50 | 30—50 на павышанай апоры |
| 7 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе ногі разам («складка з затрымкай 5—8 с»), разоў | 20—30 | 20—30 |
| | *або* | | |
| 8 | Нахіл уперад «колькі магчыма» з зыходнага становіўча лежачы на падлозе ногі ў розныя бакі, разоў | 50—60 | 50—60 |
| 9 | Падыманне і апусканне тулава са становішча лежачы на спіне рукі за галавой, разоў | 20—30 | 20—30 |
| | *або* | | |
| 10 | Падыманне і апусканне прамых ног са становішча лежачы на спіне, разоў | 30—40 | 30—40 |

[1] Для вучняў, якія не займаюцца дадаткова да ўрокаў у спартыўных або фізкультурных групах.

[2] Практыкаванні выконваюцца ў дні, вольныя ад урокаў фізічнай культуры і здароўя.

ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧНЯЎ, ЯКІЯ ЗАКАНЧВАЮЦЬ II КЛАС

Вучні павінны в е д а ц ь:

правілы здаровага ладу жыцця;

уплыў здаровага ладу жыцця на здароўе і настрой;

алімпійскую сімволіку;

цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпійскіх гульняў.

Вучні павінны в е д а ц ь і в ы к о н в а ц ь:

правілы бяспечных паводзін на ўроках фізічнай культуры і здароўя і ў час самастойных заняткаў;

гігіенічныя патрабаванні да адзення і паставы, правілы дыхання;

патрабаванні, якія прад'яўляюцца да здаровага ладу жыцця;

страявыя каманды і практыкаванні;

гульнёвыя заданні з хадзьбой, бегам, скачкамі, кіданнем, лажаннем;

падцягванні, лажанні і пералажанні;

практыкаванні на фарміраванне правільнай паставы.

Вучні павінны ў м е ц ь:

гуляць у развучаныя рухавыя гульні;

кідаць малы мяч на далёкасць, у цэль і на зададзеную адлегласць;

пастаянна падтрымліваць правільную паставу;

правільна выконваць тэставыя практыкаванні;

трымацца на вадзе і плаваць з дапамогай плавальнай дошкі.[1]

## III КЛАС

*Табліца 9*

Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Веды** | **4** |
| Асновы бяспекі заняткаў | 1 |
| Гігіенічныя веды | 1 |
| Здаровы лад жыцця | 1 |

---

[1] Пры наяўнасці ўмоў для навучання плаванню.

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі і самакантроль | 0,5 |
| Алімпізм і алімпійскі рух | 0,5 |
| **Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці** | **66** |
| Страявыя практыкаванні | 3 |
| Агульнаразвіццёвыя практыкаванні | 4 |
| Хадзьба | 2 |
| Бег | 6 |
| Скачкі | 6 |
| Кіданні | 6 |
| Лажанне. Падцягванне | 6 |
| Акрабатычныя практыкаванні | 8 |
| Практыкаванні ў раўнавазе | 4 |
| Элементы спартыўных і рухавых гульняў | 6 |
| Перамяшчэнне на лыжах[1] | 9 |
| Плаванне[2] | да 24 |
| **Развіццё рухальных здольнасцей[3]** | |
| Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні | + |
| Тэсціраванне | 6 |
| Прыкладныя дамашнія заданні | + |
| Прыкладныя парады па рухальным рэжыме на тыдзень | + |
| **У с я г о:** | **70** |

## Веды

**Асновы бяспекі заняткаў.** Правілы бяспечных паводзін у месцах заняткаў фізічнай культурай. Правілы пазбягання

---

[1] У бясснежную зіму замяняецца вучэбным матэрыялам іншых тэм.

[2] Пры наяўнасці ўмоў для навучання плаванню ў аб'ёме да 24 гадзін за кошт раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[3] Час, які адводзіцца на кожным уроку на развіццё рухальных здольнасцей вучняў, уваходзіць у разлік гадзін адпаведнай тэмы раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

ўздзеяння наступстваў аварыі на ЧАЭС і іншых неспрыяльных экалагічных фактараў мясцовага значэння.

**Гігіенічныя веды.** Патрабаванні да спартыўнага адзення і абутку ў розныя поры года. Пераахаладжэнне і меры яго папярэджання. Значэнне і правілы загартоўвання. Уплыў заняткаў фізічнымі практыкаваннямі на разумовую працаздольнасць вучня. Значэнне правільнага дыхання пры выкананні фізічных практыкаванняў.

**Здаровы лад жыцця.** Шкодныя звычкі і іх уплыў на здароўе вучня. Правілы здаровага ладу жыцця трэцякласніка. Рухальны рэжым трэцякласніка ў розныя поры года.

**Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі.** Правілы выканання практыкаванняў для павышэння разумовай працаздольнасці падчас падрыхтоўкі дамашніх заданняў. Практыкаванні для фарміравання правільнай паставы. Паняцце рухальных здольнасцей чалавека: сілавых, хуткасных, хуткасна-сілавых, спрытнасці, гнуткасці, вынослівасці.

**Алімпізм і алімпійскі рух.** П’ер дэ Кубертэн — заснавальнік сучаснага алімпійскага руху. Зімовыя і летнія Алімпійскія гульні. Краіны і гарады, у якіх праводзіліся Алімпійскія гульні. Віды спорту, уключаныя ў праграму зімовых і летніх Алімпійскіх гульняў.

### Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці

**Страявыя практыкаванні:** выкананне каманд: «Шырэй крок!», «Часцей крок!», «Радзей!»; пастраенне ў дзве шарэнгі, перастраенне з дзвюх шарэнгаў у два кругі; выкананне каманд: «Працiходам па адным налева і направа ў абыход — марш!», «Змейкай — марш!».

**Агульнаразвіццёвыя практыкаванні:** выпады наперад, убок, назад; прысяданні з рознаіменнымі рухамі рук (адна ўбок, другая ўперад; адна ўверх, другая ўбок і г. д.); прысяданні і выпады з адначасовымі кругавымі рухамі рук; нахілы, выпады і прысяданні з гімнастычнай палкай, з мячом, са скакалкай у руках; комплекс практыкаванняў ранішняй гімнастыкі.

**Хадзьба:** са зменай даўжыні і частаты кроку, з пераступаннем праз прадметы, выпадамі ўлева і ўправа, ступаючы ў кольцы ці ў кругі, у прыседзе, скрыжаваным крокам улева і ўправа.

**Бег:** са зменай хуткасці, у зададзеным тэмпе, з пераадольваннем умоўных перашкод, з перадачай эстафеты; бег на адлегласць у зададзены час (да 6 хвілін), чаўночны бег 4×9 м.

**Скачкі:** на месцы штуршком дзвюх ног з паваротам на 180°, у глыбіню, у вышыню з разбегу праз рызінку, праз кароткую і доўгую скакалку на дзвюх і на адной назе; скачкі «па класах» папераменна на адной ці на дзвюх нагах.

**Кіданне:** кідкі набіўнога мяча дзвюма рукамі ад грудзей уперад-уверх; знізу ўперад-уверх, на далёкасць, на зададзеную адлегласць; кіданне малога мяча з месца з зыходнага становішча стоячы тварам у бок кідання на далёкасць, на зададзеную адлегласць, у гарызантальную і вертыкальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 4—5 м.

**Лажанне, падцягванне:** лажанне па гімнастычнай сценцы ў гарызантальным напрамку з паваротам на 360°; у вертыкальным напрамку аднайменным і рознаіменным спосабамі; падцягванне ў вісе стоячы на нізкай перакладзіне.

**Акрабатычныя практыкаванні:** кулькі наперад у групоўцы; перакат управа (улева) са стойкі на правым (левым) калене, левая (правая) нага ўбок на насок, рукі ў бакі; «мост» са становішча лежачы на спіне.

**Практыкаванні ў раўнавазе:** на рэйцы перакуленай гімнастычнай лаўкі (на гімнастычным бервяне) хадзьба на насках, прыстаўным крокам у правы і левы бок, павароты на 180° і 360° стоячы на дзвюх нагах; упор прысеўшы, упор стоячы на калене; саскок прагнуўшыся з упору прысеўшы.

**Элементы спартыўных і рухавых гульняў:** перакідванне тэніснага мяча адзін аднаму; падкідванне ўверх тэніснага мяча з наступнай лоўляй аднайменнай і рознаіменнай рукамі.

Кідкі валейбольнага мяча[1] адной і дзвюма рукамі адзін аднаму з лоўляй дзвюма рукамі; падкідванне мяча і лоўля дзвюма рукамі з 2—3 воплескамі, з адскокам ад падлогі, з 1—2 крокамі ў правы і левы бок, з паваротам на 180° і 360°; перакідванне мяча ў парах праз сетку дзвюма рукамі ад грудзей, ад галавы, адной рукой ад пляча з лоўляй дзвюма рукамі; удары мячом аб падлогу адной рукой з высокім, сярэднім і нізкім адскокам; кіданне мяча адной і дзвюма рукамі ў

---

[1] Дазваляецца выкарыстоўваць гумавы мяч дыяметрам 25—30 см.

вертыкальную цэль (гімнастычны абруч, ніжні край якога знаходзіцца на ўзроўні 1,5—2 м ад падлогі).

Вядзенне мяча адной нагой, папераменна правай і левай нагамі па прамой, змейкай, васьмёркай; чаўночны бег з вядзеннем мяча папераменна правай і левай нагамі; вядзенне нагамі адначасова двух мячоў; спыненне мяча, які коціцца, правай і левай нагамі; перадачы мяча ў парах адзін аднаму правай і левай нагамі; удары па нерухомым мячы ўнутраным бокам ступні, сярэдзінай пад'ёму з пападаннем у вароты; жангліраванне мячом адной нагой; эстафеты з вядзеннем і перадачамі мяча.

**Перамяшчэнне на лыжах:** перамяшчэнне папераменным двухкрокавым ходам; пад'ём «паўелачкай» і «лесвічкай» па пакатым схіле; спускі ў высокай і нізкай стойцы; павароты пераступаннем у руху, тармажэнне «паўплугам»; перамяшчэнне на лыжах з раўнамернай хуткасцю на адлегласці да 1,5 км.

**Плаванне:** скачок у ваду ўніз нагамі; спад у ваду са становішча седзячы на борціку рукі ўверсе; выдыхі ў ваду з паваротам галавы; слізганне лежачы на грудзях, на спіне; рухі ног спосабам «кроль» з апорай рукамі аб дно, борцік басейна, з падтрымкай партнёра; слізганне пасля адштурхоўвання з рухамі ног спосабам «кроль» на спіне, на грудзях; рухі рук, узгодненыя з дыханнем (стоячы на дне, у спалучэнні з хадзьбой); плаванне з дапамогай ног з апорай рукамі аб дошку; плаванне з дапамогай ног і грабкоў адной рукой з розным становішчам другой рукі; плаванне з дапамогай рук; праплыванне адрэзкаў 6—12 м з поўнай каардынацыяй рухаў.

## Развіццё рухальных здольнасцей

### Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні

Развіццё каардынацыйных і кандыцыйных рухальных здольнасцей на ўроках фізічнай культуры і здароўя дасягаецца ў працэсе навучання фізічным практыкаванням, спосабам дзейнасці і рухавым гульням, удзелу ў рухавых гульнях і выкананню спаборніцкіх заданняў.

У Ш класе неабходна планаваць і ажыццяўляць мэтанакіраванае развіццё асноўных рухальных здольнасцей з акцэнтаваным развіццём хуткасна-сілавых здольнасцей ног, статычнай раўнавагі і агульнай вынослівасці (хлопчыкі, дзяў-

чынкі), статычнай сілавой вынослівасці мышцаў згібальнікаў рук (дзяўчынкі), сілы мышцаў разгібальнікаў рук (хлопчыкі, дзяўчынкі), гнуткасці (дзяўчынкі), дынамічнай сілавой вынослівасці мышцаў згібальнікаў тулава (хлопчыкі, дзяўчынкі), дынамічнай сілавой вынослівасці мышцаў згібальнікаў рук і гнуткасці (хлопчыкі).

*Гульні і гульнёвыя заданні з выкананнем страявых каманд:* «Хутка ў круг», «Слухай каманду», «Музычная забаўка», «Дакладны паварот», «Запомні свой колер», «Пляцень», «Шышкі, жалуды, арэхі», «Перамена месцаў».

*Гульні і гульнёвыя заданні для ўдасканалення каардынацыйных здольнасцей:* «Карусель», «Забаронены рух», «Два лагеры», «Арэшак», «Светлафор», «Фігуры», «Пастух і воўк», «Спрытны верабей», «Метка», «Шчупак», «Вяроўка-змейка», «Парашутысты», «Ліса і куры», «Займай свае месцы», «Праз купіны і пянёчкі», «Квач», «Уюны».

*Гульні і гульнёвыя заданні з бегам:* «Паспрабуй дагані», «Бег тройкамі», «Поезд», «Пасадка гародніны», «Дзень-ноч», «Каманда хутканогіх», «Птушкі ў гнёздах», «Кругавая эстафета».

*Гульні і гульнёвыя заданні са скачкамі:* «Скачкі па палосках», «Хто вышэй», «З купіны на купіну», «Зайцы ў агародзе», «Ліса і куры», «Квач на адной назе», «Квач ў прыседзе», «Эстафета са скачкамі».

*Гульні і гульнёвыя заданні з кіданнем:* «Паспрабуй забяры!», «Перадай—сядай», «Перакідванне мячоў», «Мяч — капітану», «Гонка мяча па крузе», «Эстафета з мячом», «Зямля, вада, паветра».

*Гульні і гульнёвыя заданні з перамяшчэннем на лыжах:* «Квач», «Хто далей», «Шырэй крок», «Хто самы хуткі», «За мной!», эстафета без палак.

*Гульні з выкананнем тэставых практыкаванняў:* «Выконвай без памылак».

### Тэсціраванне

Тэставыя практыкаванні выконваюцца вучнямі ў пачатку і канцы навучальнага года. На працягу аднаго ўрока рэкамендуецца планаваць і выкарыстоўваць не больш за два тэставыя практыкаванні. Крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў прадстаўлены ў табліцах 10, 11.

*Табліца 10*

Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей дзяўчынак III класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 114 і менш | 115 | 120 | 125 | 129 | 134 | 138 | 141 | 147 | 152 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 13,3 і больш | 13,2 | 12,7 | 12,4 | 12,2 | 12,0 | 11,9 | 11,6 | 11,4 | 11,1 і менш |
| 3 | Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (за 30 с), разоў | 13 і менш | 14 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 24 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | −4 і менш | −3 | 0 | 2 | 3 | 5 | 6 | 8 | 10 | 12 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 7,3 і больш | 7,2 | 6,9 | 6,6 | 6,5 | 6,3 | 6,2 | 6,1 | 5,9 | 5,8 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м *або* Бег 800 м, мін, с | 770 і менш<br>6,11 і больш | 780<br>6,10 | 890<br>5,46 | 930<br>5,33 | 980<br>5,20 | 1000<br>5,08 | 1030<br>4,55 | 1080<br>4,34 | 1120<br>4,30 | 1190 і больш<br>4,17 і менш |

*Табліца 11*

## Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей хлопчыкаў III класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 119 і менш | 120 | 124 | 129 | 134 | 139 | 144 | 149 | 154 | 159 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 12,8 і больш | 12,7 | 12,5 | 12,2 | 11,9 | 11,7 | 11,4 | 11,2 | 10,9 | 10,7 і менш |
| 3 | Віс на сагнутых руках, с | 2 і менш | 5 | 7 | 10 | 13 | 15 | 20 | 21 | 23 | 26 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | −9 і менш | −7 | −4 | −2 | 0 | 2 | 4 | 5 | 8 | 10 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 6,9 і больш | 6,8 | 6,6 | 6,5 | 6,4 | 6,2 | 6,1 | 5,9 | 5,8 | 5,6 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м *або* Бег 1000 м, мін, с | 910 і менш<br>6,54 і больш | 920<br>6,53 | 1000<br>6,38 | 1040<br>6,22 | 1080<br>6,07 | 1110<br>5,52 | 1150<br>5,37 | 1200<br>4,22 | 1230<br>5,06 | 1280 і больш<br>4,51 і менш |

## Прыкладныя дамашнія заданні

Штодзённа выконваць комплексы ранішняй гімнастыкі, якія развучаны на ўроках фізічнай культуры ў здароўя, гуляць у рухавыя гульні, хадзіць на лыжах, ездзіць на веласіпедзе, падцягвацца ў вісе і ў вісе лежачы, падымаць тулава са становішча лежачы на спіне, згінаць і разгінаць рукі ва ўпоры лежачы ад падлогі і ад лаўкі (табл. 12).

*Табліца 12*

Прыкладныя рэкамендацыі па рухальным рэжыме вучняў III класа на тыдзень[1]

| № п/п | Віды рухальнай дзейнасці[2] | Аб'ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | хлопчыкі | дзяўчынкі |
| 1 | Бег у чаргаванні з хадзьбой, км *або* | 7—9 | 6—7 |
| 2 | Хадзьба на лыжах, км | 9—10 | 7—8 |
| 3 | Скачкі праз кароткую скакалку, разоў | 600—700 | 600—700 |
| 4 | Падцягванне на высокай перакладзіне, разоў | 40—50 | — |
| 5 | Падцягванне на нізкай перакладзіне, разоў | 60—80 | 60—80 |
| 6 | Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы, разоў | 35—55 | 40—50 на павышанай апоры |
| 7 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе ногі разам («складка з затрымкай 5—8 с»), разоў *або* | 25—35 | 25—35 |
| 8 | Нахіл уперад са становішча седзячы на падлозе ногі ў розныя бакі, разоў | 55—65 | 55—65 |

[1] Для вучняў, якія не займаюцца дадаткова да ўрокаў у спартыўных або фізкультурных групах.

[2] Практыкаванні выконваюцца ў дні, вольныя ад урокаў фізічнай культуры і здароўя.

*Заканчэнне табл. 12*

| № п/п | Віды рухальнай дзейнасці[2] | Аб'ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | хлопчыкі | дзяўчынкі |
| 9 | Падыманне і апусканне тулава са становішча лежачы на спіне рукі за галавой, разоў *або* | 25—35 | 25—35 |
| 10 | Падыманне прамых ног са становішча лежачы на спіне, разоў | 35—50 | 35—50 |

## ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧНЯЎ, ЯКІЯ ЗАКАНЧВАЮЦЬ III КЛАС

Вучні павінны в е д а ц ь:

уплыў шкодных звычак на здароўе вучня;

віды спорту, якія ўваходзяць у праграму зімовых і летніх Алімпійскіх гульняў;

гігіенічныя патрабаванні да адзення; правілы дыхання.

Вучні павінны в е д а ц ь і в ы к о н в а ц ь:

правілы бяспечных паводзін на ўроках фізічнай культуры і здароўя і падчас самастойных заняткаў;

правілы і патрабаванні да здаровага ладу жыцця;

рухальны рэжым з улікам свайго ўзросту і полу.

Вучні павінны з н а ц ь і ў м е ц ь правільна выконваць:

практыкаванні для фарміравання правільнай паставы;

рухавыя гульні з бегам, скачкамі, кіданнем;

тэставыя практыкаванні.

Вучні павінны ў м е ц ь:

гуляць, у тым ліку і самастойна, у вывучаныя рухавыя гульні;

правільна размяркоўваць свае сілы пры бегу на зададзены час;

кідаць малы мяч на далёкасць і ў цэль;

правільна выкарыстоўваць вывучаныя спосабы перамяшчэння на лыжах;

правільна скакаць у ваду, праплываць не менш 10—12 м;

выконваць тэставыя практыкаванні з індывідуальна максімальным вынікам.

# IV КЛАС

*Табліца 13*

Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Веды** | **4** |
| Асновы бяспекі заняткаў | 1 |
| Гігіенічныя веды | 1 |
| Здаровы лад жыцця | 1 |
| Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі і самакантроль | 0,5 |
| Алімпізм і алімпійскі рух | 0,5 |
| **Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці** | **66** |
| Страявыя практыкаванні | 3 |
| Агульнаразвіццёвыя практыкаванні | 4 |
| Хадзьба | 2 |
| Бег | 6 |
| Скачкі | 6 |
| Кіданні | 6 |
| Лажанне. Падцягванне | 6 |
| Акрабатычныя практыкаванні | 8 |
| Практыкаванні ў раўнавазе | 4 |
| Элементы спартыўных і рухавых гульняў | 6 |
| Перамяшчэнне на лыжах[1] | 9 |
| Плаванне[2] | да 24 |
| **Развіццё рухальных здольнасцей[3]** | |
| Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні | + |
| Тэсціраванне | 6 |
| Прыкладныя дамашнія заданні | + |
| Прыкладныя парады па рухальным рэжыме на тыдзень | + |
| **У с я г о:** | **70** |

[1] У бясснежную зіму замяняецца вучэбным матэрыялам іншых тэм.

[2] Пры наяўнасці ўмоў для навучання плаванню за кошт гадзін раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[3] Час, які адводзіцца на кожным уроку на развіццё рухальных здольнасцей вучняў, уваходзіць у разлік гадзін адпаведнай тэмы раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

## Веды

**Асновы бяспекі заняткаў.** Правілы бяспечных паводзін у месцах заняткаў фізічнай культурай. Правілы пазбягання ўздзеяння наступстваў аварыі на ЧАЭС і іншых неспрыяльных экалагічных фактараў мясцовага значэння.

**Гігіенічныя веды.** Патрабаванні да спартыўнага адзення і абутку ў розныя поры года. Правілы загартоўвання. Уплыў заняткаў фізічнымі практыкаваннямі на здароўе і рухальныя здольнасці вучня. Значэнне правільнай паставы для здароўя чалавека.

**Здаровы лад жыцця.** Правілы здаровага ладу жыцця вучняў. Рухальны рэжым вучэбнага і выхаднога дня.

**Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі.** Паняцце пра нагрузку пры выкананні фізічных практыкаванняў. Самыя простыя паказчыкі велічыні нагрузкі: частата сардэчных скарачэнняў, суб'ектыўнае пачуццё стомленасці. Правілы рэгулявання нагрузкі пры выкананні фізічных практыкаванняў. Правілы самаацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей.

**Алімпізм і алімпійскі рух.** Алімпійская краіна Беларусь. Спартсмены Рэспублікі Беларусь — чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў.

## Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці

**Страявыя практыкаванні:** выкананне каманд: «Станавіся!», «Раўняйся!», «Смірна!», «Вольна!»; павароты кругом на месцы, разлік па парадку; перастраенне на месцы з адной шарэнгі ў тры (чатыры) уступамі; выкананне каманды «Праз цэнтр па адным—марш!».

**Агульнаразвіццёвыя практыкаванні:** спалучэнне выпадаў, нахілаў, прысяданняў з рухамі рук без прадметаў і з прадметамі (скакалка, гімнастычная палка, мяч); комплекс практыкаванняў ранішняй гімнастыкі.

**Хадзьба:** з паскарэннем, з акцэнтаваным крокам, са змяненнем кірунку руху, з музычным суправаджэннем.

**Бег:** дробным крокам, з высокім падніманнем бядра, з выскокваннем штуршком правай і левай нагой, з паскарэннем; чаўночны бег 4×9 м; бег 30 м на вынік; бег на адлегласць да 6 мін.

**Скачкі:** у кроку, у даўжыню на дакладнасць прызямлення, у глыбіню на мяккасць прызямлення, у вышыню з месца і з разбегу праз рызінку, у даўжыню з месца і з разбегу, цераз кароткую скакалку на адной і дзвюх нагах з прасоўваннем наперад, назад, улева, управа.

**Кіданне:** кідкі набіўнога мяча (0,5 кг) дзвюма рукамі ад грудзей і з-за галавы ўперад-уверх, дзвюма рукамі знізу ўперад-уверх на далёкасць і на зададзеную адлегласць; кіданне малога мяча з месца з зыходнага становішча стоячы тварам у напрамку кідання на далёкасць, на зададзеную адлегласць, у гарызантальную і вертыкальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 4—5 м.

**Лажанне, падцягванне:** лажанне па канаце ў два прыёмы, у вісе на руках па нахіленай і гарызантальнай гімнастычнай лесвіцы; падцягванне ў вісе стоячы на нізкай перакладзіне і ў вісе на высокай перакладзіне.

**Акрабатычныя практыкаванні:** з упору прысеўшы перакат назад у групоўцы; перакат уперад ва ўпор прысеўшы; кулёк уперад і назад; перакат назад у стойку на лапатках, «мост» са становішча лежачы на спіне.

**Практыкаванні для фарміравання правільнай паставы (з прадметам на галаве):** лажанне па гімнастычнай сценцы ў гарызантальным і вертыкальным напрамках і па дыяганалях; хадзьба бокам па рэйцы перавернутай гімнастычнай лаўкі; павароты на 180° і 360° стоячы на рэйцы гімнастычнай лаўкі; хадзьба па нахіленай гімнастычнай лаўцы.

**Практыкаванні ў раўнавазе (на гімнастычным бервяне, на рэйцы перавернутай гімнастычнай лаўкі):** хадзьба шырокім крокам, хадзьба з прадметам на галаве з паваротамі 180° і 360°; паварот скачком улева і ўправа на 90°; упор прысеўшы стоячы на калене, саскок прагнуўшыся з упору прысеўшы.

**Элементы спартыўных і рухавых гульняў:** перакідванне тэніснага мяча стоячы тварам адзін да аднаго на адлегласці 2—3 м; падкідванне ўверх тэніснага мяча з наступнай лоўляй аднайменнай і рознаіменнай рукамі; удары тэнісным мячом аб падлогу з наступнай лоўляй дзвюма і адной рукамі.

Падкідванне валейбольнага мяча[1] і лоўля дзвюма рукамі з воплескам за спінай, з адскокам ад падлогі, з адным-двума крокамі ў правы і левы бакі, з прысяданнем, з паваротамі на 180° і 360°; перакідванне мяча ў парах праз сетку дзвюма ру-

камі ад грудзей, ад галавы, адной рукой ад пляча з лоўляй дзвюма рукамі і хуткім кідком назад; удары мячом аб падлогу адной рукой з яго высокім, сярэднім і нізкім адскокам са становішча стоячы, у прыседзе і седзячы на падлозе; кідкі мяча адной і дзвюма рукамі ў вертыкальную цэль (гімнастычны абруч, ніжні край якога знаходзіцца на ўзроўні 1,5—2 м ад падлогі).

Вядзенне мяча адной нагой, папераменна правай і левай нагамі па прамой з паскарэннем, змейкай, васьмёркай; чаўночны бег з вядзеннем мяча; вядзенне нагамі адначасова двух мячоў чаўнаком; спыненне мяча, які коціцца, правай і левай нагамі; перадачы мяча ў парах адзін аднаму правай і левай нагамі; удары па нерухомым мячы ўнутраным бокам ступні, сярэдзінай пад'ёму з пападаннем у вароты; жангліраванне мячом адной нагой; эстафеты з вядзеннем і перадачамі мяча.

**Перамяшчэнне на лыжах:** перамяшчэнне папераменным і адначасовым двухкрокавым ходам; спускі з пакатых схілаў з праходжаннем варот, зробленых з лыжных палак; тармажэнне «плугам»; павароты пераступаннем у руху; пад'ём «лесвічкай» і «елачкай»; перамяшчэнне на лыжах вывучанымі спосабамі да 2 км.

**Плаванне:** скачок з борціка ў ваду ўніз нагамі; спад ў ваду са становішча седзячы на борціку рукі ўверсе; слізганне лежачы на грудзях і на спіне; слізганне пасля адштурхоўвання з рухамі ног спосабам «кроль» на спіне, на грудзях; плаванне з дапамогай ног з апорай і без апоры рукамі на дошку; плаванне з дапамогай рук; плаванне з дапамогай ног і грабкоў адной рукой з розным становішчам другой рукі; праплыванне адрэзкаў 6—12—25 м з поўнай каардынацыяй рухаў; плаванне 25 м на грудзях і на спіне.

## Развіццё рухальных здольнасцей

### Рухавыя гульні і гульнёвыя заданні

Развіццё каардынацыйных і кандыцыйных рухальных здольнасцей на ўроках фізічнай культуры і здароўя дасягаецца ў працэсе навучання фізічным практыкаванням, спосабам дзейнасці і рухавым гульням, удзелу ў рухавых гульнях і выкананне спаборніцкіх заданняў.

---

[1] Дапускаецца выкарыстанне гумавага мяча дыяметрам 25—30 см.

У IV класе ажыццяўляецца мэтанакіраванае развіццё асноўных рухальных здольнасцей з акцэнтаваным развіццём арыентавання ў прасторы, статычнай раўнавагі (хлопчыкі), дакладнасці рухаў рукамі (дзяўчынкі), хуткасці рухаў рукамі і нагамі (хлопчыкі, дзяўчынкі), хуткасці рухальнай рэакцыі, хуткасна-сілавых якасцей рук і ног (дзяўчынкі), гнуткасці (хлопчыкі), агульнай і дынамічнай сілавой вынослівасці (дзяўчынкі).

*Гульні і гульнёвыя заданні для ўдасканалення каардынацыйных здольнасцей:* «Бег у пары са скакалкай», «Бой пеўняў», «Слухай сігнал!», «Што змянілася», «На поўнач, поўдзень, захад, усход», «Мяч капітану», «Барада», «Коні», «Вілюшкі».

*Гульні і гульнёвыя заданні з хадзьбой і бегам:* «Хто як ходзіць», «Прынясі прадмет», «Іголка, нітка, вузел», «Спаборніцтвы скараходаў», «Гонка крабаў», «Бег сараканожак», «Абмяняй булаву», «Мышалоўка», «Цягнік», «Самалёты», «Белыя мядзведзі», «Палка, якая падае».

*Гульні і гульнёвыя заданні са скачкамі:* «Вуда», «Скачок за скачком», эстафеты са скачкамі.

*Гульні і гульнёвыя заданні з кіданнем:* «Збі булаву», «Вертыкальная мішэнь», «Кідай далёка — збірай хутка!», «Беражы прадмет», «Абарона ўмацаванняў», «Мяч ляціць», «Перамена месцаў».

*Гульні і гульнёвыя заданні з перамяшчэннем на лыжах:* «Знайдзі сцяжок», «Дакладны паварот», «Дзе звініць?», «Каньковы ход», «Пустое месца», «Хуткі лыжнік», «Запрэжка», «Два дамы», «Хто далей», «Квач», «Шырэй крок», «Не зачапі», «Змейка», эстафета без палак.

*Гульні і гульнёвыя заданні з плаваннем:* «Дэльфіны», «Уюны», «Мачта», «Хто вышэй выпрыгне», «Карасі і карпы», «Вадалазы», «Барацьба за мяч»; эстафеты з дошкай, з мячом.

*Гульня з выкананнем тэставых практыкаванняў:* «Выконвай без памылак».

### Тэсціраванне

Тэставыя практыкаванні выконваюцца вучнямі ў пачатку і канцы навучальнага года. На працягу аднаго ўрока рэкамендуецца планаваць і выкарыстоўваць не больш за два тэставыя практыкаванні. Крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў прадстаўлены ў табліцах 14, 15.

*Табліца 14*

## Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей дзяўчынак IV класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 120 і менш | 121 | 126 | 130 | 135 | 140 | 145 | 149 | 154 | 159 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 12,7 і больш | 12,6 | 12,4 | 12,2 | 12,0 | 11,8 | 11,6 | 11,3 | 11,1 | 10,9 і менш |
| 3 | Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (за 30 с), разоў | 14 і менш | 15 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 25 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | −5 і менш | −4 | −1 | 1 | 3 | 4 | 5 | 7 | 10 | 12 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 7,3 і больш | 7,2 | 6,8 | 6,5 | 6,3 | 6,2 | 6,1 | 6,0 | 5,9 | 5,8 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м *або* Бег 800 м, мін, с | 830 і менш<br>5,41 і больш | 840<br>5,40 | 940<br>5,22 | 980<br>5,11 | 1000<br>4,59 | 1040<br>4,47 | 1070<br>4,36 | 1100<br>4,24 | 1150<br>4,12 | 1210 і больш<br>4,00 і менш |

*Табліца 15*

## Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей хлопчыкаў IV класа

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца, см | 129 і менш | 130 | 135 | 141 | 148 | 151 | 156 | 161 | 166 | 171 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м, с | 12,4 і больш | 12,3 | 12,1 | 11,8 | 11,6 | 11,3 | 11,1 | 10,9 | 10,6 | 10,4 і менш |
| 3 | Віс на сагнутых руках, с | 5 і менш | 6 | 9 | 12 | 15 | 17 | 20 | 23 | 26 | 29 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе, см | −7 і менш | −6 | −3 | −1 | 1 | 3 | 5 | 7 | 9 | 11 і больш |
| 5 | Бег 30 м, с | 6,9 і больш | 6,8 | 6,7 | 6,4 | 6,3 | 6,2 | 6,1 | 6,0 | 5,8 | 5,7 і менш |
| 6 | 6-мінутны бег, м *або* Бег 1000 м, мін, с | 990 і менш<br>6,45 і больш | 1000<br>6,31 | 1040<br>6,16 | 1100<br>6,02 | 1150<br>5,48 | 1200<br>5,34 | 1230<br>5,22 | 1250<br>5,06 | 1300<br>4,51 | 1350 і больш<br>4,37 і менш |

## Прыкладныя дамашнія заданні

Штодзённа выконваць комплексы ранішняй гімнастыкі з прадметамі і без прадметаў, гуляць у рухавыя гульні, катацца на лыжах і на веласіпедзе, падцягвацца ў вісе (хлопчыкі) і ў вісе лежачы (дзяўчынкі), падымаць тулава са становішча лежачы на спіне, згінаць і разгінаць рукі ва ўпоры лежачы ад падлогі (хлопчыкі) і ад лаўкі (дзяўчынкі) (табл. 16).

*Табліца 16*

Прыкладныя парады па рухальным рэжыме вучняў IV класа на тыдзень[1]

| № п/п | Віды рухальнай дзейнасці[2] | Аб'ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | хлопчыкі | дзяўчынкі |
| 1 | Бег у чаргаванні з хадзьбой, км *або* | 8—10 | 7—9 |
| 2 | Хадзьба на лыжах, км | 10—12 | 8—10 |
| 3 | Скачкі праз кароткую скакалку, разоў | 700—900 | 700—900 |
| 4 | Падцягванне на высокай перакладзіне, разоў | 40—50 | — |
| 5 | Падцягванне на нізкай перакладзіне, разоў | 60—80 | 60—80 |
| 6 | Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы, разоў | 35—55 | 40—50 на павышанай апоры |
| 7 | Нахіл уперад са становішча седзячы на падлозе («складка з затрымкай 5—8 с»), разоў | 25—35 | 25—35 |

---

[1] Для вучняў, якія не займаюцца дадаткова да ўрокаў у спартыўных або фізкультурных групах.

[2] Практыкаванні выконваюцца ў дні, вольныя ад урокаў фізічнай культуры і здароўя.

*Заканчэнне табл. 16*

| № п/п | Віды рухальнай дзейнасці[2] | Аб'ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | хлопчыкі | дзяўчынкі |
| 8 | *або*<br>Нахіл уперад са становішча седзячы на падлозе ногі ў розныя бакі, разоў | 55—65 | 55—65 |
| 9 | Падыманне і апусканне тулава са становішча лежачы на спіне рукі за галавой, разоў | 25—35 | 25—35 |
| 10 | *або*<br>Падыманне прамых ног лежачы на спіне, разоў | 35—50 | 35—50 |

## ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ ПАДРЫХТАВАНАСЦІ ВУЧНЯЎ, ЯКІЯ ЗАКАНЧВАЮЦЬ ПАЧАТКОВУЮ ШКОЛУ

Вучні павінны в е д а ц ь:

правілы бяспечных паводзін пры арганізаваных і самастойных занятках фізічнымі практыкаваннямі, разумець значэнне іх выканання для захавання і паляпшэння здароўя;

значэнне і правілы здаровага ладу жыцця;

рухальны рэжым вучэбнага і выхаднога дня вучня;

паняцце правільнай паставы і правілы яе фарміравання;

значэнне і самыя простыя правілы загартоўвання арганізма;

паняцце ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей, правілы выканання тэставых практыкаванняў;

назвы і прызначэнне вывучаных практыкаванняў і спосабаў дзейнасці; правілы правядзення вывучаных рухомых гульняў;

Алімпійскія гульні старажытнасці ( як часта яны праводзіліся, дзе праходзілі спаборніцтвы, хто прымаў у іх удзел, як называліся пераможцы Алімпійскіх гульняў, чым яны ўзнагароджваліся);

Алімпійскія гульні сучаснасці (зімовыя і летнія Алімпійскія гульні, алімпійскія віды спорту, краіны і гарады, дзе праводзіліся Алімпійскія гульні, эмблема алімпійскіх гуль-

няў, агонь, флаг, гімн, дэвіз, талісманы, алімпійскія ўзнагароды; прозвішчы беларускіх чэмпіёнаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў.

Вучні павінны у м е ц ь:

выконваць правілы бяспечных паводзін у час фізкультурных заняткаў, свят і спартыўных спаборніцтваў;

падтрымліваць правільную паставу на ўроках, у час самападрыхтоўкі, у быце і ў час заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

вымераць і ацаніць вынікі паказчыкаў фізічнага развіцця і ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей («лепш», «горш»);

самастойна выканаць комплекс практыкаванняў ранішняй гімнастыкі без прадметаў і з інвентаром (мяч, скакалка, абруч, гімнастычная палка);

тэхнічна правільна выконваць тэставыя практыкаванні;

тлумачыць правілы выканання вывучаных фізічных практыкаванняў і спосабаў дзейнасці;

гуляць у вывучаныя рухавыя гульні.

Вучні павінны б ы ц ь г а т о в ы м і:

выкарыстоўваць атрыманыя веды, уменні і навыкі падчас выканання фізічных практыкаванняў;

выконваць гігіенічныя патрабаванні да адзення, абутку, спартыўнага абсталявання і інвентару;

гуляць у развучаныя рухавыя гульні без дапамогі настаўніка;

паказаць індывідуальны максімальны вынік у тэставых практыкаваннях.

## Змест

Уводзіны ў школьнае жыццё ........................ 3
Навучанне грамаце. I клас ........................... 26
Беларуская мова. II—IV класы ..................... 36
Літаратурнае чытанне. II—IV класы ............ 56
Русский язык. I—IV классы ........................ 75
Литературное чтение. II—IV классы ............ 101
Матэматыка. I—IV класы ............................. 123
Чалавек і свет. I—IV класы ......................... 138
Працоўнае навучанне. I—IV класы .............. 160
Фізічная культура і здароўе. I—IV класы .... 205

Вучэбнае выданне

ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ
для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

**I–IV КЛАСЫ**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктар *Л. А. Міснікевіч*

Падпісана ў друк 09.08.2012. Фармат 60×84/16. Папера газетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 14,42. Ул.-выд. арк. 10,55.
Тыраж 4600 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494469
ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Мінскае абласное унітарнае прадпрыемства «Барысаўская ўзбуйненая
тыпаграфія імя 1 Мая». ЛП № 02330/0150443 ад 19.12.2008.
Вул. Будаўнікоў, 33, 222120, г. Барысаў